© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. У ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

П Р Ы Г О Ж А Е . . .

Прыгожае — гэта пальцы
тонкія ў срэбных пярсьцёнках,
і пальцы, якія на пляцах
фармуюць кулак нашай моцы.

Прыгожае — гэта свабода
на рыжай лістоце восені,
скарынка чыстага лёду,
старая вінтоўка Мосіна.

Прыгожае — гэта жанчына,
здольная здрадзіць прыгожа
і толькі з тае прычыны,
што доўга цярпець ня можа.

Ня трэба так хвалявацца:
яна пагуляе і вернецца.
Шукай жа, мужчына, працу
для рук тваіх дужых і сэрца.

С.А.

МАРШ, МАРШ ЛЕВАЙ

Што такое тэрор? Што такое тэрарызм? Якая іхная прырода? Дзе, у якіх умовах яны найлепш рэалізуюцца? Увогуле, якое дачыненьне ўсё гэта мае да нашае краіны сёньня? Падобна, што самае непасрэднае. Беларусь ушчыльную наблізілася да гэтае мяжы.

Тэрор і тэрарызм — зьявы аднаго парадку, адрозьненьне іхнае толькі ў маштабах. Тэрарызм — справа слабейшага, звычайна справа падпольная. Тэрор — справа мацнейшага, звычайна справа ўлады, нярэдка дзяржавы. І тэрор, і тэрарызм выяўляюцца часта ў часе рэвалюцыяў, грамадзянскіх войнаў, міждзяржаўных канфліктаў, перад імі і пасьля іх.

Нярэдка тэрарызм правакуецца ўладай, каб апраўдаць усталяваньне рэжыму дзяржаўнага тэрору. Прыкладаў можна прывесьці процьму. Найбольш яскравыя інцэніроўкі — замах на Гітлера ў перадваеннай Нямеччыне, альбо забойства Кірава, як пачатак чарговай хвалі дзяржаўнага тэрору ў СССР трыццатых гадоў.

Тэрор і тэрарызм, як правіла, левыя па сваёй сутнасьці. Стыхія левых ультра — хаос, нестабільнасьць, напружанасьць. Падмена агульначалавечых, традыцыйных каштоўнасьцяў рознымі прывабнымі для маргінальных слаёў тэорыямі — ці то раю на зямлі, ці то ўсеагульнай роўнасьці, ці расавай выключнасьці, часта пераплеценымі паміж сабой. Яднае іх тое, што традыцыйныя каштоўнасьці, такія, як Бог, сумленьне, закон, яны падмяняюць мэтазгоднасьцю. Ці то рэвалюцыйнай, ці расавай, ці дзяржаўнай. Там, дзе пануе такая жыцьцёвая ўстаноўка, чалавечае жыцьцё і чалавек як асоба страчвае сваю каштоўнасьць, а гэта — адкрыты шлях да тэрору. Такі гістарычны вынік прыходу маргіналаў да ўлады. Тут няма розьніцы паміж савецкімі камуністамі, нямецкімі фашыстамі, французскімі рэвалюцыянэрамі, рэжымамі Пол Пота ў рэвалюцыйнай Кампучыі ці Дзювалье на Гаіці.

Рабэсп'ер, Сэн-Жуст, Дантон з дапамогай плебсу выразалі французскую арыстакратыю. Пасьля Рабэсп'ер і Сэн-Жуст адправілі на гільятыну Дантона. Пасьля з дапамогай разьятранага плебсу адправіліся на яе самі.

Працяг на старонцы 3.

№ 33 (94) 17 ЛІСТАПАДА 1997 г.

НАША НІВА

Другое прышэсьце Каралеўства

Акцыя «НН» у Варшаве. Старонка 4.

«У СБМ я загартаваўся ў сапраўднага патрыёта»

Успаміны Кастуся Рамановіча на старонцы 11.

Застацца ў Вільні

Занатоўка на старонцы 5.

«Нам прапануюць беларускія турмы?»

Інтэрвію Валерыі Навадворскай на старонках 4-5.

Пісталет Дзяржынскага

Эсэ на старонцы 12.

Эпікон

Празаічныя творы нашых чытачоў на старонцы 14.

Жыцьцё і мара

Дзьве партугальскія навэлі на старонцы 15.

Славамір Адамовіч

Катлетка для сьледчага КГБ

МОМАНТ ПРАСОДЫІ

Што казаць, усе людзі хочуць есьці, і пажадана кожны дзень. Праўда, асобныя прадстаўнікі масы хочуць есьці чамусьці больш і смачней, чым астатнія. У выніку адна частка асабліва галодных выбірае такое жыцьцё, дзе «закон — тайга, пракурор — мядзьведзь», а другая ідзе ў сьледчыя, судзьдзі, пракуроры, у кантралёры, «оперы», «ціхары»... Сытуацыя выглядае парадаксальна, але гэтыя апошнія для нашага грамадзтва сёньня ўяўляюць большую небясьпеку, чым звычайныя крымінальнікі. «Як так?» — задаяце вы лягічнае ў гэтым выпадку пытаньне. І адказ будзе гэткім жа лягічным. Справа ў тым, што крымінальнік, асабліва прафэсійны, калі так можна сказаць, дзейнічае паводле свайго крымінальнага закону. Кішэнны злодзей, напрыклад, чысьціць кішэні грамадзянаў, а дамушнік — кватэры. І ад падобных элемэнтаў людзі могуць абараніцца з дапамогаю тых ці іншых мераў засьцярогі. Але як засьцерагчыся ад суб'ектаў у цывільным, якія хапаюць нас сярод белага дня, ад прадажных судзьдзяў, асабліва галодных сьледчых, ад пралетарскіх пракурораў? Ад гэтай пошасьці паасобку мы ня выстаім. Мы мусім прыйсьці да разумнай рызыкі і калектыўнага супраціву. Пры гэтым варта пазьбягаць як недаацэнкі асобна ўзятага рэпрэзэнтанта ўлады і рэжыму ў цэлым, так і пераацэнкі іх здольнасьцяў. Рана ці позна «асабліва галодныя» зробяць памылку, выправіць якую яны ўжо ня здолеюць. Ня здолеюць з-за сваёй катастрафічнай упэўненасьці, што ім хочацца есьці больш за астатніх. Мы дапаможам ім памыліцца.

АДКУЛЬ ЯНЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ

Каб найлепшым чынам арганізаваць супраціў, нам варта ведаць, наколькі якасным зьяўляецца той чалавек, зь якога прырода лепіць «асабліва галодных», на якой ступені інтэлектуальна-духоўнага разьвіцьця знаходзяцца тыя, хто спасягае на нашыя правы, свабоды, здароўе, нацыянальную годнасьць? Адкуль яны зьяўляюцца, дзе жывуць, наколькі інтэнсіўна рэпрадукуюць сабе падобных? Адным словам, Радзіма павінна ведаць сваіх «антыгерояў». У профіль і анфас. У цывільным і ў форме. Думаю, сьледчы КГБ Сакольчык зьяўляецца характэрным прадстаўніком клясы «асабліва галодных», так бы мовіць, тыпавы праект тыпова савецкага работніка спэцслужбаў.

Крыніцы нашай інфармацыі паведамляюць, што Саша Сакольчык зьявіўся на сьвет у сям'і міліцыянта Паўла Сакольчыка годзе ў шасьцідзясятым-шэсьцьдзесят першым. У гэтыя ж часы, яшчэ пры Хрушчове, сям'я Сакольчыкаў атрымала прытулак у двухкватэрным драўляным дамку, што стаяў на былой Астроўскай, а цяпер Ракаўскай вуліцы, побач зь месцам, дзе немцы ў час другой сусьветнай вайны расстрэльвалі жыдоў.

Сакольчык-меншы рос хлапчуком хваравітым, што вымушала маму Юлю сядзець дома, аддаючы сыну шмат часу і энэргіі. Хваробы сына вымагалі асаблівай дыеты. То таго, то гэтага нельга было яму есьці. І толькі катлеткі з капустай былі тым частым наедкам, якім і трактавала маці сваё ўпаднае на здароўе дзіця. Лішне казаць, што бацька часта вяртаўся са сваёй міліцэйскай работы ў вялікіх нэрвах. І гэта таксама не дадавала малому сілаў.

Аднак маміны капусныя катлеткі, відаць, пайшлі малому на карысьць. Саша паціху аклеваўся. Само сабою паўстала пытаньне, кім жа быць сыну міліцыянта. І мама Юля сказала: «Саша будет юристом».

Працяг на старонцы 6.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Сьвята чужога жыцьця

Неяк седзячы ў адной сьвяточнай кампаніі, я быў вымушаны сысьці. Растлумачыўшы свой неадкладны сыход тым, што мне тэрмінова трэба заехаць да адной знаёмай жанчыны, муж якой знаходзіўся пад аховаю. Здаецца, маё тлумачэньне ўсіх задаволіла й, здаецца, нікога не зьдзівіла. Прыемная бяседа працягвалася безь мяне, прыгожая гаспадыня падкладвала саляту, а вясёлы гаспадар не забываўся падліваць каньяк. Мая нагода сысьці не адцягнула іхнай увагі ад нагоды «хоць у коі векі» пасядзець. Было сёмага лістапада.

Яшчэ год таму гэтая празьмерна круглая дата выклікала лёгкую напругу. У маёй памяці добра захаваліся 50-я ўгодкі Перамогі, усьлед за якімі пасьледвала вялікая параза. Сёлетні лістапад наўрад ці захаваецца нават у памяці ягоных удзельнікаў, што так старанна рыхтаваліся да яго. Здаецца, у Менску, як нідзе, ён павінен быў стаць калі не Падзеяй, то Сьвятам усіх убогіх і пакрыўджаных. Гучным, размашыстым і абавязкова з «таким молодым впереди». І раптам такі Правал. Не дапамагло нават добрае надвор'е. На нечаканым у гэткі дзень сонцы раптам стала відавочнаю ўся наша недатычнасьць да чужога юбілею. На вуліцы выйшлі ня дзеці, і нават ня ўнукі юбіляркі. Выйшлі яе «бедные родственники», чыя беднасьць нават не захіналася выцьвілымі харугвамі. І якім недарэчным на менскіх вуліцах выглядалі нашы хлопцы, пераапранутыя ў рэвалюцыйных жаўнераў. Вясёлы тэатар магчымы толькі ў Петраградзе, дзе Міцькі суправаджвалі «галоўнага віноўніка» назад у Фінляндыю. Ці ў Маскве, дзе на ленінскіх нашчадкаў з пачуцьцём удзячнага гледача пайшоў бы падзівіцца й я. Глядзець жа на нашых правінцыйных камэдыянтаў... Вось і засталася адно нагода выпіць «за посьпех белага руху». Ды й гэта ўжо ня сьмешна, калі нехта сёньня можа выпіць толькі вады.

Юбілей прамінуў. Але пахаваньне юбіляркі ўсё адкладаецца. І менавіта тут, дзе не прымалі яе родаў. І дзе яна з апошніх сілаў чапляецца за жыцьцё, калечачы жыцьці знаёмых і незнаёмых людзей. Ёй тут недастаткова шоў. Яна яшчэ верыць у сваю магчымасьць пладзіцца. Але яна мусіць памерці. Занадта шмат людзей ёй гэтага зычаць. Жывых, маладых, моцных людзей. Ужо здольных адрозьніваць сваё ад чужога. У якіх яшчэ будзе не адна нагода сабрацца. Зіма мінае. Наш Юбілей наперадзе.

Зьміцер Бартосік

У Вярхоўным Судзе зламаўся ксэракс

Як ужо паведамляла газэта, 14 кастрычніка 1997 г. Судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда РБ у складзе Старшыні Чертовича В.П. і судзьдзяў Листратенко П.А. і Василевич Т.В. разгледзела ў адкрытым паседжаньні крымінальную справу па касацыйных скаргах асуджанага Адамовіча С.Г. і яго абаронцы-адваката Паганяйлы Г.П., асуджаных Уладзімера Плешчанкі і Барыса Хамайды на прысуд судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскага аблсуда ад 13 чэрвеня 1997 году. І роўна месяц часу спатрэбіўся на тое, каб «определение» судзьдзяў трапіла з вуліцы Леніна, 28, што ў Менску, на вуліцу Сурганава, 45/3 гэтага ж населенага пункту, дзе жыве С.Адамовіч. Прычынаю такой доўгай «вандроўкі» дакумэнта, па словах сакратарак вышэйшай судовай інстанцыі, стала тое, што ў іхнай установе «сломался ксерокс». Ксэракс, відаць, адрамантавалі, бо 14 лістапада доўгачаканае «определение» з паведамленьнем №02-361к за подпісам начальніка ўправы С.Н.Ласкевича пошта даставіла на адрас аўтара верша «Убей президента». Аднак рэчы паэта, забраныя ў час вобшуку 22 сакавіка 1996 г., паранейшаму застаюцца ў распараджэньні сьледчага КГБ Сакольчыка і судзьдзі Віцебскага аблсуда Гурко.

Раман Гарт

ПОШТА

УСПАМІНЫ АБ БУДУЧЫНІ

Ня тое мы робім! Далоў пікеты, мітынгі, тусоўкі, сэмінары, курсы!.. Пакінем Лукашэнку сам-на-сам зь ягоным электаратам. Няхай злучае Менск з Масквой, а Беларусь з Расеяй. Ня трэба «ўводзіць» гістарычную тапаніміку «Літва», як прапануе Аляксандар Моргун з Баранавічаў. Ага, шустры! Баранавічы —сталіца Літвы! Маё Глыбокае — ня горш. Напалеон назваў яго «другім Парыжам»!

Некалі я таксама хварэў на рамантызм. Вось прыйдзем да ўлады, паедзем у Гаагу, у міжнародны арбітраж, адсудзім у летувісаў Вільню і назоў Літва, а ў расейцаў — усе землі нашыя, якія «ляжаць у 107-мі вярстах» не даходзячы Масквы. Цяпер разумею: дарэмна, ніколі гэтага ня будзе! Тады навошта жыць? — пытаю я сам сябе. Пятлю на шыю? Ці можа пражыць усё гэта сапраўдны беларускі нацыяналіст? Няўжо зноў у акопы? У лясы? Змагацца!

Ужо ня першы год, ня першы раз у розных газэтах чытаю, што хутка будзе канец сьвету. Вось прыклады: газэта «Звязда» за 31 кастрычніка г.г. прарочыць канец сьвету ў 2014 годзе, а газэта «Сенсация» №11 (31) за г.г. ідзе яшчэ далей (прабачце! бліжэй!) і прарочыць словамі Настрадамуса: «Год 1999, седьмой месяц, с неба придёт великий царь Ужаса...»

«Той, хто мае вушы, няхай пачуе». А што, калі гэта ўсё ёсьць праўдай! Вернецца, як заўсёды, праз 1728 гадоў мітычная плянэта Фаэтон, якая колісь пахавала Атлянтыду, «замардавала» дыназаўраў, мамантаў і краманьёнцаў... Казалі ж эгіпецкія жрацы Саламону: «... ужо былі і яшчэ будуць шматкроць і розныя выпадкі пагібелі людзей, і прытым самыя жахлівыя — з-за агню і вады...»

Засталося, як кажуць, з «гулькін нос». Гады паўтары! Беларусы, прытым сьведамыя, павінны быць разумнейшымі. Кідайма пікеты і мітынгі! Будуйма каўчэг! Няхай лукашэнкі, шэйманы, ціцянковы і замяталіны са сваім разумным электаратам змагаюцца зь землятрусамі, патопамі і цунамі. Гэта ня наша справа.

Запісвайма на касэты, дыскеты, мікрафільмы ўсю беларускую спадчыну: гісторыю, міты, паданьні, помнікі пісьменства, архітэктуры і ўсё астатняе, што можна задакумэнтаваць, пакласьці ў прабіркі і колбы, закаркаваць у бутэлькі.

Мы вернемся, можа, нават з космасу, на ляталых талерках (вобразны «Ноеў каўчэг»), і над пустэльнымі скалістымі выспамі ўзьнясём бел-чырвона-белыя сьцягі. Мы створым новы міт пра «белых русаў» з плянэты Літва, якія сышлі зь нябёсаў і стварылі пасьля патопу на Зямлі цывілізацыю. Усё будзе нашым — ад мора да мора! Паўсюль — адна толькі беларуская мова (хай сабе яе назавуць літвінскай), і бел-чырвона-белыя сьцягі , і «Пагоні» — на палацах, на ратушах, над пляцамі, над хатамі і хмарачосамі. І так бясконца, тысячы гадоў далей.

Вось якая наша стратэгічная задача! Не пікеты, ня мітынгі, а — КАЎЧЭГ! Хай А.Г. са сваім электаратам праводзіць выбары, рэфэрэндумы, славянскія рынкі (ці базары), саюзы і хаўрусы. Ня лезем, мальцы, туды! Ня наша справа. Нам трэба сыпяшацца, а то атрымаецца, як у тым анэкдоце. Пачынаецца патоп. Рабін стаіць ля сынагогі. Плыве човен зь людзьмі, яны гукаюць: «Рабін, садзіся ў човен, бо патопішся!» «Не! Бог мяне любіць, ня дасьць загінуць,» — кажа Рабін. Вада падступае ўжо да вакон. Плыве другі човен: «Рабін, давай хутчэй у човен! Патопішся!» «Не! Бог мяне любіць! Ня дасьць загінуць!» Рабін ужо на даху бажніцы. Плыве трэці човен: «Рабін, давай хутчэй у човен!» «Не! Бог мяне любіць! Ня дасьць загінуць!» На тым сьвеце Рабін кажа: «Божа, я ж цябе так любіў! Чаму Ты даў мне загінуць?» Бог кажа:«Я ж табе тры разы човен пасылаў, а ты не схацеў ратавацца! Чаго цяпер гневаесься!»

Жыве супэр-беларуская цывілізацыя!

Мікола Самавіты
Глыбокае

ШАНОЎНЫЯ СПАДАРОВЕ!

Калі пытаю ў сябе, што выбраць: за касьнеласьць і **заскарузласьць, «заім-**шэласьць» саўковабеларускіх тэкстаў ці эквілібр новабеларусаў, то выбіраю апошняе, бо ёсьць надзея, што эквілібрыст пройдзе свой тэкст да канца і пройдзе прыгожа.

Гэта значыць, я выбіраю стыль «Нашай Нівы». Але балянсаваньне на канаце ня можа быць нормай надоўга. Пара ўжо сталець і хадзіць па зямлі, а экспэрымэнтальным тэкстам адводзіць адпаведную рубрыку. Скажам, «Рызыкоўны эквілібр» альбо «Мастацкае катаньне на каньках — адвольная праграма паводле Зыгмунта Фройда». Тады будзе зразумелым падзеньне альбо шэраг падзеньняў пры выкананьні супэрэлемэнтаў.

Ну вось узяліся Вашыя аўтары раскручваць тэму аднаполага каханьня. І так адразу вобзем! Згадзіцеся, пэўная афарыстычнасьць ёсьць у формуле: «У адрозьненьне ад сэксуальных меншасьцяў, беларуская меншасьць у Беларусі мае шанец стаць большасьцяй».

Аднак у «НН» мы чытаем пра натуральны стан таго, што сэксуальныя меншасьці, як і ўсялякія іншыя, маюць вэктар, скіраваны ў бок пераўтварэньня ў большасьць (№27-28 за г.г.).

Пойдзем ад адваротнага. Калі гэтае няшчасьце з намі здарыцца, і геі ды лесьбіянкі стануць большасьцяй — чалавецтва ж вымра праз колькі дзясяткаў гадоў. Што ж тут натуральнага?

Здаровы сэнс — вось крытэр усялякага эквілібру.

Яўген Бяласі,
Берасьце

ПАВАЖАНАЯ РЭДАКЦЫЯ,

Ня маючы належнага таленту для напісаньня артыкулу, прапаную Вашай увазе некаторыя матэрыялы. Прашу зацікавіцца ніжэйзгаданым, бо лічу ўсё вельмі важным, тым, што адлюстроўвае цяперашняе рэлігійнае і палітычнае становішча.

У в. Сёмкаў Гарадок пад Менскам існуе паўразбураны касьцёл. Некалькі дзесяцігодзьдзяў таму Сёмкаў быў Хмарыным гарадком — ад імя ўласьніка Хмары. Да II-й сусьветнай вайны касьцёл перадалі Расейскай Праваслаўнай Царкве, а потым, недзе ў пачатку 70-х будынак быў той жа РПЦ разрабаваны, усё начыньне вывезенае ў сабор Сьвятога Духа (тады плошча 8-га сакавіка). Помнік пачаў разбурацца.

Улетку 1996 году ў Сёмкавым Гарадку зьявіліся два сьвятары, прадстаўнікі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Цэлы год яны плённа працавалі, абудзілі значную частку жыхароў ад атэістычнага сну. Будынак быў расчышчаны людзкімі рукамі, падрыхтаваны да прафэсійнай працы рэстаўратараў. У нядзелі і сьвяты ішлі набажэнствы. Далей пачынаецца цікавае. Да ўладаў даходзяць зьвесткі, што мае адбыцца аднаўленьне самога будынку, што на гэта зьбіраюцца сродкі. Некалькі мясцовых замбіраваных беларусафобаў прывозяць у Сёмкаў Гарадок нейкага «законнага» сьвятара з паперамі ад «властей». Асноўная частка жыхароў не прыняла яго і не пусьціла да крыжа нават тады, калі расейскі поп прыехаў з брыгадай малойцаў з СС «Белая Русь» і спрабаваў прарвацца праз агароджу могілак. Самі разумееце, што паглядзеўшы на тое, як цэлымі мікрааўтобусамі прывозяць невядомых «змагароў за расейскую веру», людзі зьвярнуліся па дапамогу да БНФ. Прыехаўшы ў адну зь нядзеляў да касьцёлу, кіраўнік адной з дружынаў БНФ паглядзеў на ўсё сваімі вачыма і сказаў: «У вас тут гарачэй, чым у Менску». Абяцаў далейшую дапамогу. Дарэчы, некалькі разоў пытаньне ўздымалася на Соймах БНФ. Але ўсё загаворваецца кімсьці. Падтрымкі ніякай. У той жа час па Сёмкавым Гарадку ездзяць агітатары на іншамарках і раздаюць агіткі з фальсыфікацыямі як пра сьвятароў БАПЦ, так і пра царкву ўвогуле.

У канцы ліста адзначу, што, на маю думку, ёсьць сувязь паміж ахалоджаньнем адносінаў Фронту да людзей у Сёмкавым Гарадку і да БАПЦ як альтэрнатывы РПЦ і саборам у Маскве, дзе Філарэт некалькі гадзінаў даваў адказ на пытаньне Алексія: «Што там у вас у Беларусі робіцца?»

Так што чакаем Вас, калі ласка. Сёмкаў Гарадок, кожная нядзеля, 10.00, каля царквы.

Вадзім

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Хартыя'77

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусі, заяўляем, што дзеяньні цяперашніх уладаў накіраваныя на зьнішчэньне неад'емных правоў і свабодаў чалавека. У краіне растаптаны асноўны закон —Канстытуцыя. Беларускаму народу адмоўлена ў праве абіраць сваіх прадстаўнікоў ва ўладныя структуры. Вядзецца сыстэматычны наступ на свабоду слова, на правы грамадзянаў ведаць рэальнае становішча ў краіне. Разбураюцца нацыянальныя культура і школа, дыскрымінуецца беларуская мова. Штодзённы рост цэнаў і жабрацкі заробак ставяць на мяжу існаваньня сотні тысячаў сем'яў. Напярэдадні XXI стагодзьдзя ў цэнтры Эўропы ўсталяваўся дыктатарскі рэжым. Дзесяць мільёнаў людзей апынуліся ў палоне гвалту.

Мы верым, што наша Радзіма вартая свабоды і росквіту. Мы верым, што менавіта такой зробяць яе нашы супольныя намаганьні. Нас натхняе прыклад свабодных народаў, якія прайшлі гэты шлях раней за нас. Мы памятаем, як група мужных чэскіх і славацкіх праваабаронцаў падпісала Хартыю'77, у якой заклікала да барацьбы з таталітарызмам у сваёй краіне, і як празь некалькі гадоў ад чырвонай дыктатуры ва Ўсходняй Эўропе не засталося сьлядоў. Людзі ў гэтых краінах атрымалі магчымасьць вольна будаваць сваё жыцьцё і дасягаць дабрабыту.

Мы ня можам больш цярпець гвалт, парушэньні законаў, злачынствы супраць усяго народу й кожнай асобы. Мы будзем салідарныя з кожным, хто змагаецца за свае правы, за свабоду й добрыя ўмовы жыцьця для сваіх сем'яў.

Мы вызнаем розныя палітычныя погляды і рэлігійныя веравызнаньні, але нас аб'ядноўвае любоў да свабоды й Бацькаўшчыны. Падмуркам нашай падрыхтаванасьці да супольных дзеяньняў у справе вызваленьня беларускага народу зьявіцца павага да поглядаў і веры адно аднаго. Наша салідарнасьць пераможа гвалт і бессаромную хлусьню. Усе, хто выйшаў на шлях змаганьня за свае правы і чалавечую годнасьць, павінны быць упэўненыя ва ўсеагульнай падтрымцы.

Мы спадзяемся на разуменьне сусьветнай супольнасьці і салідарнасьць усіх сілаў, якія разумеюць небясьпеку ўсталяваньня на постсавецкай прасторы новай карычневай імпэрыі. Аскепак таталітарызму павінен быць выняты зь цела Эўропы.

Мы, грамадзяне Беларусі заяўляем сёньня пра сваю адказнасьць за лёс краіны, за будучыню нашых дзяцей. Мы зробім Беларусь вольнай, незалежнай, багатай эўрапейскай дзяржавай, дзе абароненыя правы чалавека, дзе няма палітзьняволеных, дзе ўсе маюць годныя ўмовы для жыцьця.

Мы заклікаем усіх грамадзянаў Беларусі далучыцца да нашай Хартыі, каб супольна змагацца за свае правы й свабоды, за аднаўленьне дэмакратыі й законнасьці ў нашай краіне.

Жыве вольная незалежная Беларусь!

Дубавец Сяргей
Дзярновіч Алег
Харэўскі Сяргей
Бартосік Зьміцер
Дашкевіч Алег
Квяткоўскі Севярын
Корзун Віктар
Лапцёнак Андрэй
Арэшка Вацлаў

Адамовіч Славамір
Агурцоў Яўген
Андрэеў Віктар
Арлоў Уладзімер,
Астроўскі Алесь
Бабкоў Ігар
Багданкевіч Станіслаў
Бандарэнка Дзьмітры
Барадач Уладзімер
Барадулін Рыгор
Баршчэўскі Лявон
Букчын Сямён
Бураўкін Генадзь
Бухвостаў Аляксандар
Быкаў Васіль
Быкаў Генадзь
Бяляцкі Алесь
Васількоў Віталь
Вашкевіч Аляксандар
Вільман Віктар
Волкаў Уладзімер
Вольскі Лявон
Вячорка Вінцук
Гавін Тадэвуш
Ганчар Віктар
Гілевіч Ніл
Голубеў Валянцін
Гразнова Людміла
Грушавы Генадзь
Грыб Мечыслаў
Грыцкевіч Анатоль
Гусак Станіслаў
Дабравольскі Аляксандар
Данейка Павал
Дашук Віктар
Домаш Сямён
Дрэбезава Галіна

Дударава Надзея
Жаляпаў Хрыстафор
Жук Павал
Журакоўскі Валеры
Захаранка Юры
Знавец Павал
Івашкевіч Віктар
Іпатава Вольга
Казлоўскі Павал
Камоцкая Кася
Каравайчык Іван
Карпенка Генадзь
Кацора Ўладзімер
Кобаса Міраслаў
Карняенка Віктар
Кароль Аляксей
Караткевіч Вольга
Карназыцкі Павал
Костка Валеры
Лаўроўская Ірына
Літвіна Жанна
Лукашэвіч Алена
Лябедзька Анатоль
Марыніч Міхаіл
Маркевіч Мікалай
Марачкін Алесь
Мацкевіч Уладзімер
Марцалеў Сяргей
Мілінкевіч Аляксандар
Міндлін Леанід
Міцкевіч Марыя
Нісьцюк Уладзімер
Паганяйла Гары
Пастухоў Міхаіл

Патупа Аляксандар
Процька Тацяна
Роўда Ўладзімер
Саверчанка Іван
Саньнікаў Андрэй
Сасноў Аляксандар
Севярынец Павал
Сівуха Валеры
Сіўчык Вячаслаў
Скочка Яўген
Статкевіч Мікола
Тарас Валянцін
Трусаў Алег
Трыгубовіч Валянціна
Тычына Міхась
Фадзееў Валеры
Фрыдлянд Міхаіл
Халезін Мікалай
Халіп Уладзімер
Хашчавацкі Юры
Хадыка Юры
Чарноў Віктар
Чыгір Міхаіл
Шалкевіч Віктар
Шарэцкі Сямён
Шатэрнік Алесь
Шарамет Павал
Шлындзікаў Васіль
Шушкевіч Станіслаў
Шчукін Валеры
Шэрман Карлас
Юрына Галіна
Якаўлеўскі Раман
Ялфімаў Віктар

Хартыя'77 _____
(Прозьвішча, імя)

_____

_____
(Подпіс)

Паважаныя чытачы! Мы заклікаем падтрымаць нашу ініцыятыву. Свае подпісы пад гэтым дакумэнтам Вы можаце даслаць на адрас рэдакцыі.

МАРШ, МАРШ ЛЕВАЙ

Працяг са старонкі 1.

Усё пачынаецца з малога, працякае па рознаму, але сканчаецца адным і тым жа — самазьнішчэньнем.

Захапіўшы ўладу, лідэры плебсу прымаюцца за сваіх паплечнікаў. Трымаць у страху бліжэйшае атачэньне — клясычная праява лявацкіх правадыроў. У асяродзьдзі, дзе няма месца годнасьці, на высакародзтва разьлічваць марна.

З тых, хто ўсталёўваў уладу чырвоных, мала хто памёр сваёй сьмерцю. Фанатыкаў-рамантыкаў зжэрлі фанатыкі-практыкі. Спачатку, ціха — тых, хто быў больш уплывовы, блізкі і небясьпечны, кшталту Дзяржынскага, Фрунзэ. Пасьля, шляхам плянавай дыскрэдытацыі — розных бухарыных, радэкаў і іншых.

Не адставаў у гэтым і фюрэр, прыбраўшы сваіх паплечнікаў на чале са стваральнікам штурмавых атрадаў СА Рэмам.

У гэтым жа шэрагу і Мао, і Пол Пот, і драбнейшыя прыхільнікі сьветлай будучыні. Тэрор заўжды пачынаецца з хлусьні і правакацыі, і грунтуецца на самых нізкіх якасьцях натоўпу. Звычайна, калі ўлады распачынаюць палітыку адкрытых рэпрэсіяў, пад яе з большым ці меншым посьпехам спрабуюць падвесьці законную базу, раскручваючы істэрыю ў грамадзтве і прымаючы адпаведныя законы, паступова перакрываючы доступ да грамадзтва альтэрнатыўнай інфармацыі і абмяжоўваючы кантакты свайго грамадзтва з суседнімі. Клясычны прыклад — СССР да адлігі.

Што тычыцца тэрарызму, то ён з-за спэцыфічных падпольных умоваў свайго існаваньня часта набывае адмеціну гераізму, асабліва для моладзі, і часам — небяспадстаўна. Змаганьне за вызваленьне свайго грамадзтва ад дыктатуры альбо Бацькаўшчыны ад акупантаў, ад тэрору чужой, больш моцнай дзяржавы — сьвятая справа.

Таму барацьба курдаў, змаганьне ІРА ў Ірляндыі, а ЭТА ў Басконіі выклікаюць спачуваньні ня толькі ў моладзі. Таму Шаміль Басаеў, зьдзейсьніўшы тэрарыстычны акт, стаў нацыянальным героем Каўказа. Ня кожны здольны сваім учынкам спыніць вынішчэньне свайго народа. Таму мела вялікую папулярнасьць беларуская партызанка. Таму перажывае чарговую хвалю сваёй папулярнасьці Чэ Гевара.

Але, прыйшоўшы да ўлады, далёка ня ўсе былыя змагары за свабоду прымаюць новыя мірныя ўмовы існаваньня.

Сама праява тэрарызму, калі яна сьвядома не інсьпіруецца дыктатарскім рэжымам, сьведчыць пра тое, што ў грамадзтве нешта ня так, нешта зламалася. На першым этапе — гэта крык адчаю пэўнай часткі грамадзтва. Нармальная ўлада мусіць задумацца і зрабіць пэўныя намаганьні, каб вырашыць праблему мірным шляхам. Але такія выпадкі хутчэй выключэньні, а ня правіла. Зазвычай барацьба ідзе на паражэньне, да пераможнага канца. Структуры тэрарыстаў набываюць прафэсіяналізм і моц, ствараецца сыстэма здабыцьця і адмываньня грошай, усё гэта мацуецца пралітай крывёю і ўсё большай нянавісьцю, урэшце ўтвараецца нават свая бюракратыя, якой невыгодна спыненьне, а тым болей зьнішчэньне разьвітай структуры. Адпаведна дзяржава спараджае новыя сілавыя сруктуры, якім таксама невыгодна, з тых самых прычынаў, спыняць сваё існаваньне. Атрымліваецца замкнёнае кола, а ў выніку церпіць грамадзтва, якое дазволіла сабе не задумвацца і не аналізаваць сытуацыю.

Сёньня наша краіна знаходзіцца ў стане дыскамфорту. Сталыя скандалы з выкрыцьцём карупцыянэраў, дэпрэсія ў эканоміцы, міжнародная палітычная ізаляцыя, палітычныя дывэрсіі, дэманстрацыі, перасьлед па палітычных матывах. Мы маем рэвалюцыйныя ўмовы, хоць быццам ніякіх рэвалюцыяў не было. Насамрэч рэвалюцыю мы ўжо перажылі. Электаральную. Пад назовам — прэзыдэнцкія выбары 1994 году. У выніку перамагла левая маргінальная частка грамадзтва на чале са сваім лідэрам.

Беларусь напалоханая мінулай вайной. У сьвядомасьці грамадзтва гэты спалох такі моцны, што людзі ўпарта ня хочуць прагназаваць і задумвацца над канфліктнымі сытуацыямі, якія штучна ствараюцца ў краіне.

Грамадзтва не заўважыла, як ушчыльную наблізілася да мяжы, за якой пачынаецца тэрор і тэрарызм. Прыкметы і першага, і другога ўжо больш чым заўважныя. Рысу пад сытуацыяй якасна іншага, новага парадку падвёў нядаўна прыняты закон аб барацьбе з тэрарызмам. База пад яго падводзілася плянава, пакрысе. Грамадзтва да яго старанна падрыхтоўвалася. Відаць, рыхтаваліся аргумэнты і для міжнароднай грамадзкай думкі.

Гэты ўказ выйшаў апошнім у шэрагу забаронных. Яму папярэднічалі ўказы аб мітынгах і дэманстрацыях, аб дзейнасьці прафсаюзаў, аб умацаваньні працоўнай дысцыпліны, урэшце аб прэсе.

Адначасова праз уціск усяго нацыянальнага і пагарду да прававых нормаў правакаваліся дзеяньні ў адказ. З падрывам газаправоду і суда такія дзеяньні зьявіліся ў нашым кантэксьце. Няважна, хто за гэтым стаіць і ці адсочваецца сытуацыя ўладамі, галоўнае, што яны маюць месца. За іх узялі адказнасьць.

У грамадзтве нагнятаецца істэрыя. За краты кідаюцца нават школьнікі за малюнкі на плоце з аднаго боку, з другога —заслужаныя старыя. Зноў раскручваецца тэма карупцыі. Скандал ідзе за скандалам. Трымаецца ў напрузе бліжэйшае атачэньне прэзыдэнта электарату. Там проста пануе страх.

Калі ў краіне няма буйнога прыватнага капіталу, а ўвесь эканамічны патэнцыял забраны ў рукі дзяржавы, то і мафія, гэты заўсёдны спадарожнік вялікіх грошай, таксама засяроджаная ўнутры дзяржапарату. Тым болей, калі існуюць два бюджэты. Тым болей, краіна займае надзвычай выгоднае геаграфічнае становішча і, дзякуючы палітыцы рэжыму, мае выдатную магчымасьць паралельна з законнай эканамічнай дзейнасьцю зарабляць вялікія грошы на кантрабандзе. Скандалаў з гэтае нагоды было дастаткова. Торгэкспо, фонд Эсамбаева... Атрымліваецца, што чынавенства зраслося з мафіяй і ўтварае мафіёзную дзяржаву, дзе палітыкі дзейнічаюць паводле мафіёзных законаў.

Прэзыдэнцкі кантралёр Мікалуцкі, быў надзвычай уплывовай асобай у рэгіёне паблізу няіснай, але стратэгічнай для ценевай эканомікі мяжы з Расеяй і ведаў, відаць, небясьпечна шмат. Адказнасьць за гэты тэракт ніхто на сябе ня ўзяў, але цяжка не пагадзіцца з прэзыдэнтам, які заявіў у Магілёве, што гэта палітычнае забойства і што забойца знаходзіцца побач.

Формула «няма чалавека — няма праблемы» не перастае быць клясычнай формулай тэрору. Дзіўна, але Мікалуцкі быў забіты менавіта ў той момант, калі значна пагоршыліся адносіны з Расеяй, калі тая прыватным чынам ставіць пасты на мяжы на шляху асноўных грузапатокаў, калі сталі відаць вынікі прайграных баёў з прэсай, калі ня зьдзейсьніліся захады да прарыву палітычнай блякады ў сьвеце, урэшце, калі зьявілася патрэба ў апраўданьні ўказу аб барацьбе з тэрарызмам. Словам, калі прыйшоў час пераводу грамадзтва ў якасна іншы рэжым існаваньня.

Краіна заўзята сьвяткуе васьмідзясятыя ўгодкі рэвалюцыі. Краіна мае міліцыі болей, чым арміі. Улада абвясьціла аб стварэньні дружынаў са сваіх камсамольцаў. Прэса папярэджаная, маўляў, ва ўлады ёсьць кулакі. З расейскіх тэлеканалаў выразаюцца праўдзівыя перадачы пра Леніна.

Краіна крочыць левым маршам. Маршам тэрору і тэрарызму. Але нават, калі нас чакае найгоршы сюжэт, які ўжо меў месца ў гэтым стагодзьдзі, тых, хто яго рыхтуе, гэта ня выратуе. Першыя вынікі ўжо відаць. Бо філязофія тэрору — самагубства. Ілюзіяў няма.

Алег Дашкевіч

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Другое прышэсьце Каралеўства

З трэцяга да дзевятага лістапада ў Варшаве працавала выстава «Каралеўства Беларусь». З ініцыятывы Фундацыі імя Стэфана Баторыя акцыя, распачатая за месяц да таго ў Падкове Лэсьнэй, атрымала працяг у «Аўдыторыюм Максымум» Варшаўскага Універсытэту. Удзельнікі — тыя ж мастакі, чые працы былі выстаўленыя ў Падкове, — Артур Клінаў, Віктар Пятроў-Хруцкі, Алена Адамчык, Міхал Баразна, Ігар Саўчанка, Юры Дарашкевіч, Дзяніс Раманюк ды іншыя. На жаль, ня ўсе працы ўдалося паказаць ва Універсытэце. Не было ўжо й пэрфомансаў, сьпеваў, фэрвэркаў. Але інтэлектуальны асяродак Варшавы прадэманстраваў сваю зацікаўленасьць да фэномэну новага беларускага мастацтва, да культуры краіны так блізкай да Польшчы і гэтак адарванай сёньня і ад яе, і ад усяго цывілізаванага сьвету.

Мантаж выставы пачаўся яшчэ ў нядзелю і працягваўся амаль увесь панядзелак — дзень адкрыцьця. У перапынках паміж лекцыямі па пляцоўцы праносіўся натоўп студэнтаў. Адны з кубачкам кавы з аўтамату, гамонячы, перакрочвалі праз раскладзеныя рамкі, нехта запавольваў крок, спыняўся перад абразамі, разглядаў інсталяцыі. Раптам, падымаючы шчыт зь цяжкімі фота, адчуваеш, што ён пайшоў дагары сам — хтосьці падтрымаў, нехта працягнуў малаток з падлогі. Пытаньні — «гэта адкуль — зь Міньска?», «панове — бялорусіні?», «а мы й ня думалі, што ў вас ёсьць такое», «а калі адкрыцьцё?», «а як прозьвішча мастакоў? Яны таксама — бялорусіні?», «а будуць каталёгі?», «а творы можна набыць?», «а як у вас там жыцьцё, насамрэч — дыктатура?», «а колькі будзеце яшчэ цярпець вашага Лукашэнку?», «а ў вас ёсьць Салідарнасьць?» На ўсё, бадай што, адказаць немагчыма. Але можна лічыць, што акцыя пачалася. Пачаткам яе, напэўна, стала зьяўленьне як з туману Артура Клінава з пляшкай менскай «Глёрыі» ў кішэні. Гадзіна за гадзінай халодная заля ператваралася ў кавалак тэрыторыі Каралеўства Беларусь. Прыбывалі й ягоныя грамадзяне — самаходам прыехала Алена Адамчык.

На само адкрыцьцё народ зьбіраўся паволі — гадзіна пік, час шалёных варшаўскіх заторaў. Сьцягнуліся пераважна беларусы — прафэсар Баршчэўскі, Алена Глагоўская з Гданьску, рэпарцёры з «Радыё-5» і нашага «101,2». Польскія галерэйшчыкі, мастакі, анархісты, сябры.

Адгучалі прамовы, разьбегся натоўп студэнтаў, а тыя, хто застаўся, — гэта значыць свае, рушылі ў Этнаграфічны Музэй — там за філіжанкай кавы, за куфлем піва абмеркаваць вынікі, абгаварыць новыя польска-беларускія культурныя праекты.

Вацлаў Арэшка

«Нам беларускія

Своеасаблівы погляд на пэрспэктывы Саюзу Беларусі й Расеі выказала ў сваім інтэрвію «НН» Валерыя Навадворская.

— Валерыя Ілінічна, два гады таму, калі беларускія палітыкі і журналісты папярэджвалі сваіх расейскіх калегаў пра пагрозу, якою ёсьць беларускі прэзыдэнт, ніхто не зьвяртаў на гэтае ўвагі. Як вы мяркуеце, ці мае Расея магчымасьць пазьбегнуць беларускага сцэнару?

— Што Аляксандар Рыгоравіч — вораг свайму народу, было відавочна зь першага дня для ўсіх, акрамя беларускага электарату, які галасаваў за яго. А вось тое, што ён вораг і расейскаму народу, высьветлілася параўнальна нядаўна. Лукашэнка — звычайны дыктатар, які ненавідзіць любы свабодны народ. А зараз, я мяркую, што нават Барыс Мікалаевіч ня мусіць мець ніякіх сумневаў на гэты конт. На ягоным месцы мы б

ЮБІЛЕІ

Першыя сьцягі

Менскай мастацкай вучэльні імя Глебава 50 гадоў

Пасьля таго, як у 1982 годзе вучэльня пераехала ў стары, яшчэ даваенны будынак былога фінансава-эканамічнага тэхнікуму, тут стварылася асаблівае асяродзьдзе. У аточаным цёмным паркам доме з пампэзным портыкам, паводле нейкага зьбегу зораў, увесь час жыў беларускі дух. Хоць, вядома, камуністы заўсёды трымалі руку на пульсе адукацыі.

Але многія «праваакацыі» праходзілі. У сярэдзіне 80-х нацыянальная сьведамасьць сярод навучэнцаў пачала буяць нечаканым кветам. То тут, то там на плякаціках-эскізіках пазьяўляліся Пагоні, бел-чырвона-белыя спалучэньні, шасьціканцовыя крыжы і нават подпісы беларускаю лацінкай. Настаўнікі часьцей за ўсё глядзелі на гэта скрозь пальцы. Спадарыня Лордкіпанідзе, якая правяла маладосьць у сталінскіх турмах, актыўна бараніла права вучняў пісаць на сваёй мове. Пасьля зьявіліся насьценгазэты па-беларуску, з усімі нацыянальнымі «наваротамі» і першыя ў Менску беларускамоўныя дыскатэкі...

Але пасьля ўдзелу навучэнцаў у акцыі супраць зьнішчэньня будынку першай беларускай опэры, «органы» ўзяліся за мастацкую вучэльню ўсур'ёз. Апроч таго, што некалькіх вучняў зьбілі міліцыянты й пратрымалі ў пастарунку ўсю ноч, у газэтах разгарнулася кампанія супраць «нацыяналізму». Кампанію ачольваў малады старшыня гаркаму партыі Краўчанка. На агульным сходзе ў вучэльні пасьля цытатаў 30-50-х гадоў пра дробнабуржуазнасьць Дуніна-Марцінкевіча і Багушэвіча старшыня камсамольскае арганізацыі па прозьвішчу Марцінкевіч распавёў зьнямелым вучням і настаўнікам, што ў вучэльні дзеіць некалькі(!) антысавецкіх груповак. Тады гучнай справы ня выйшла. Дырэктар вучэльні Краўчук, па мянушцы Орех (за тое, што старанна «окал»), як ні спрабаваў давесьці ў КГБ, што й сапраўды ён выявіў нацыяналістычную сетку, нічога не дамогся. Зь яго спруту сьмяяліся нават гэбісты. Ну, а камсамолец Марцінкевіч, злоўлены спачатку за расьпіцьцём у пад'ездзе гарэлкі, а пасьля і за «фарцою», скончыў сваю палітычную кар'еру.

Пакрысе ўсё увайшло ў норму. Аднавіліся нават рэпэтыцыі рок-гурта «Мроя», які прынес славу вучэльні. Праўда, не такую, як хацелася б кіраўніцтву. Змаганьне дырэкцыі зь беларушчынай не супынялася. Дырэктар выклікаў па адным вучняў, якія паслугоўваліся моваю, і казаў: «Я тоже белорус, но говорю по-русски. И ты, будь добр, в училище говори по-русски». Вынікі такога выхаваньня неўзабаве далі свой плён...

У кастрычніку, на сьвята брэжнеўскае Канстытуцыі, на вучэльні былі вывешаныя бел-чырвона-белыя сьцягі... Савецкія флагі былі сарваныя, адзін паклалі замест анучы перад дзьвярыма, а другі знайшлі ў сьметніцы. Цікава, што хлопцы, якія зрабілі гэты ўчынак, Алесь Макееў і Міхась Мірошнікаў не былі беларусамі па крыві. Таму іх нават не падазравалі. Затое паўгады ў вучэльні йшлі гэбісцкія допыты, праводзіліся экспэртызы. Дазнаньне КГБ выявіла, што й сапраўды, дзясяткі вучняў ужо даўно праводзілі незалежніцкую прапаганду, актыўнічалі ў розных беларускіх суполках. У ЦК КПБ і ў «органаў» галава пайшла кругам. А нашыя сьцягі ўсё ж луналі цэлых тры дні... Праз пару гадоў дырэктара вучэльні «скарацілі».

За гады йснаваньня вучэльні зь яе сьценаў выйшла звыш трох тысячаў выпускнікоў. Большасьць зь іх не засталася мастакамі. Хто піша кнігі ў Менску, хто працуе круп'е ў Нью-Ёрку, хто гандлюе машынамі ў Ляйпцыгу, а хто й па-просту настаўнічае ў вёсцы. У літаратуру сышлі Глёбус, Сьцепаненка, Сіўчыкаў, у музыку — Вольскі, Анемпадыстаў. Што да мастакоў, то і іх нямала: Савіцкі, Шчамялёў, Шаранговіч, Паплаўскі, Сумараў, а таксама браты Кашкурэвічы, Пятроў-Хруцкі, Клінаў. Міхась Мірошнікаў, які вывесіў сьцягі, працуе рэстаўратарам мэталу ў музэі народнага дойлідзтва ў Строчыцах, а ягоны паплечнік Алесь Макееў даўно эмігравaў з бацькамі ў Канаду. Цікава, як складзецца лёс тых хлопцаў, якія вывесяць на мастцкай вучэльні нашыя сьцягі заўтра?

Сяргей Харэўскі

ВЭРНІСАЖ

Гульні з фарбамі

Я не патрапіў на прымеркаванае на 6 лістапада адкрыцьцё выставы жывапісу Аляксандра Квяткоўскага «Гульні з вадзянымі фарбамі»: дзень вядомай усім рэвалюцыі ўжо ня першы раз у гісторыі стаў на шляху добрай справы. Але ён толькі на невялікі час адтэрмінаваў пачатак сьвята.

«Гульневы» цыкль твораў Аляксандра Квяткоўскага распачаўся летась з працы з матэрыялам ecoline. Гэтая фарба ўтварае кампраміс паміж жорсткай уедлівай тушшу й лёгкай «паветранай» акварэляй. Са словаў мастака, менавіта неспадзяванае спалучэньне якасьцяў ecoline'а, натхніла яго на пераход ад станковага жывапісу да эксперымэнтаў зь нядаўна вынайдзенай фарбай.

Сьвята «вадзяных фарбаў» распачалося 10 лістапада ў экспазыцыйнай залі беларускай Нацыянальнай бібліятэкі. Сёньня — пачатак апошняга тыдня працы экспазыцыі...

Вяртаючыся цёплым лістападаўскім надвячоркам з выставы, я завітаў у невялікую ўтульную кавярню, што ў цэнтры места. Там я сустрэў сваю даўнюю знаёмку, якую перад тым ня бачыў працяглы час. Мы радасна прывіталіся, і на перабой пачалі расказваць пра сябе й пра падзеі з свайго жыцьця. Амаль адразу ж размова перайшла на выставу «вадзяных фарбаў». Знаёмка распавяла, што яна літаральна ўчора наведала «Гульні...» Яна казала пра тое, як калісьці займалася ў дзіцячай выяўленчай студыі А.Квяткоўскага, і што, прачытаўшы абвестку ў «Нашай Ніве», адразу ж памкнулася на выставу...

Ня памятаю, як доўга цягнулася нашае блуканьне па імклівых, зьменлівых і далікатных сьцежках сумоўя. Мы глядзелі адно аднаму ў вочы і гулялі ў чароўныя ледзь ўлоўныя «акварэльныя» перадчуваньні... Зрэшты, гэта не было гульнёй, бо ў прастору, у якую мы рушылі з кавярні адной зь вядомых нам сьцежак, мы ўвайшлі, трымаючыся за рукі...

Мар'ян Шот

Адкрытыя

Хадзіць на выставы каштоўнасьцяў без аніякага жаданьня «дакрануцца» — больш сумнага занятку для сябе выдумаць цяжка. Адпаведна, які узьнёслы павінен быць настрой у таго, хто шматкроць наведвае музэйныя залі з адною толькі думкай: каб тое палатно, ці вунь тая статуя аднойчы занялі месцы ў больш адпаведным інтэр'еры. Таму на выставу «Сто рарытэтаў», прысьвечаную 40-м угодкам Нацыянальнага музэю й гэтак густоўна разрэклямаваную ў газэце «Свабода», я ішоў, песьцячы ў сабе самыя злачынныя матывы. Ну сапраўды будзе крыўдна, калі мне не закарціць скрасьці чаго-**небудзь з нашага самага-самага багацьця**, што, як паведамлялася, усяго на колькі тыдняў адкрыецца вачам народа. Каб пасьля зноў на вякі зьнікнуць у тоўшчах музэйных сутарэньняў.

Худзенькі міліцыянцік сядзеў ля ўваходу ў невялічкую залю побач са сматрыцелькай ды мяў сваю шэрэнькую зімовую міліцыянцкую аблавушку. Гэтаю сваёю шапачкай ён уміг зьбіў маю інтрыгу. Мне засталося толькі атрымліваць законнае й сіратлівае задавальненьне ад сузіраньня выставы. Акрамя мяне ў залі з наведнікаў больш нікога не было. Міліцыянцік перакключыў сваю пільнасьць з шапачкі на мяне. Але дарэмна. Чым болей я глядзеў на рарытэты, тым хутчэй прыходзіў да высновы: сапраўдным злачынцам тут няма чаго рабіць.

Спачатку я адчуваў сябе нібы ў ня вельмі багатай антыкварнай краме. Небеларускія кінжалы ды шаблі, нямецкія дуэльныя пісталеты й стрэльба, ангельскі посуд і французскі кандэлябр ну ніяк не дадавалі мне пачуцьця гонару за гэткія разнастайныя трафэі невядома якой вайны. Асаблівую тугу я адчуў ад сузіраньня сапраўдных італьянскіх скрыпак, адна зь якіх нарадзілася ў XVI стагодзьдзі. Нешта падобнае я ўжо адчуваў у маскоўскім Музэі рэвалюцыі, дзе была выстаўленая гітара Высоцкага. Зараз я канчаткова ўпэўніўся, што сапраўдны інструмэнт павінен знаходзіцца альбо у футарале, альбо ў руках маэстра. Сапраўд-

Чалавек, які можа сумленна глядзець у вочы

6 лістапада ў Рэзыдэнцыі Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне» адбылася вечарына, прысьвечаная 60-м угодкам мастака й грамадзкага дзеяча Яўгена Кулікa. Я.Кулік нарадзіўся ў Менску, скончыў Менскую мастацкую вучэльню і Беларускую акадэмію мастацтваў (аддзяленьне жывапісу) ў 1963 годзе. Сябра Беларускага Саюзу мастакоў. Працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі. Тэма твораў — беларуская гісторыя і культура. Аўтар шэрагу хрэстаматыйна вядомых твораў.

Вялі вечарыну Аляксей Марачкін і Мікола Купава. Юбіляра віншавалі Васіль Быкаў, Лявон Баршчэўскі, Юры Хадыка, Рыгор Барадулін ды іншыя.

Вінцук Вячорка: «... Вы бралі на сябе місію ідэйнага натхненьня беларускага нацыянальнага вызваленьня... Ідэальны мастацкі густ. Калі мастацкую зьяву ацаніў Яўген Кулік, ухваліў яе, то гэта рэч вартая жыцьця, вартая Беларусі... І, напэўна, самы важны ўрок, які я ўзяў ад Вас — гэта вернасьць, каменная цьвёрдасьць і адданасьць беларускай ідэі».

Уладзімер Вішнеўскі, мастак-графік, акадэмік Беларускай акадэміі мастацтва: «Для нашага пакаленьня Яўген Сяргеевіч Кулік быў як бы патрыярхам найноўшага адраджэньня беларускай сьвядомасьці. Ва ўсякім разе для нашага пакаленьня мастакоў, якія прыйшлі зь вядомай школы-інтэрната Ахрэмчыка. Быў як бы зоркай для нас».

Ніл Гілевіч: «Каб мне прыйшлося знаёміць некага зь Яўгенам Куліком, я сказаў бы: вось чалавек, які можа зусім спакойна, сумленна глядзець у вочы любому беларусу і ўсяму беларускаму народу, і ўсёй сінявокай нашай Беларусі. І я думаю, што мы будзем жыць. Зыйдзе ўся гэтая шумапена, уся шумамець, гэты бруд. Можа быць, пройдзе вялікі час, доўгі час. 100 гадоў... І тады глянуць на партрэт Куліка і скажуць: вось чалавек, які ўсім сваім жыцьцём заслужыў права сумленна глядзець у вочы нам, нашчадкам, у нашай новай свабоднай навек Беларусі. Гэта нямала. Я ганаруся нашым знаёмствам, тым, што мы разам змагаемся».

Анатоль Кляшчук, фатограф-мастак: «... Лічу яго сваім духоўным настаўнікам. Гэты чалавек навучыў мяне цаніць каштоўнасьці. Калі мне нешта ўдаецца ў фатаграфіі, то ў лепшых здымках ёсьць часьцінка ягонае навукі».

Эдуард Агуновіч, мастак-музэограф: «Успамінаецца ягоная майстэрня, там ня толькі зарадзілася ядро выставак, ідэі выставак. Яўген Кулік іх задумваў. А мы іх выконвалі. Успамінаюцца тыя пытаньні, якія мы абмяркоўвалі. Памятаю, як гадзіньнік, які не працаваў, раптам забіў на сьцяне. Я дзякую лёсу, што сустрэў яго ў сваім жыцьці, і ён адыграў вялікую ролю ў тым, што я стаў мастаком-музэйнікам».

Мая Яніцкая, гісторык мастацтва: «Вы

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

прапануюць турмы?»

ужо не абмяжоўваліся ягоным клясычным «панімаеш». Усім ужо ўсё зразумела. І неабходна разрываць усялякія дамоўленасьці пра Саюз, і магчыма, нават парываць дыпляматычныя адносіны. У гісторыі існуюць такія прэцэдэнты. Напярэдадні другой сусьветнай вайны Англія і Францыя вельмі баяліся пасварыцца з Гітлерам, у 36-м на Алімпіяду да яго прыяжджалі, амэрыканскі пасол аж да 40-га году сядзеў у Бэрліне. Сьвет, як відаць, нічому не навучыўся.

Што да Саюзу, то мы ўжо зрабілі канкрэтныя захады дзеля ягонай ліквідацыі. Працэдура выхаду з грамадзянства нават савецкай канстытуцыяй была прадугледжаная, і былі дысыдэнты, якія ў знак пратэсту адмаўляліся ад грамадзянства. І Вярхоўны Савет СССР абавязаны быў разглядаць гэтыя справы, вядома, калі тых, хто адмовіўся ад грамадзянства, адразу ж не арыштоўвалі. Партыя дэмакратычных саюзаў накіравала на імя расейскага прэзыдэнта (паколькі саюзныя органы мы не прызнаем) пакунак з нашымі патрабаваньнямі: пазбавіць нас саюзнага грамадзянства зь ягонымі правамі і абавязкамі. Гэтыя правы і абавязкі — гісторыя з журналістам гэта ўжо пацьвердзіла —прапаноўваюць нам сядзець у беларускіх турмах. Натуральна, гэта вялікі гонар, але якія пры гэтым абавязкі? Маўчаць і хлусіць?!

З нагоды нашае заявы ў расейскай думе адбыўся вялікі скандал: віцэ-сьпікер Думы Бабурын запатрабаваў, каб Баравога неадкладна пазбавілі грамадзянства, а значыць, і «выгодаў» (да прыкладу, магчымасьці свабодна прыяжджаць у Беларусь. — А.Л.), якіх ён не шануе.

І Вы папраўдзе спадзяецеся, што Вашыя заявы будуць разгледжаныя і задаволеныя?

— Нашае патрабаваньне прапануе альтэрнатыву. У выпадку, калі нам ня выдадуць пасьведчаньні, што мы не зьяўляемся грамадзянамі Саюзу, мы пакідаем за сабой права зьвярнуцца ў Канстытуцыйны суд. А калі і Канстытуцыйны суд нічога ня зробіць, мы зьвернемся ў міжнародны суд у Страсбургу, бо прымусовае надзяленьне народу чужым грамадзянствам — для міжнароднага права гэта якраз цікавы прэцэдэнт. Так што мы разьлічваем, што рух за выхад з саюзнага грамадзянства стане масавым, і ўрэшце ў гэтым Саюзе акрамя Лукашэнкі (я спадзяюся, што Ельцын да таго часу таксама напіша заяву), ягонага марыянэтачнага парлямэнту і нашай Думы, нікога не застанецца. Калі БНФ возьмецца за збор заяваў ад беларускіх грамадзянаў, то 60-ці адсоткаў будзе дастаткова, каб Саюз юрыдычна перастаў існаваць. І гэта будзе найлепшы спосаб, каб давесьці, што абодва народы не жадаюць вяртаньня ў мінулае.

Гутарыла Алена Лукашэвіч.

казыры

ныя інструмэнты пад шклом не прывабліваюць вока.

Нашага было няшмат, але дастаткова, каб наглядна адчуць усю непрыдуманасьць нашых прамінулых літоўскіх вякоў. Сярод некалькіх фаліянтаў, большасьць зь якіх складалі кнігі, друкаваныя ў Маскве, я заўважыў том Л.Зізанія. Сярод расейскіх партрэтаў, адзін зь якіх («земляка» Паскевіча) мне быў даўно знаёмы з рэпрадукцыяў, вылучаўся сваёю небравурнасьцю й даўняй партрэт князёўны Радзівіл. Увагу прыцягнулі знойдзеныя ў 60-х скарбы спрэс са срэбных манэтаў ВКЛ. Я выдатна разумею таго, хто іх калісьці схаваў ды ніяк не магу ўявіць сябе ў стане таго цікавага чалавека, што добраахвотна аддаў у рукі дзяржавы чаканеныя на срэбры Пагоні часоў Жыгімонтаў. Нарэшце я пабачыў славутыя слуцкія паясы. Амаль незаўважныя вокам, дробныя ніці ўтваралі на залатым полі някідкі й тонкі ў сваім высакародстве малюнак. Перад майстэрствам іх выраблялькаў і густам іх уладальнікаў будзе схіляць галовы яшчэ не адзінае пакаленьне людзей без блакітных радаводаў, але здольных адчуць шляхецкі кшталт былых уладароў.

Але галоўнае — я знайшоў тое, дзеля чаго сюды прыйшоў. Магчыма, я пабачыў найкаштоўнейшы скарб, якія мне дагэтуль даводзілася бачыць. Невялікі бранзалет. Вельмі дарагі й сваім мэталем — золата, і ўзростам — XI стагодзьдзе, і месцам, дзе быў знойдзены — менскае замчышча, і, безумоўна, тым, дзеля каго ён выраблялься. Мне ня трэба было напружваць фантазію, каб уявіць сабе ўладальніцу гэтага золата далёкага стагодзьдзя. Ды хіба такога ўжо далёкага? Калі я сёньня магу «дакрануцца» да самых важкіх доказаў беларускай высокапанскасьці. Я ня веру, што на гэтым золаце засталася кроў на ягоным доўгім шляху да музэйнае паліцы. І якою недарэчнаю падалася мне прыдуманая мною гульня...

Зьміцер Бартосік

Застацца ў Вільні

8 лістапада я вярнуўся ў Менск зь Вільні. У гэты дзень у касьцёле сьв. Роха ладзіўся канцэрт «Ян Голянд у Вільні». Як можна было не патрапіць на гэты канцэрт?

Творчае аб'яднаньне «Беларуская капэля» з'арганізавала ўжо сёмы свой фэст. За гэтыя сем гадоў усё ж нешта зьмянілася ў нашых ведах пра старажытныя музычныя традыцыі Беларусі —пачуцьцё першага захапленьня ад знаёмства з зусім новымі для сябе музыкай і імёнамі перайшло ў стадыю больш паглыбленага засваеньня цэлых культурных пластоў.

Менавіта так манаграфічна цяпер працуе й «Беларуская капэля». Гэтым разам цэлы фэстываль быў прысьвечаны творчасьці аднаго кампазытара — Яна Давіда Голянда. Гэты немец, спакусіўшыся на прапановы Караля Радзівіла, у 1782 годзе перабраўся ў Вялікае Княства.

Фэстывальныя канцэрты, што старонкі кнігі: «Голянд у Гамбургу», «Голянд у Нясьвіжы», «Голянд у Вільні». Да фэстывалю выйшла невялікая манаграфія Вольгі Дадзіёмавай «Ян Давід Голянд». Калі такі фундамэнтальны ўзровень «Беларуская капэля» здолее вытрымаць і надалей, дык гэтае творчае аб'яднаньне стане ня проста заўважнаю культурную зьяваю, але здолее надалей уплываць на нашыя музычныя густы.

Ян Голянд заставаўся прыхільнікам эўрапейскага клясыцызму. Але асацыятыўная музычная сымболіка зьнітоўвала яго з традыцыямі барока, такога багатага ў Вялікім Княстве. Ян Голянд так і памёр у Вільні.

A.Dz.

любому беларусу...

стаялі ля вытокаў нашага адраджэньня. І я ўдзячная Ўладзімеру Караткевічу, што ён пазнаёміў мяне з Валянцінам Ждановічам, а той з вамі... вы выдатны беларускі мастак. Я параўноўваю Вас з Напалеонам Ордам».

Сулкоўскі Ўладзімер: «... Як цяжка арганізаваць другога мастака. Трэба прыкласьці шмат энэргіі, свайго ўласнага часу...»

Леў Мірачыцкі, гісторык: «Вы прадаўжальнік справы Драздовіча і Сергіевіча, Паўловіча і Орды».

Рыгор Барадулін, паэт: «... Мая мама цябе дужа любіла. Ты афарміў адну маю кніжку з партрэтам мамы».

Яўген Кулік: «... У маім жыцьці гэта вялікая падзея, і вашае слова выклікае ў мяне гордасьць і шчасьце. Я ўсім рады. Усе мы за адну справу. За культуру, за нашу мову. І галоўнае — за нашу незалежнасьць. Салодкае слова свабода, але яно горкае, калі не свабодная бацькаўшчына. Дык за вольную бацькаўшчыну, за вольную Беларусь. Жыве Беларусь вольная, незалежная і дэмакратычная. А перамога будзе за намі. Што датычыцца майго юбілею, дык юбілеі прыходзяць і адыходзяць, а заўтра мы ўпрагаемся ў працу, заўтра ў нас сойм і зноў наша барацьба. Няхай яна доўжыцца да таго часу, пакуль мы не пераможам. А мы пераможам. А мы пераможам».

Генадзь Сакалоў-Кубай

PROMENADE

Паштоўка са Львова

На першы погляд у Львове нішто не зьмянілася зь першай сустрэчы. Калісьці я ахрысьціла яго горадам спыненых імгненьняў. За гэты год стрэлкі шматлікіх вулічных гадзіньнікаў так і ня зрушыліся ні на мілімэтар. Толькі на адной вежы ў цэнтры места цыфэрблят не застыў у сваёй дэкаратыўнасьці — быццам нагадваючы, што ў будынку больш ня Ратуша, але «міськрада», па-нашаму гарсавет...

Але час тут, нягледзячы на супярэчнасьці, імчыць няўрымсьліва, і хоць Новы год зноў наступіць адначасова ў Львове і ў Менску, сэкунда ў сэкунду — мы, здаецца, засталіся ззаду ў часе на адлегласьці ў незьлічоную колькасьць хвілінаў.

Пакуль п'ецца ні сьвет ні зара кава ў адной з каляваказальных кавярняў, вельмі выразна акрэсьліваецца ўяўленьне тутэйшага люду пра Беларусь. Яна для іх, аказваецца, сёньня адзіная ў трох асобах. Лукашэнка, Шарамет, Пазьняк. Пра іх пады-ходзяць і вельмі ветліва распытваюць нейкія людзі. Божа, і адкуль тут столькі людзей у такі час сутак?

Украінскай правінцыяй Львоў можа здацца толькі таму, хто знаёмы зь ім па паштоўках. Насамрэч гэта сталіца Галіччыны ды і ўсёй Заходняй Украіны (жыхароў Усходняй тут завуць «хахламі», пазнаючы, як сказалі мне, па двух відах ужываных імі словаў: расейскіх і нецэнзурных). Затое наш Менск самім галічанам бачыцца сталіцай ня столькі Беларусі, колькі Заходняй Расеі. Народ шчыра цікавіцца, ці праўда, што ў нас расейскія грошы, маскоўскі час і ці ёсьць усенародным сьвятам дзень народзінаў «бацькі». Адказваючы, можна проста ў кавярні памерці ад гонару за Радзіму.

Не, сёе-тое тут ужо ня так! На вуліцы імя генэрала Дудаева ўрэшце зьявілася шыльдачка. Вуліцы Лермантава і Пушкіна перайменавалі адначасова пару гадоў таму. Расейская абшчына неяк сьцярпела зьяўленьне замест Пушкіна генэрала Чупрынкі, затое «наступленьне» на другога расейскага клясыка Дудаева выклікала цэлую вайну з рашэньнем гарадзкой Рады. І вось «Джахар перамог». Знаёмыя ўкраінскія грузіны (дакладней, украінцы грузінскага паходжаньня) распавядалі пра свае колішнія маральныя пакуты ў выбары паміж аўтарам «Мцыры» і сябрам Гамсахурдзіі: «Лермантаў лепш за многіх маскалёў разумеў ісьцінную каўкаскую душу... (ішла доўгая цытата з клясыка), але Дудаеў... (ішоў доўгі тост за Дудаева на грузінскай мове)».

Згодна зь нейкім галіцкім архетыпам, генэрал тут бліжэй народу, чым пісьменьнікі. Парк перад львоўскім універсытэтам даўно назвалі імем клясыка зусім не расейскай, а ўкраінскай літаратуры — Івана Франко. Але ніхто не называе яго інакш, чым «парк Касьцюшкі». Генэрала й нашага земляка.

Назаўтра мяне частуюць беларускімі дранікамі тутэйшыя беларусы (украінцы беларускага паходжаньня). На Галіччыне іх налічваецца недзе з тысячаў семдзесят. У Доме афіцэраў зноў стала зьбірацца беларускае зямляцтва, мяркуецца адрадзіць і беларускамоўную газэту «Беларусь — Галіччына». Пры гэтым вялікая частка тутэйшых землякоў мовы продкаў ня ведае. Адны нарадзіліся й выгадаваліся тут, іншых закінуў лёс праз загад вайсковага начальніка за савецкім часам. Кавярня «Сябры» паранейшаму ў пашане, дзякуючы нацыянальным стравам двух братніх народаў. Але за дранікамі пад сьпевы Данчыка і Бартосіка мне паскардзіліся на... украінскіх нацыяналістаў, асабліва з УНА-УНСО. На думку гаспадароў беларускай кавярні, тыя ўвесь час ваююць з шыльдай «Сябры» (як расейская абшчына, паводле маіх уяўленьняў, змагалася з «Дудаевым»). Назву кавярні ўвесь час крадуць. Нават адказныя асобы з былой Ратушы-гарсавету сказалі: калі ласка, любая назва, толькі не «Сябры». Але львоўскія беларусы ўпарта настойваюць. Ва ўсім вінаватыя, па іх словах, не «бандэраўцы» і чыноўнікі (апошнія невядома ці дазволяць пакінуць новую шыльду «Сяброў» з нацыянальнымі сьцягамі двух народаў). Справа — у «нашым» Лукашэнку. Незалежна ад поглядаў, львоўцы-беларусы «бацьку» нам ніколі не выбіралі, але «кожнае беларускае слова нагадвае ўсім пра Лукашэнку». Гэтая трагікамэдыя падобная да яе айчыннага варыянту пэрыяду пасьля «Чарнобыльскага шляху» 96-га. Беларускім уладам кожнае ўкраінскае слова тады гэтак жа нагадвала пра УНСО. Пад гэтую лавачку нават былі зьнялі з гомельскага цягніка дэлегацыю камуністаў з Украіны, што ехалі да сваіх паплечнікаў пахваліць нашага «інтэгратара» і дапамагчы сабраць Саюз.

Побач зь «Сябрамі» адраджаецца некалі адно зь першых ва Ўсходняй Эўропе казыно, дзе некалькі гадоў таму яшчэ быў Дом вучоных. Зараз памяшканьнем таксама валодаюць беларусы з паходжаньня. Яны зусім замучыліся з аздабленьнем банкетных заляў на старажытнабеларускі манер. Бо ніхто з тутэйшых мастакоў-дызайнэраў і блізка не ўяўляе, што такое інтэр'ер шляхецкага замку часоў Княства — замест гэтага ўсе кідаюцца распрацоўваць у праектах тэму «сялянская хата ў ручніках, васільках і гліняных сподках з кветкамі». Беларусы ня могуць даць рады, як давесьці сваім землякам-суседзям, што беларускае — ня толькі лукашэнкаўскае ці фальклёрнае, ці простанароднае. Словам, актыўнасьць нашае дыяспары ў імкненьні захаваць удалечыні ад Бацькаўшчыны беларускую культуру ўзрастае яўна прапарцыянальна той ступені варожасьці, зь якой нішчыцца ўсё беларускае ў самой Беларусі.

... На чырвоны сьвяточны мітынг блізу «Сяброў» я прыпазьнілася. Тысячаў з восем людзей са сьцягамі Ўкраіны ў жалобных стужках ужо адправілі камуністаў сьвяткаваць юбілей іхнага піцерскага перавароту куды падалей — на Стрыйскую, у бок Халма Славы. Над цэнтрам места разносяцца гукі паніхідаў па ахвярах бальшавіцкага тэрору, усюды плякаты кшталту: «КПSS — пад суд!» У адрозьненьне ад Менску, пераважае тут зусім ня моладзь, а старыя антыкамуністы. Міліцыя стаіць ня тое што мірна, а глыбакадумна. Вылучаецца чорная форма элітнай львоўскай муніцыпальнай міліцыі. Пасьля расповедаў пра генацыд старэнькі дзядок заклікае: «Старыя няхай застаюцца тут, а вы, моладзь, хто мае сілы, ідзіце калёнай да гэтых «чырвоных» і пакажыце, што Ўкраіна ще нэ вмэрла!» Калёна моладзі ідзе ад помніка Івану Франко, па шляху яшчэ адзін мітынг адбываецца ля помніка Тарасу Шаўчэнку... Празь нейкі час я хапаю за руку знаёмага хлопца з УНСО: «На чорта вам іх біць! Яны ў вас і так тут недабітыя!» Ён доўга ўсьміхаецца і вымаўляе з расчараваньнем: «Эх ты, памяркоўная беларуска!.. Як гэта — ня біць камуністаў?»

Потым ягоныя таварышы пачынаюць тлумачыць, чаму УНСО сёньня не чапае «чырвоных»: «Там няма з кім біцца! Зь дзядамі старымі? З гэтымі камсамолкамі?» Унсоўцы абураліся, што нехта з «насосаў» («Нацыянальна-сацыялістычная партыя Ўкраіны») ударыў па твары і разьбіў галаву жанчыне гадоў 30-ці. Потым, калі пасьля бойкі ў Стрыйскім парку ўжо сьціхлі апошнія бандэраўскія гімны на мітынгу радыкальнай украінскай моладзі, паміж нацыяналістамі розных «масьцей» усчаўся гвалт. Я баялася, што яны могуць пабіцца за ідэю яшчэ раз, але ўжо паміж сабою: высьвятляючы, хто зь іх больш правільны нацыяналіст.

«Паваявалі з бабамі, героі!» — кінулі з-пад сьцягу УНА-УНСО, сябры якой, здаецца, першы раз вырашылі не трапляць у турму ў камуністычныя сьвяты.

«Нацыянал-сацыялісты», у шэрых кашулях «а-ля савецкая міліцыя» з чорнымі гальштукамі, з валасамі на прабор, як адзін, з годнасьцю скручвалі сьцягі. Іхных людзей затрымалі ажно дзясятак. І калі я й сама наехала на унсоўцаў з пытаньнем: «Дык хто тут крыўдзіў нашых беларусаў, га?» — шмат хто хітнуў у бок менавіта хлопцаў з праборамі, якія хуценька зьнікалі з гэтага месца.

Пасьля гасьцяваньня ў нас у Беларусі і нядаўняй рэгістрацыі ў Мінюсце Ўкраіны, напярэдадні парлямэнцкіх выбараў «страшылка для электарату» УНА стала падазрона памяркоўнай. У дзень юбілею перавароту унсоўцы напісалі ліст львоўскаму «султану» (па-нашаму «вэртыкальшчыку») з нагоды ягонага 45-годзьдзя: «Паважаны такі і такі пан! Віншуем... Зычым... а таксама добрай волі да супрацоўніцтва з УНА, асабліва калі мы прыйдзем да ўлады». Што ж тычыць далейшага лёсу сямёх былых вязьняў беларускіх засьценкаў, то ўсе яны ня так даўно атрымалі ордэны ад кіраўніцтва, а сёй-той і падвышэньне ў пасадзе. Адзін пасьля турмы «захапіўся» наркотыкамі і быў выключаны. А унсовец Андрэй Міранюк праз паўгады пасьля Валадаркі запрасіў на сваё вясельле Лукашэнку ў якасьці «пасаджанага бацькі жаніха». Той, на жаль, не зьявіўся...

Таццяна Сьнітко

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Катлетка для сьледчага КГБ

Працяг са старонкі 1.

Што да Сакольчыкаў-старэйшых, то дзесьці ў шэсьцьдзесят шостым яны атрымалі новую кватэру. Пэўны час Юлія Сакольчык працавала на менскім заводзе «Гарызонт». Праўда, ня ў зборачным цэху, не ў гальванічным, а на больш адказнай пасадзе: у заводскай службе быту, інспэктарам па жыльлёва-кватэрных пытаньнях.

ГАДЫ СТАЛЕНЬНЯ

Мы пакінем па-за гэтым тэкстам пэрыяд жыцьця, калі Саша Сакольчык быў студэнтам, упарта грыз граніт юрыспрудэнцыі, магчыма, што як узорны камсамолец нават езьдзіў у будатрады альбо ў правінцыю выбіраць бульбу ці падымаць лён. Нас цікавіць, што ж сталася з Сашам пасьля таго, як ён спраўдзіў маміну мару і стаў «юрыстам». Элемэнтарныя падлікі сьведчаць, што вышэйшую юрыдычную адукацыю Аляксандар Паўлавіч набыў у выглядзе дыплёму годзе ў восемдзесят трэцім альбо ў восемдзесят чацьвертым. Часы андропаўшчыны, часы надзеяў, мары пра кар'еру... І раптам — Гарбачоў М.С., раптам нейкая «перестройка». Адна шостая частка сьвету ўступіла ў фазу надзвычайнай сацыяльна-палітычнай актыўнасьці. СССР заштарміла. Пайшлі працэсы і ў Беларусі, асабліва ў Менску. Са зьяўленьнем, як тады казалі, нефармальных арганізацыяў —«Майстроўні», «Талакі», «Тутэйшых» — паболела работы і ў тутэйшых чэкістаў, прычым работа гэтая стала больш небясьпечнай. А тут і 1988-ы год, адкрылі Курапаты. На нейкі час беларускім спэцслужбам стала і зусім няўтульна, лепшыя з апэратыўна-сьледчых работнікаў пачалі звальняцца. Тым часам як людзі ўсё больш і больш перастаралі баяцца гэтай кароценькай абрэвіятуры — КГБ. Як бачым, на пакаленьне сьледчага Сакольчыка прыпала эпоха вялікага пераломy, якая, дарэчы, абломвае кар'еры спадчыньныя і ўзносіць часта на вяршыні славы й няслаўя тых, «хто быў нічым».

Не пасьпеў наш Аляксандар Паўлавіч зрабіць кар'еру да жніўня 1991-га году.

На вялікі жаль, і нашыя гэтак званыя дэмакраты з-за слабасьці хрыбта й дрыжыкаў у каленях ня здолелі ўзяць уладу ў Беларусі так, як яна, улада, таго патрабуе. З 1994 году маладая, яшчэ незалежная Рэспубліка перажыла мінімум два кансэрватыўна-клянавыя пераваротy. Да ўлады прыйшоў вядома хто, параіўшы С.С.Шушкевічу аддаць дзяржаве кілю цьвікоў.

САКОЛЬЧЫК ЯК ПСЫХОЛЯГ

Прыход Лукашэнкі вярнуў пакаленьню Сакольчыка Аляксандра Паўлавіча надзею на стабільнасьць і кар'еру. Стабільнасьць і кар'ера — вось што мела на ўвазе прафэсія савецкага «юрыста». Чым больш «стабільная» дзяржава, ты менш рызыкі для «юрыста». А які рэжым можа найлепш забясьпечыць стабільнасьць? Пакаленьне Паўлавіча ў бальшыні сваёй лічыць, што такім рэжымам зьяўляецца той, які ўсталёўвае іх любімы прэзыдэнт. Вясною 1996 году быў пакладзены пачатак фізычнаму зьняволеньню палітычных апанэнтаў Лукашэнкі. Відаць, не перабольшу, калі скажу, што спэцслужбы падключыліся да гэтай справы з дастатковым энтузіязмам. Адзінае, што й па сёньня перашкаджае ім разагнаць махавік рэпрэсіўнай машыны, гэта... аб'ектыўныя інфармацыйна-тэхналягічныя працэсы ў сусьветным маштабе (зьяўленьне «Інтэрнэту», факсу, электроннай пошты, кампутарных друкарак, сотавай сувязі), дзейнасьць у Беларусі філіяў міжнародных праваабарончых арганізацыяў (Беларускі Хельсынскі Камітэт, незалежныя прафсаюзныя групы, беларускі Пэн-цэнтар), а таксама інтэрвэнцыя ў беларускую прастору перш за ўсё расейскіх сродкаў масавай інфармацыі, якія даносяць да народу Беларусі больш-менш праўдзівыя вэрбальна-графічныя тэксты. У такіх архінеспрыяльных умовах надзвычайную актуальнасьць для КГБ набывае распрацоўка, што называецца, «на маршы», мэтодыкаў і мэтадалёгіі псыхалягічнай апрацоўкі людзей, псыхагеннай і псыхатропнай зброі, якая выкарыстоўваецца на ўласных апазыцыйна настроеных грамадзянах у першую чаргу. Забягаючы наперад, скажу, што задача любога тэрарыстычнага рэжыму палягае ня толькі ў тым, каб эфэктыўна абсарбіраваць апазыцыйны рух, але й дэмаралізаваць яго, узарваць зь сярэдзіны з дапамогаю інстытуту плётак і высокатэхналягічных правакацыяў. Якраз сёньня тутэйшы КГБ і пачаў інтэнсіўна працаваць на падрыў і без таго невысокага аўтарытэту лідэраў нацыянальна-вызваленчага руху.

Але вернемся да нашага антыгероя. Нам цікава разабрацца, у якой жа ступені валодае мэтодыкай псыхалягічнай апрацоўкі сярэднестатыстычны работнік КГБ Беларусі на ўзроўні, напрыклад, капітана. Як эфэктыўна выкарыстаў псыхалягічную зброю

ў адносінах да падсьледнага і сьведкаў сьледчы па асабліва важных справах Сьледчага адзьдзелу КГБ РБ капітан юстыцыі А.П.Сакольчык, займаючыся добра вядомай справай № 182?

Адказваючы на гэтае пытаньне, ваш пакорны слуга павінен узгадаць дзень 2 красавіка 1996 году, калі, як памятаеце, Ельцын і Лукашэнка паспрабавалі стварыць свайго роду саюз, чарговую маскоўска-менскую вунію дзьвюх дзяржаваў. Супраць гэтай вуніі ў гэты ж дзень выступілі тысячы беларусаў, заявіўшы свой пратэст выхадам на вуліцы гораду. У гэты ж дзень каля дзьвярэй рэдакцыі «Нашай Нівы» я быў затрыманы двума апэратыўнымі работнікамі КГБ і дастаўлены ў адпаведную ўстанову, у кабінэт сьледчага Сакольчыка. Калі стаць тварам да «парадных» дзьвярэй жоўтага дому з калёнамі, і нібы міжволі кінуць вокам на левае крыло будыніны, то ўбачанае вамі кутняе вакно на чацьвертым паверсе — гэта й ёсьць вакно згаданага кабінэту. З гэтага вакна 2 красавіка мінулага году я назіраў шматлікае шэсьце блізкіх мне, тады асабліва блізкіх, людзей. Увогуле 2 красавіка 96-га я меў са сьледчым Сакольчыкам самую доўгую размову з тых, якія мелі месца на працягу папярэдняга сьледзтва. Як чалавек, які займаецца ня толькі палітычнай журналістыкай, але й літаратурнай работай, я магу ўзгадаваць у сабе ў некаторай ступені цыніка, але пры гэтым мне нельга парушыць у сабе платоніка, істоту да некаторай ступені наіўную. Менавіта наіўнасьць у першыя дні допытаў падказвала мне тактыку паводзінаў, пакуль дзесьці ў сярэдзіне траўня я не адправіў свой наіў у спраты падкоркі, закрыўшы рот на замок і пачаўшы рыхтавацца да галадоўкі. Аднак жа не пра мяне гаворка.

Сьледчы Сакольчык, відавочна, быў рады, што я даволі актыўна ўступіў у кантакт. 2 красавіка 96-га зь 10 гадзінаў раніцы да 10 гадзінаў вечара адбываўся ня столькі допыт, колькі своеасаблівы дыспут на палітыка-прававую тэму. Зрэшты, гэта не перашкаджала сьледчаму Сакольчыку занатоўваць мае рэмінісцэнцыі ў свой кампутарны нататнік. Што ж, я ня толькі гаварыў, адказваў на пытаньні, але й задаваў іх сам. Саша Сакольчык так і не адказаў па сутнасьці, чаму ж разам са мною, распаўсюднікам «заклікаў да тэрактаў», якія потым дзіўным чынам ператварыліся ў «зьнявагу ўлады», чаму ж разам са мною не затрыманыя распаўсюднікі фашыстоўскіх лістовак «Русского Национального Единства», якімі заклеены сталічны мікрараён «Уручча». Дакладней, капітан юстыцыі Сакольчык, ухмыляючыся і штораз пыхкаючы амэрыканскай цыгарэтай «L&M», адказаў штосьці кшталту: «У нас нет фактов». Фактаў у іх «няма» і па сёньня...

Калі праз адчыненую фортку ў наш «дыспут» уварваліся воклічы дэманстрантаў, сьледчы дазволіў мне падысьці да вакна. Галава калёны якраз параўналася зь левым крылом будынка, я пасьпеў заўважыць высокую постаць знаёмага мастака з доўгімі сівымі валасамі. І тут сьледчы Сакольчык задаў адно з самых сваіх няправільных пытаньняў, прынамсі МНЕ такое пытаньне задаваць было нельга. «Почему в БНФ так много психически ненормальных?» — вось пра што хацелася дазнацца Сакольчыку як псыхолягу. Не магу сьцьвярджаць катэгарычна, але я, здаецца, адказаў, што любы масавы рух — правы ён, левы, ці проста стыхійны — прыцягвае да сябе і моцных, і слабых, апошнія ж шукаюць падтрымкі і чалавечага цяпла, шукаюць, як дзеці матку сваю. Так было сказана сьледчаму А.П.Сакольчыку, які, зрэшты, усё гэта ведаў. Магчыма, ня ведаў ён толькі таго, што ёсьць непісанае правіла масавага руху: ніколі не пагарджай слабым, наадварот, прымі і дай яму цяпло салідарнасьці, кроплю надзеі, дай яму магчымасьць стаць дужэйшым. Вось пра гэта, верагодна, ня ведаў «юрыст» Саша Сакольчык, ускормлены на капусных катлетках мамы Юлі.

Прыняўшы да выкананьня крымінальную справу №182, сьледчы Сакольчык мог праявіць мінімальную актыўнасьць. Але ён зрабіў наадварот. Больш таго, ён і не хаваў сваіх цынічных адносінаў да правасудзьдзя, заяўляючы падсьледнаму, што, маўляў, судзьдзі таксама людзі і не рызыкнуць закрыць справу, таму чакаюць мяне гады тры адсідкі.

Пытаньне пра «псыхічна ненармальных» было адно зь першых такога кшталту. Пасьля я пачуў тое, што чуў ад гэбістаў яшчэ ў 86-88 гадах: гэбісцкія характарыстыкі на лідэраў Фронту, якія, па ідэі сьледчага павінны былі пасеяць ува мне зерне сумневу.

НЕ ТАКІ СТРАШНЫ ЧОРТ КГБ, ЯК МЫ ЯГО МАЛЮЕМ

Днямі дзесьці я прачытаў пра адну цікавую рысу беларуса: яму яшчэ й слова не сказалі, а ён ужо пакрыўдзіўся. Гэтак і са страхам: яшчэ не спужалі, а беларус ужо трымціць. Горка й съмешна. Між тым, гэбісцкі чорцік і сам баіцца, бо што-што, а гнеў народнай масы ён сабе ўяўляе добра. Менавіта таму найбольшыя сілы каманды КГБ, якая гуляе на айчыньным гульнёвым полі, накіраваныя на барацьбу з рабочым рухам у тым ліку. Баіцца наш чорцік яшчэ й таму, што ня мае гарантыяў ад самога сатаны. І ўжо ні ў якія вароты ня лезе той факт, што работнік цэнтральнае ўправы КГБ РБ мусіць хадзіць на сваю работу з «сабойкай» у кішэні.

Нагадаю, што 2.04.96 г. у будынку КГБ я знаходзіўся 12 гадзінаў. Надыйшоў час абеду, пра што я й сказаў капітану юстыцыі Сакольчыку. І хоць у мяне ў кішэні меліся грошы на абед, я вырашыў перакусіць «за счёт заведения». Ня ведаю, ці ўлічыла бугальтэрыя пры выплаце зарплаты незапляванаыя расходы свайго работніка, але энную суму Аляксандра Паўлавіча я праеў. У сталоўцы КГБ, якая знаходзіцца ў цокальным паверсе, за столікам сядзелі толькі я, Сакольчык і кіраўнік сьледчае групы. Першае, другое і трэцяе было настолькі поснанясмачным, што гэтую бурду з такім жа посьпехам можна было даць зэкам. Нездарма «сьледакі» першага не ўзялі, а катлеты калупалі з такім посным выглядам, што іх сапраўды можна было пашкадаваць. Асабліва выразна глядзеліся на фоне пустой сталоўкі неабдымных памераў аўтаркі тых катлетак для сьледчых КГБ, якім апошнія ніяк не маглі даць рады.

Так-так, — падумаў я сабе, узгадаўшы кімсьці прамоўленую мудрасьць: чалавек ёсьць тое, што ён есьць.

Досыць яскрава нашых чэкістаў характарызуюць ня толькі ўмовы сталаваньня, але й зьнешні выгляд супрацоўнікаў. Ніводнага з мне вядомых не магу ўявіць у прыстойнай пінжачнай пары, тым больш пры гальштуку паводле моды сэзону. Што ж да апэратыўных работнікаў, якія пастаянна забягалі ў кабінэт, часта з мэтай справакаваць мяне на неадэкватныя паводзіны ці небясьпечныя для мяне ўласныя рэплікі, то іх пакамечаныя твары, часта гэткія ж самыя штаны, і асабліва пальцы з жывой зямлёй пад пазногцямі стваралі асабліва гнятлівую карціну. Рабілася да таго гідліва, што ад адных гэтых брудных фалангаў хацелася хутчэй у камэру. Так што ня трэба баяцца тутэйшых чэкістаў. Лепш параім «рыцэжам» часьцей мыць рукі, як гэта робяць усе прыстойныя людзі.

СПАБОРНІЦТВА ЦІ СУПРАЦЬСТАЯНЬНЕ?

Не адкрыю нейкае навіны, калі скажу, што шматлікія беларускія, а калі правільней, то, відаць, лукашэнкаўскія, спэцслужбы, а таксама міліцыя, армейская контрразьведка, службы эканамічнай бясьпекі манаполіяў, камітэт дзяржкантролю, мытня, амон і спэцназ вядуць між сабою ў лепшым выпадку спаборніцтва за права быць першымі ў барацьбе за народнае шчасьце, так эмацыйна абяцанае прэзыдэнтам беларускаму народу. У горшым выпадку можна назіраць самае жорсткае супрацьстаяньне названых структураў.

Што гэта так, я ўпэўніўся, выслухаўшы аднаго з апэратыўных работнікаў, які 22 сакавіка 1996 году праводзіў вобшук у маім пакоі. Я заўважыў яго на тралейбусным прыпынку каля цырку, ён таксама пазнаў мяне, і мы пайшлі ў бок Круглай плошчы. За тыя некалькі хвілінаў, калі мы йшлі разам, опэр пасьпяшаўся паведаміць мне, што кінуў ранейшую працу і перайшоў у іншае падразьдзяленьне, дзе працуе толькі з паперамі (магчыма, што й так). А потым стаў каціць бочкі на міліцыю: маўляў, тамта сапраўды зброд недалёкіх суб'ектаў, якія нічога іншага рабіць ня могуць... Шкада, што букет старых крыўдаў, нянавісьці і агіды прымусіў мяне хутчэй разьвітацца з маім знаёмцам. Магчыма, былы матросік расказаў бы мне штосьці больш цікавае.

Па-праўдзе, мы маем і іншыя крыніцы інфармацыі. Яны таксама паведамляюць досыць цікавыя факты і вэрсіі тых ці іншых здарэньняў. Думаю, чытачы «Свабоды» яшчэ памятаюць, што летам мінулага году ў Менску на вуліцы Ўсходняй ва ўласнай «дзявятцы» быў узарваны адзін са сталічных «аўтарытэтаў» крымінальнага сьвету нехта Шалаеў па мянушцы «Шалай». З адным зь сяброў «Шалая» я сядзеў у «амэрыканцы». Яму потым адмерылі пяць гадоў агульнага рэжыму. Як сьцьвярджаюць інфарматары з крымінальнага асяродку, «Шалая» хутчэй за ўсё ліквідавалі спэцслужбы. Матывы маглі быць наступныя: няўплата «долі», ліквідацыя на карысьць іншай групоўкі, якая кантралюе ценявы бізнэс; акцыя з мэтаю прыструніць астатніх. І сапраўды, вельмі ўжо чыста быў праведзены падрыў. Апошні, хто прайшоў каля аўтамабіля за хвіліну да выбуху, быў студэнт Радыётэхнічнага інстытуту, які адрабіўся толькі спужаньнем. Цікава і тое, што на месцы выбуху аказаўся наш інфарматар, які абсалютна свабодна хадзіў вакол таго, што засталося ад мэханізму і чалавека па мянушцы «Шалай». Больш за тое, выпадковага мінака міліцыянты прынялі за свайго работніка і шчыра дзяліліся зь ім сваімі ўражаньнямі, ня робячы, аднак, неабходных у такіх выпадках апэратыўна-крыміналістычных дзеяньняў.

Можна ўзгадаць і падрыў аўтамабіля на вуліцы Куйбышава ў Менску. Акцыя была праведзеная таксама чыста, бязь лішніх ахвяраў. Ліквідаваны быў кіраўнік фірмы, якая займалася бэнзынавым бізнэсам. Прадавалі абмежаванаму колу асобаў, пераважна знаёмым. Бізнэс гэты адбываўся ў дворыку 24-га вучылішча будаўнікоў. З падрывам бізнэсмэна зьнікла і аўтацыстэрна. Праўда, на кар'еры дырэктара вучылішча Пузырэўскага гэта ніяк не адбілася. Неаднаразовыя праверкі дзейнасьці ягонае адміністрацыі не пахіснулі дырэктарскае крэсла. Між іншым, вядома, што ў свой час Аляксандар Міхайлавіч тэрміновую службу адбываў у органах КГБ.

ДЗЕ ЖЫВУЦЬ «АСАБЛІВА ГАЛОДНЫЯ»?

Ясная рэч: жывуць яны сярод нас. Жывуць ціха, за кодавымі замкамі ў дзьвярох пад'ездаў, у цэнтры Менску, а таксама ў раёне Партызанскага праспэкту, у мікрараёне Зялёны Луг, у раёне вуліцы Нямігі і праспэкта Машэрава. У гэтых жа раёнах знаходзяцца і явачныя кватэры для апэратыўнікаў і інфарматараў зь ліку цывільных. Вэтэраны КГБ жывуць у раёне плошчы Перамогі (дом з хлебнай крамай на рагу). Дарэчы, у доме насупраць, праз плошчу, на рагу якога знаходзіцца прадуктовая крама, дажывае свае гадкі знаны публіцыст Алесь Бажко, які час ад часу прамаўляе ў радыёэфіры ў падтрымку рэжыму.

Байцы «нябачнага фронту» жывуць і ў раскошным з раскошнымі вэстыбюлямі доме на вуліцы імя героя Грамадзянскай вайны А.Пархоменкі. Дом той стаіць побач са спартовай пляцоўкай. У новазбудаваных гмахах, што побач са шпіталем КГБ (вуліца Макаёнка) уладкаваліся зь сем'ямі вышэйшыя чыны КГБ, МУС, мытні...

Бедныя галодныя людзі: бяз Бога, Бацькаўшчыны, Веры...

ПОСТСКРЫПТУМ

«Прыйдзе час, калі я буду расказваць, што карміў Адамовіча,» —сказаў сьледчы Сакольчык, ставячы на паднос гэбэшную баланду, катлетку ды штось падобнае на яблычны кампот. Ведаў, значыць, таварыш Сакольчык, за якую справу ўзяўся. Разумеў, што робіць. Значыць, і сапраўды прыйдзецца расказваць калі-небудзь. Абавязкова. Іншаму сьледчаму.

Славамір Адамовіч

Фактура зьвераная з крыніцай інфармацыі

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ІНФАРМАТАР

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Запрашаем ліцьвінаў манархічнага кірунку! 246012, Гомель, а/с 124

Куплю паперу, фармат А-4. Тэл.: 253-92-26

Канцылярская праца ў хатніх умовах, 70 даляраў на месяц. 2 капэрты, 1 са зв/а + купон б/а. 220082, Менск, а/с 53

Ксэракапіяваньне, фармат А-4, 600 руб. Тэл.: 253-92-26

Лепш адзін раз запаліць маленькую сьвечку, чым усё жыцьцё праклінаць цемру. Канфуцый

Запрашаем у беларускамоўнае асяродзьдзе, дзе вы спраўдзіце патрэбу ў духоўных дачыненьнях. Даведкі штосерады з 17.00 да 18.00 праз тэл.: 265-74-12

Куплю вяшак-стойку, можна былы ў выкарастаньні, але ў добрым стане. Тэл.: 213-43-52, з 9.00 да 11.00. Лена

Блізіцца Рок-каранацыя 1997 г. 22 лістапада ў клюбе «Луч» (Нямiга, 30) адбудзецца адборачны тур «Рок-каранацыі-97». У канцэрце возьмуць удзел «NRM» (Менск) і Voo Doo (Гомель). Пачатак а 20-й гадзіне

23 лістапада ў Лідзе ў памяшканьні музычнага цэнтру «Панарама» адбудзецца канцэрт гуртоў «Новае Неба» і «Гай». 24 лістапада гэтыя ж гурты выступяць у Горадні

Тэрмінова куплю іншамарку для сябе, ў добрым стане, на хадзе, да 1500 $. Тэл.: 230-29-48, 211-00-00 абанэнт 70-183

Сям'я здыме аднапакаёвую кватэру з тэлефонам. Тэл.: 221-24-81

КУПОН

К У П О Н

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

НАША НІВА

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

НАРОДНАЯ КНІГА

Васіль Быкаў. Сьцяна



Пасьля неаднаразовых прапановаў нашых чытачоў і з ласкавае згоды народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава выдавецтва «Наша Ніва» ажыцьцяўляе выданьне новае кнігі прозы В.Быкава «Сьцяна». Як вядома, гэтае выданьне рыхтавалася ў дзяржаўным выдавецтве, але сёньняшні палітычны рэжым спыніў выхад кнігі. Мы далёкія ад думкі, што беларускае слова можа ў прынцыпе існаваць толькі за дзяржаўныя датацыі, і мяркуем, што паміж творамі народнага пісьменьніка, як, зрэшты, і іншых таленавітых літаратараў, з аднаго боку, і чытачом — з другога, ня мусяць паўставаць непераадольныя бар'еры чынавенскае прыхамаці. Кнігі лепшых беларускіх літаратараў будуць выходзіць у такім аб'ёме і датуль, колькі і дакуль у гэтых кніг будзе чытачоў. Гэтак нарадзілася ідэя стварыць прэцэдэнт Народнае Кнігі. Мы ня ставім на мэце знайсьці спонсараў або зрабіць прыгожы жэст дабрачыннасьці. Мы імкнемся, насуперак цынічнаму да нашае мовы й культуры рэжыму, сьцьвердзіць, што беларускія кнігі мусяць выходзіць за грошы і дзеля патрэбаў беларускага грамадзтва. Разам з тым, мы спадзяемся на кансалідацыйны эфэкт Народнае Кнігі, якая мусіць умацаваць нашае грамадзтва і дасаць яму сілы духу.

Кніга «Сьцяна» складаецца з празаічных твораў Васіля Быкава апошніх гадоў.

Беларуская гісторыя XX стагодзьдзя стварыла нямала сытуацыяў, калі характары розных людзей па-рознаму выяўляліся на мяжы жыцьця і сьмерці. Слуцкае антыбальшавіцкае паўстаньне, Курапаты, другая сусьветная вайна, «хрушчоўская» адліга, перасьлед з боку КГБ у застойныя часы. Адпаведна рознымі былі і паводзіны міжвольных удзельнікаў гэтай гісторыі, ад якіх, па вялікім рахунку, не залежала нічога. Яны, фатальна абложаныя таталітарнай сыстэмай, маглі толькі захаваць або не захаваць сваю чалавечую годнасьць. Але ніякім чынам яны не маглі паўплываць на свой прадвызначаны статус — ахвяраў чырвонага або брунатнага малоха, які працяў кожнага зь іх наскрозь — іхны розум і іхную кроў.

Васіль Быкаў у новай кнізе прозы паказвае, наколькі немагчыма, але наколькі важна на самых фатальных этапах гісторыі захоўваць чалавечнасьць, прыстойнасьць, годнасьць. Псыхалягічныя сытуацыі ў крытычных абставінах становяцца напружанымі сюжэтамі, а дакладныя характарыстыкі самых розных чалавечых тыпаў змушаюць чытача ўвесь час адчуваць уласную прысутнасьць сярод быкаўскіх пэрсанажаў і рабіць свой маральны выбар.

Кніга Васіля Быкава «Сьцяна» выйдзе ў сьвет сёлета. Выдавецтва «Наша Ніва» зьбірае папярэднія замовы на кнігу.

Нагадаем, што той, хто замаўляе кнігі «НН» да іх выхаду ў сьвет, аплочвае толькі сабекошт і кошт перасылкі, тады як гатовая кніга з гандлёвымі нацэнкамі будзе каштаваць значна даражэй.

Пра тое, як замовіць кнігу Васіля Быкава, чытайце на наступнай старонцы газэты.

У Менску зноў пачаў працу

ШАПІК ТБМ

Тут можна набыць сьвежыя і старыя нумары пэрыёдыкаў, у тым ліку «Нашае Нівы», кнігі. Шапік ТБМ працуе на вуліцы Леніна каля Дзяржаўнага Мастацкага Музэю паміж вуліцамі Маркса і Кірава.

Беларускі патрыятычны сьпеўнік

«Наша Ніва» супольна з камэрным мужчынскім хорам «Унія» працягвае новы праект — стварэньне сучаснага Беларускага патрыятычнага сьпеўніка. Апрацаваныя намі тэксты і ноты песень будуць друкавацца на старонках газэты, а вынікам праекту стане кніга «Беларускі патрыятычны сьпеўнік» і аднайменная аўдыёкасэта або CD у выкананьні хору «Унія». Выкананьне гэтага праекту мы прымяркоўваем да 80-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі (25 сакавіка 1998 г.).

ЗА СЛУЧЧЫНУ

Муз. М.Куліковіча Сл. Н.Арсеньневай

Абтрасалі зь бярозаў лісьцё вятругі,
І гублялі рабіны чырвоныя сьлёзы,
Як пайшлі мы ў змаганьне, на раны, на згін
Абы яваю сталіся грозы.

Рэфрэн:

Пайшлі мы, воі з Божае ласкі,
У бой за Случчыну сваю!
Нам дзіў, што сёньня баюць казкі
Пра нас і песьні нам пяюць.

Аддавалі жыцьцё за сябе мы, за вас,
Беларусы-браты, і за сінія нівы,
І за тое, каб нас не смактала дрыгва,
А расьлі мы, аж сьвету на дзіва.

Рэфрэн.

Не штыхі і ня кулі, — жаролы гармат,
За адзіную зброю мы мелі каханьне,
Грэла сэрца яно, хоць залеў лістапад
І расьлі ў рад магілы за намі.

Рэфрэн.

Не судзіла нам доля разгорыць зару,
Не судзіла даць шчасьце ды волю Айчыне,
Дай-жа Бог, каб унукі ўзьнялі Беларусь
На ўзвышшы ахвярай і чынам.

Рэфрэн.

Мерным крокам. Стрымана



Пытайцеся ў шапіках «Белсаюздруку» і ў прыватных распаўсюднікаў, а яшчэ лепш — выпісвайце

Дык падпісвайся!

НАША НІВА

Падпісны кошт у 1998 годзе:
на месяц — 18.000 руб.
на квартал — 54.000 руб.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЭТА Індэкс 63125

Шаноўныя чытачы. З кожным месяцам няўхільна пашыраецца кола падпісчыкаў «НН». Прычым так адбывалася і сёлета ў летнія месяцы, калі газэты звычайна пераживаюць зьмяншэньне колькасьці падпісчыкаў у «мёртвы сэзон», так адбываецца і цяпер. Але сёньня мы хочам зьвярнуць увагу тых, хто яшчэ ня выпісаў «НН», што гэта — вельмі практычная мера. У складанай сытуацыі, калі русіфікатарскі аўтарытарны рэжым гвалтам выгнятае зь Беларусі ўсё беларускае, можа стацца так, што мы здолеем дастаўляць Вам газэту ТОЛЬКІ ПРАЗ ПАДПІСКУ. Таму мы заклікаем усіх нашых прыхільнікаў стаць нашымі падпісчыкамі, а ўсім нашым падпісчыкам разам з падзякаю адрасуем наступную просьбу: дашліце, калі ласка, на адрас рэдкцыі Вашыя падпісныя квіткі і адрасы. Тады пры любых абставінах Вашая сувязь з «НН» не перапыніцца.

Рэдакцыя

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ПАДПІСКА

Васіль Быкаў

Сьцяна

Каб замовіць новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

КНІП – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	60.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западнорусизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	16.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Ё.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супрацію русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнічак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	10.000
45	И.Хозеров. Белорусское и смоленское зодчество 10-13 вв.	30.000	12.000
46	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	15.000
47	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
48	Новы Запавет.	65.000	16.000

ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА

1	Кася ў школцы.	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

Выйшла з друку чарговая кніга Мэтрыкі – том 11 (Кніга запісаў). Папярэдне выходзілі тамы 5, 6, 7, 8, 10. Просьба ахвотным дасылаць свае заяўкі пісьмова на адрас: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Калі Вы маеце тэлефон, пазначце яго.

Даведкі праз тэл.: 249-08-88 да 10 гадзінаў раніцы; 231-04-08 у працоўны час.

Новыя кнігі, дасланыя у рэдакцыю

Вашко Л. Паэты-цары: Трыццаць пяць беларускіх малюнкаў: Апавяданьні. – Менск: Мастацкая літаратура, 1997 – 301 с. – Наклад 1.000 ас. ISBN 985-02-0385-4

Адам Глёбус. Койданаўцы: проза. – Менск: Літаратура, 1997. – 112 с. – Наклад 99 ас. ISBN 985-437-427-0

Далідовіч Г. Кліч роднага звона: Раман, апавяданьні, мініятуры: Для ст. шк. веку / Мастак У.Сытчанка – Менск: Юнацтва, 1997 – 414 с., іл. – Наклад 6.000 ас. ISBN 985-05-0142-1

Драздова З. Творчасьць А.Мрыя і Л.Калюгі: Стылёвыя асаблівасьці. – Менск: Беларуская навука, 1997 – 143 с. – Наклад 600 ас. ISBN 985-08-0040-2

Дудзюк З. Палонькі жыцьця: Аповесьці, апавяданьні. – Менск: Мастацкая літаратура, 1997 – 270 с. – Наклад 700 ас. ISBN 985-02-0221-1

З глыбі вякоў. Наш край: Гістарычна-культуралягічны зборнік. Выпуск 2. Навук. рэд. А.Краўцэвіч, Укладальнік В.Шаблюк – Менск: Беларуская навука, 1997 – 240 с., іл. – ISBN 985-08-0044-5

Кантакты і дыялёгі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралягічны бюлетэнь Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязяў з зарубежнымі краінамі. – Менск – Верасень-кастрычнік 1997, №9-10 (21-22). – 63 с. – Наклад 499 ас.

Карамазаў В. Выбраныя творы. У 2 т. Т.1: Бежанцы: Раман; Краем Белага Шляху. Дзень Барыса і Глеба: Аповесьці / Прадмова П.Васюкэнкі – Менск: Мастацкая літаратура, 1997 – 509 с., партр. – Наклад 1.700 ас. ISBN 985-02-0105-3 (т.1)

Кісьліцына Т. Алесь Разанаў: Праблема мастацкай сьвядомасьці / Навук. рэд. Л.Гарэлік – Менск: Беларуская навука, 1997 – 143 с. – Наклад 600 ас. ISBN 985-08-0039-9

Ляшук В. І прарастаюць словы: Дап. для пэдагогаў дашк. устаноў – Менск: НМ Цэнтар, 1997 – 176 с. – Наклад 7.030 ас. ISBN 985-6216-25-7

Навуменка І. Максім Багдановіч. – Менск: Беларуская навука, 1997 – 141 с. – Наклад 1.000 ас. ISBN 985-08-0051-8

Прававабарончы агляд. Бюлетэнь Беларускага Хельсынскага камітэту. 1997, №5.

Русак В. і інш. Курс вышэйшае матэматыкі: Функцыі некалькіх зьменных і інтэгральнае зьлічэньне. Шэрагі: Падручнік / В.Русак, Л.Шлома, В.Ахраменка, А.Кручкоўскі – Менск: Вышэйшая школа, 1997 – 505 с., іл.

Сідарук І. Моўкнасьць. Вершы. – Берасьце: Выдавецтва Т.Лаўрова, 1997 – 36 с. – Наклад 300 ас. ISBN 985-6371-08-2

Сіненка Т. Насуперак канону: Да праблемы станаўленьня творчай індывідуальнасьці ў абставінах таталітарызму. – Менск: Беларуская навука, 1997 – 430 с. – Наклад 500 ас. ISBN 985-08-0018-6

Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалёгія: Вучэбн. дапаможнік / Н.Гаўрош, М.Кавалёва, Н.Нямковіч і інш.; Пад рэд. праф. М.Яўневіча – Менск: Выд. У.Скакун, 1997 – 288 с. – Наклад 8.000 ас. ISBN 985-6235-12-X

Сьцяжына: Чытанка для 3-4 кл. / Аўтар-складальнік Г.Каржанеўская – Менск: НМ Цэнтр, 1997 – 240 с., іл. –Наклад 30.000 ас. ISBN 985-6216-13-3

Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.4: Кадэты – Ляшчэня / Беларуск. Энцыкляпэдыя; Г.Пашкоў (гал рэд.) і інш.; Мастак Э.Жакевіч – Менск: БелЭн, 1997 – 432 с., іл. – Наклад 10.000 ас. ISBN 985-11-0041-2

Бобков В., Кузнецов Н., Осмоловский В. Политические партии Беларуси. – Менск: БГЭУ, 1997. – 140 с. – Наклад 3.000 ас. ISBN 985-426-067-4

Głogowska Helena. Białoruś 1914-1929. Kultura pod presją polityki. Red. O.Łatyszonek — Białystok, 1996 — 238 s., il. ISBN 83-903068-7-5

Więź: Białorusini o nas. Białorusini o sobie. — 1997, Nr.9 (467)

Аляксандар Лукашук

«За кіпучай чэкісцкай работай»

Сцэны з жыцьця катаў

Новы кніжны праект «НН» – вынік шматгадовага архіўнага пошуку, на падставе дакумэнтаў дасьледуюцца ўнутранае жыцьцё НКВД і норавы чэкістаў-курапатчыкаў, мэханізмы цэнзуры і драма сучаснага маральнага выбару, адкрываюцца невядомыя старонкі нацыянальнай трагедыі.

Кніга «За кіпучай чэкісцкай работай» стане чарговым ілюстраваным выданьнем пад грыфам Архіву Найноўшае Гісторыі сьледам за ўжо вядомымі нашаму чытачу «Менскай вясной – 96», «Гартам» і «Філістовічам». Мяркуецца, што новая кніга ўбачыць сьвет у кастрычніку.

Папярэдняя замова (сабекошт + кошт перасылкі) складае 44.000 + 15.000 БРБ.

Каб замовіць кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

КАСЭТЫ – ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 38.000 + 7.000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Тарнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Тарнада. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндам. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Голуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галюцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)

КОШТ КАСЭТАЎ 43.000 + 7.000 ПОШТА

Gods Tower. The Eerie.
Gods Tower. Canticles.
Plastic Hardcore. Ultra.
Chemical Warfare. Demolition Tape.
Headcleaner. Hash. Hash. Resistance.
Insania Trivium. Candle of Fire.

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

АРХІЎ БЕЛАРУСКАЙ РОК-МУЗЫКІ

Беларускі Гуманітарны Фонд «Наша Ніва» стварае Архіў беларускай рок-музыкі. Галоўная мэта новага праекту – збор матэрыялаў і дасьледаваньне сучаснай незалежнай музычнай традыцыі Беларусі.

Архіў зьбірае: старыя, рарытэтныя аўдыё-відэаматэрыялы, друкаваную прадукцыю (газэты, часопісы, афішы, плякаты і да т.п.).

Зацікаўленым асобам просьба зьвяртацца на адрас:

Архіў беларускай рок-музыкі, а/с 5, Менск 220085,

або праз тэлефон: (017) 231-04-08 (Сяргей Сахараў).

НАВІНКА!

Głogowska Helena. Białoruś 1914-1929. Kultura pod presją polityki. Red. O.Łatyszonek — Białystok, 1996 — 238 s., il. ISBN 83-903068-7-5

Падобна, што гэтая кніга беларускай дасьледчыцы з Ґданьску спрычыніцца да фармаваньня новага погляду на культурныя працэсы ў Беларусі. Таксама нетрадыцыйнаю зьяўляецца прапанаваная пэрыядызацыя.

МУЗЫЧНЫЯ АБВЕСТКІ

Блізіцца Рок-каранацыя 1997. 22 лістапада ў клюбе «Луч» (Няміга, 30) адбудзецца адборачны тур «Рок-каранацыі-97». У канцэрце прымуць удзел «NRM» (Менск) і Voo Doo (Гомель). Пачатак а 20-й гадзіне.

23 лістапада ў Лідзе ў памяшканьні музычнага цэнтру «Панарама» адбудзецца канцэрт гуртоў «Новае Неба» і «Гай». 24 лістапада гэтыя ж гурты выступяць у Горадні.

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

грамафон.

Аляксандар Антончык

ПРА САБАКУ

Імчыцца са сьвістам у абшар электрычка,
За сьцяной яе вецер сьлявае,
Пралятаюць рабіны і хвойкі,
Ў вокнах сонца сьмяецца і зьзяе.

У вагоне бязьлюдным, маўклівым
Ля рыбацкага шэрага бака,
Палажыўшы на лапы галоўку,
Дрэмле чутна паджары сабака.

Гаспадар яго, хмуры мужчына,
Церабіць край блакітнай вяроўкі,
Чуць прыкрытыя шэрыя вочы
Глядзяць з сумам на белы красоўкі.

Вось прыпынак. Сабака на глебе,
І глядзіць ён даверліва ў твар.
Што стаіш на прыступах вагона?
Злазь хутчэй да мяне, гаспадар.

Злазь. Ідзі, паглядзі, як тут хораша.
Чуеш — жук ля таполі гудзе.
Ты ж зьбіраць будзеш белы рамонкі,
А я бегаць па цёплай вадзе.

Што з табою, а можа ты хворы?
Дык знайду я табе лекі-зёлкі.
Шмат красуецца іх ў чыстым полі,
Зьзяе фарбамі яснай вясёлкі.

А мужчына кідаў тут сабаку,
Праклінаючы ўласны учынак,
Усё чакаў, калі ўрэшце пакіне
Электрычка лагодны прыпынак.

Зачыніліся сьвіснуўшы дзьверы.
Успалашыў вераб'ёў грукат сталі.
Колы ж, глянуўшы ў вочы сабаччы,
Ад адчаю аж рэйкі кусалі.

Зноў імчыцца ў блакіт электрычка.
Чуваць у тамбуры пах цыгарэты.
Ізноў ідуць уздоўж яе гандляры,
Прапануючы людзям газэты.

А пакінуты ўсімі сабака
З той пары на прыпынку ля люда
Ходзіць цэлымі днямі галодны
І чакае ўсё нейкага цуда.

Ходзіць, цягне падбітую лапу,
Што вісіць нібы тая падкова.
І ўсё марыць, што той за ім прыйдзе,
Хто згубіў яго тут выпадкова.

Заглядае у вокны вагонаў,
Каб убачыць знаёмы ў іх твар.
Голаў дурыць настойліва думка:
Дзе ты мой, дзе ж ты мой гаспадар?

Андрэй Аляксандраў

***

Халоднай турмы
Разламаныя краты...
Мой шлях,
Што ўецца крывавай стужкай...
Разбуджаны лёсам,
Разбуджаны Праўдай,
Што б'ецца ў сэрцы
Параненай птушкай,
Я іду.

Нячулыя душы,
І мёртвыя сэрцы,
І шэрасьць тупая,
Што кліча ў балота,
Я вам аб'яўляю вайну!
І да сьмерці
Змагацца ня кіне
мая ўся істота:
Я жыву!

Ніколі ня стану
Рабом паслухмяным,
Халопам старацельным
На пабягушках.
Я волю сваю не прадам!
Палыміны
Свой шлях,
Што ўецца крывавай стужкай
Я прайду!

Костусь Атрашэўскі

УГОДКАВАЕ

Віталю С.

Цяпло ў рукох няхай не астывае,
У сэрцы жар — ня ціхне палымнець,
Хаця аднойчы, верасьнем ці маем,
Жалобай гострай узгалосіць медзь...

Сустрэча — Там. Дняпром хвалістым, Сожам,
Скуль далеглядна небасхіл відзён,
Да Прыстані вяслуйма смуткаў гожых
І роспачлівых беларускіх дзён.

На ціхім плёсе — зорыстым і чыстым —
Зглынуўшы золь пявучае расы,
Сыйдземася суладна-прамяніста
І вечны Жыд, і Беларус Вячысты
Каля Яе — Нятускнае Красы.

А покі — тут, на абсягох забраных,
Канаць ня дайма Крыўі сіратой;
Каб ні Байструк, ні чужынец паганы
Ёй не трасьлі жабрацкай калітой.

.....

Далёка разьбягаюцца сусьветы
Празь неабсяжны Беларускі Дом...
І прашывае цемрачу каметай
Вагністае-нясьціхнае Жывом!

Бога

КА...

Кажуць, ня трэба шукаць нікога,
Бо ў тым, што было, ніхто не жыве.
Я не жадаю выходзіць зь мінулага,
Я буду адзіны, каго праглыне
Жыццяў хада. Хай мяне ўсе забудуць,
Няхай усе жывуць нэо-сёньняшнім днём.
Ня вельмі істотна, калі ты шчасьлівы,
Якім цябе Час агрэе кіём...

Źmitro Babroviec

MAJA VIERA

Zaplušču voču ja — i ŭraz pierada mnoju
Paŭstanie kapišča — pahanski chram.
Ja kroču ad carkvy darohaju svajoju —
Ja nie Chrystu, a Pierunu dušu svaju addam...

Hod tysiaču tamu žyli tut našy prodki —
Dryhavičy, radzimičy dy kryvičy.
Ich pobyt byŭ budzionna-nietaropki,
Jany žyli, svajim baham pakłony dajučy.

Byli ich ruki čystyja dy čystyja ich duby;
U Vyraj-Raj usie traplali jak adzin;
Nia znali chciviaści, trukactva-kryvadušša,
Pakul miž ich nie pajaviŭsia «Boha ŭ Syn».

Chrystovy słužki ŭ čornyja apratki
Spavić chacieli našu Bieluju ziamlu...,
Jany svaje, čužynskija, ŭviali paradki,
Dy kinuli čužoje ziernie ŭ našuju rallu...

Radzima, ty apojena čužyncam;
Atrutu vypluncć ci zmožaš ty?
Ci zmožaš ty pajści, nas paviaści, svajim haścincam,
Što vyviadzie da sonca ź ciemry dy słaty...

Ja nie Chrystu malusia, a svajim Baham abranym,
Tupym nia vieru modłam, kazaniam praklatych tarhačoŭ!
Tabie malusia ja, Litva,
Tvajim łuham, łasam, kurhanam...
Ja da ciabie, Radzima, ad carkvy pryjšoŭ.

Тацяна Будовіч

***

Вясна, а холадна.
І рукі замярзаюць.
І цені ад клёнаў
На шэрым асфальце.

І іншыя цені,
Што разам з табою
Жывымі стаць хочуць.
... А вецер халодны.

***

У сіні спакойных воч
Пытаньня працяг нямы.
«Вы? Таня, здаецца, Вы?..»
За гэты працяг усё
Аддаць бы, аддаць, аддаць.
У сіні спакойных воч
Пытаньня няма, няма...

Ян Гранкевіч

***

Над краінай хмары нізка,
Сонца тут пануе рэдка.
Маці гойдае калыску,
Там сынок — любові кветка.

Немаўля ляхыць спакойна,
Хоць вятрыска б'е ў шыбы, —
Толькі вецер тутка вольны,
Толькі хмараў грозных грывы.

Маці дзіўна — што за дзетка —
Не засыне ніяк маленькі!
Ды й ня плача — вецер сьведкам,
І ня хоча на каленькі.

Вочы сьвецяцца ў малога
Незвычайна, прыцягальна.
Іх сьвятло — нібы дарога,
Іх блакіт — надзеі тайна.

Хутка поўнач, а кабета
Усё сядзіць, глядзіць у вочы.
«Добрым будзе гэта лета», —
Сэрца ейнае прарочыць.

Атуляецца надзеяй
Маладое маці сэрца.
Хай на вуліцы завея —
Што для Веры подых сьмерці!

Што для Веры зброя катаў!
Што для Веры зьдзек чужынцаў!
Бы для песьні — брэх сабакаў.
Бы для Бога — сьмех ардынцаў.

Будзе лета наша з хлебам.
Будзе лета наша з Воляй.
Бо прыйшла Надзея зь неба,
Бо Свабода — наша доля.

Вочы сьветлыя адораць
Усіх сьвятое Веры сілай.
Смагу прагнучых спатоляць,
Моц дадуць усім пахілым.

Ваярам Зямлі Сьвятое —
Панявечанага краю —
Укладуць у рукі зброю
Й непахіснасьць у адчаі.

А кабетам — мір у душы,
Дзетак моцных і здаровых,
Каб ня чулі клінаў вушы,
Каб ў свае хадзілі школы.

Зь Вераю вачэй нябёсных
Станецца наш люд нязломным.
Для чужынскіх зграй — пагосты
Будуць ложам векапомным.

Ад чужых бажышчаў ганьбы
Вызваліцца край суровы.
Ідалаў памерлых здані
Будуць звергнутыя Словам.

Словам родным, Словам вечным.
А за Словам прыйдзе Справа —
Зробіць з жыццяў хуткацечных
Шыхты вечнасьці сапраўднай.

.....

Так прымроілася маці
Над дзіцячаю калыскай.
Глянула — а немаўляці
Як раней ня сьпіцца й блізка.

Тварыкам бялюткім зьзяе
У цішы зімовай ночы,
Вусны ўсьмешка ледзь кранае.
Штось зьмянілася ў змрочы.

Азіраецца трывожна
Матка — дзе прычына зьмены?
Ўзяла сына асьцярожна.
Кроў баржджэй цячэ па венах.

Як звычайна ўсё навокал.
А на вуліцы? Дзяўчына
З ношай мілай йдзе да вокнаў.
Вось узрушная карціна!

Шкумаціньне хмараў грозных
Па нябёсах раскідана.
Ясных зорак бацька хросны —
Ветрык — сьціхнуў да сьвітанку.

Дбайна выканаў ён справу —
Зоркі сьвецяць над краінай,
Дыямэнты без аправы.
«Як прыгожа!» — шэпча сыну

Маці, тулячы да сэрца
Цёплы камячок радзімы.
А ў вачох ягоных б'ецца
Як вагеньчык у лучыны,

Зоркі белае адбітак,
Што далей, ярчэй усіх сьвеціць,
Срэбраньню Надзей вялікіх
Усіх зьняверaных прывеціць.

Усіх адорыць Ласкай Божай,
Міласьцю загоіць раны,
Вераю ў час астрожны
Будзе ў душах катаваных.

Зь Верай, Міласьцю, Надзеяй
Трапнай будзе вояў зброя.
Зьнікнуць у нябыт завеі,
Прышласьць стане лепей мроі.

Маці спаць дзіця паклала,
Сон пакрыў душу абрусам...

Панну ту Марыяй звалі,
Край забраны — Беларусяй..

Яўген Гучок

***

З кім вольна быць —
Знайсьці тут цяжка,
А з кім рабом — хоць гаць гаці.

***

О Беларусь!
Гатовы я аддаць табе сваё жыццё,
А ты й гадзіны браць мае ня хочаш.

***

Спаўзаюць з шыі тут каралі,
Спаўзаюць — і ў наручнікі
Ператвараюцца.

***

І як бы ні была ўтрамбавана Беларусь,
Заўсёды знойдзецца
Яе будзіцель і рупліўца.

***

Бы птушка, ў адзіноце
Сьвет гэты пакідаў
Паэт Максім.

***

Любоў — тады сапраўдная любоў,
Калі яна людзей злучае
Ў любві да Бацькаўшчыны й Бога.

***

Пройдзе ўсё: і зямля, і зямная слава.
Застанецца да Бога
Імкненьне хай!

***

Ты апаганіўся, ты прагнеш ачышчэньня —
Зьвяртайся да Максімавай
Душы.

***

То не аблокі ў небе паплылі,
То мо пяшчотная й самотная
Максімава душа?

***

Гадоў Тварэц Максіму мала даў,
Затое — якасных,
Нібы пялёстак ружы.

Андрусь Клікуноў

***

Люстраная водаў гладзь
Анічога не відаць,
Між амшараў у імжы,
Нібы з могілак крыжы,
Тэлеграфныя слупы
Абвязалі белы сьвет,
І ратунку болей нет,
І ня вольны болей ты:
Быццам чорныя краты
Між карэньняў рыюць краты,
Сьвет на злодзеяў багаты...
І ня вымавіш ужо ў сьвет
Аб чым марыў, і сакрэт
Твой застанецца з табою,
Над люстранаю вадою...

***

Дзе падзелась маё шчасьце,
Ці ня бачылі вы, не?
Нібы зорка ў нянасьці,
Што вяла ў сьвет мяне.

Дзесь згубіў яго, пакінуў,
Ці змагу ўжо напаткаць?
Ці ўжо лёс то мой адзіны —
Усё жыццё яго шукаць.

Mikoła Maksimaŭ

LIĆVINU

Pad Jaryłavym kryžom,
Aśviaciŭšy šlach źnićom,
Praz stahodździ, praz hady
Svaju movu praniašli.

Praniašli, uzbahacili,
Kraj svoj luby adradzili.
Vialikaje kniastva — našu krajinu
Addać zyćcio nie škada za Radzimu.

Hladziać na nas prodki-Dziady,
Ci hodna niasiem my svoj ściah pa zyćci.
My ź zhurtavalisia, my ciapier sila,
Ličvin zaŭdy padtrymaje Ličvina.

Зьміцер Піскун

ТАМ

Мяне няма тут — я пайшоў ад вас,
Каб піць віно зь сівабародым дзедам
І там валяцца п'яным доўгі час
І не чакаць, што нехта прыйдзе сьледам.

У сьвятой дуброве травы па паяс
І зоры нізка, хоць крані рукамі,
Мяне няма тут — я пайшоў ад вас
Вам — камень склепа, мне — свабоды камень.

СТОД

Я ў лесе адшукаю стод
Забытага сівога бога
Як завуць яго: Сварог, ці, можа, Род?
Не, ўжо не завуць яго, старога.

Аддзяру з драўлянай барады
Павучыньне і напоўню кубак
Чымсьці памацней крынічнае вады,
Апячэ няхай нутро — ня зубы.

Дзеду, выпі жа са мной і ты!
Мы з табой адной крыві і духу,
Я самотны і самотны ты,
Нібы недзе ў полі ў завіруху.

Хмель ударыць нам у галаву,
Ты ж ня піў гадоў зь пяцьсот, старэча,
Кіну каменем у гэтую саву
Не псуе, дурная, хай сустрэчу.

Ў тваім лесе ўсё толькі для нас,
Шапацяць ласкава дрэвы хвалі,
Я б хацеў, каб празь нядоўгі час
І мяне тут побач пахавалі.

Браніслаў Пяткевіч

СТАРЫЯ

Цьвіла вясна, мінула лета,
Прыйшла ўжо пара сівая.
Штодзённай старасьці прыкмета:
У заўтра вуліца крывая.

А небясьпечныя хваробы,
Як шашаль точаць стан здароўя.
Мікробы ў хісткія вантробы
Сталююць русла малакроўя.

Хто меў дзяцей, ад іх унукаў,
Іх цеплынёй турбот сагрэты.
Хто адзінотай голай грукаў
У скрусе сьлёзы лье аб гэтым.

Каму праспэкт, каму завулак
Сам важкі лёс паслаў пад ногі;
Ня кожны мае свой прытулак
Бо зьведаў высылкі, астрогі.

А хто з вайны прыйшоў калекам,
Ды не знайшоў уласнай хаты,
Хоць быў пачэсным чалавекам,
Ня стаў заслужаны багатым.

Хто неразумна й бязвольна
Прыняў абдымкі алькаголю,
Ня змог з сяброўкаю супольна
Палепшыць працай сваю долю.

З жыццём ісьці ды есьці кашу,
Не абмінуць з грозёй калдобін,
Ня кідай каменя на пашу,
Калі на бога ты падобен.

Пашана з чэсьцю прад табою
Ня збэсьці іх благім учынкам,
Ідзі ў пасьцель пасьля адбою,
У снах ты хлопец, ці дзяўчынка.

Усім старым падмогі трэба
Бо немач цяжасьць не падыме.
Чыны улады не ад неба,
Ня быць ім вечна маладымі.

Генадзь Стрэмка

***

Чалавек у чырвона-зялёнай кашулі
Запытае ў цябе: «Дык чаго жа ты хочаш?»
Зазірні ў яго сэрца, дзе мары заснулі,
Зазірні у пустыя ягоныя вочы.

Ты ня цісьні чырвона-зялёную руку,
Ты ня слухай чырвона-зялёныя словы.
Так і ведай: сустрэў на шляху ты гадзюку,
Што на здраду і подласьць заўсёды гаговы.

Як атрута, чырвона-зялёныя думкі.
Яны робяць зь цябе паслухмяную цацку.
І старанна цалуюць халопы-прыдуркі
У азадак чырвона-зялёнага бацьку.

Ён са зграяй сваёй (дзе вар'ят на вар'яце)
Запраўляе чырвона-зялёнай гурмою.
Паглядзі, беларус, паглядзі, мілы браце,
Што зрабіў ён з прыгожай краінай тваёю!

Зразумей, што ня будзе шчасьлівай Радзіма,
І ня спраўдзіць нам бел-чырван-белыя мары,
Покуль ёсьць у нас людзі з пустымі вачыма
І прадажнай чырвона-зялёнай душою.

Юры Чарнякевіч

***

Нарэшце восень надышла,
Пафарбавала чырваньню лістоту.
Зялёны ліст сярод гальля
Ад ветра прыхаваўся ўпотай.

Надыдзе дзень — лістота зьнікне,
Як сон, як год,
Як кожны з нас...
Запомню я зялёны ліст
Сярод самотнага гальля.

А.Шадрын

***

Абапал дарогі — слупы ліхтароў
Крынічныя сьлёзы раняюць,
Рэклямныя шыльды стракатасьцяй слоў
Абсяг прамяністы ствараюць.

Малюнак абстрактны ў паветры застыў
Праявай фатальнай сьпякоты,
І, нехта, паходні сьвятло запаліў,
Каб згінулі рэшткі самоты.

А хтосьці, шукаючы сэнс валтузні
Ў радочках Твайго Запавету,
Так моцна адчуў харство цішыні,
Што зьнікнуў у хвалях Сусьвету.

Душа мая прагне Сьвятога Агня,
Палёгкі, хаця б на імгненьне,
Ды стогне пад націскам кожнага дня,
Шукаючы ў цемры — ЗБАВЕНЬНЕ.

Апошнія словы істоты маёй
На вуснах дыямантам стынуць,
І я, сузіраючы цьмяны спакой,
Імкнуся, урэшце, загінуць.

Алёна Шарэпа-Лапіцкая

***

Я песьні аб Табе
сьпявала пад Сасной,
Насустрач да мяне
пляскалі хвалі мора...
Хацела я зрабіцца
Рыбкай Залатой
і за Табой
так пасьпяшацца
скора...
Ды раптам зашумеў
імклівасьці
прыбой,
заракаталі
усьпененыя
хвалі...
Сьмяяліся яны,
што я хацела
Рыбкай Залатой
паплысьці
за Табой,
Паплысьці за Табой
ў няведамыя
далі...

Сымон Шаўцоў

ДЗЕ ТЫ?

Дзе ты, мая вясёлая каханка?
Дзе ты, вясеньніх дзён маіх вакханка?
Пакінула свой край у вечар па вясьне...
Аставіла мяне ў чароўным сьне.
Жыццьцё маё было без турботаў.
Шукаю цябе па ўсім сьвеце.
«Столькі турбот аб кабеце?»
Скажыце, дзе яе шукаць,
Усё за яе магу аддаць.
Яе можна пазнаць
Па такой прымеце:
Яна ў малінавым брэсце,
Вочы празрыстыя, блакітныя, як неба,
Бажэсьцьвенна, як Геба,
з іскрой агню і смутку крыху,
Лагодная, ні кроплі пыху.
Яна не зямное дзіва?
Вельмі прыгожая й цнатліва.
Сукенка ў яе — бел-чырвона-белы колер,
Твар — ружаў залатых букет,
Прыгажэй яе няма на ўсім белым сьвеце.
Губы з усьмешкай, саладзей нэктару.
Сама — найзнатнейшага роду
беларускага народу.
Голас — сьпеў салавейкі.
На плячах — пелярынка
Лёгкая, як пушынка.
Працавітая, як пчолка.
На вейках воч — срэбра сьлязінка.
Броўкі — вясёлкі.
У руках — залатая іголка.
На ёй трымае анёлка.
Галоўка ў касьніках-вяночках.
Вяночкі з сонечных промняў,
Ніхто такіх ня мае,
Як промні сонечнага мая.
Пагляд яе задуменны.
Пад ногі ёй сьцелюць белыя абрусы.
Імя яе — Беларусь.
Хай мне скажуць, дзе яе шукаць,
Я цэлы сьвет прайду, яе знайду.
Па красасе — падобная Вэнэры,
Хоць мне вы не даеце веры.
А я яе знайду,
Ізноў абдыму.

Віталь Юрэвіч

ЗОРКА

Маланкай яркай зорка паляцела
З начнога неба ў цемень небыцьця.
І доўга ў сэрцы ўзрушанным гарэла
Падзеньне сьветлае, як музыка жыцьця.

***

Крывёй напісаныя вершы
Ня змыць ні часам, ні вадою.
Яны — надзеі прабліск першы,
Як сон-травы ўзыход вясною.

Жыццьцём народжаная проза, —
Як звон набату ў дзень суровы,
Што ўзбудзіць сэрца ад марозу
І ў вусны мёртваму дасьць словы.

Каханьнем складзеная песьня
Сьвятлом запоўніць нашы душы
І зло памкненьняў нашых грэшных
Капеж раскаяньня ўзварушыць.

Ірэна Янчанка

ВІНШУЮ!

Я нат сябе не разумею,
Ня кажучы ўжо пра цябе.
Уся я проста блытаніна
Расчараваньняў ды надзей,

Бінарных функцый, вершаў, песень,
Сумневаў, веры ў дабрыню,
Каханьня, розуму ды бзікаў,
Палыну, мяты ды вагню.

Што ты калісьці запаліў мне,
Разладзіў звыклы мой спакой.
Цяпер замест мяне-каханай
У думках часта вобраз твой.

Я сумавала на імпрэзах,
Дзе весела усім ушчэнт,
А я ж ўсё болей вар'яцела
Ад гэных твараў ды вачэй,

Што лютым холадам краналі,
Калі у іх я зазірну.
Але упарта я шукала
У чужых вачах сваю вясну.

І я знайшла яе аднойчы,
Калі сустрэла погляд твой.
І з той вясны (бо красавік быў)
Мая вясна ужо са мной.

А я цяпер цябе віншую
І з Днём народзінаў, і з тым,
Што гэты год ужо быў нашым,
А не яшчэ адным тваім.

Табе жадаю веры, шчасьця,
Зьдзяйсьненьня мараў ды надзей,
Людзей цікавых, ўчынкаў годных,
Шмат творчых плянаў ды ідэй.

Яшчэ я зычу табе сьціпла,
Каб і ў наступныя гады
Усе дні народзінаў, мой любы,
Стрэчалі разам. Я і ты.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ПРАТАКОЛЫ

да Эўрапейскай Канвэнцыі аб Абароне Правоў Чалавека й Асноўных Свабодаў

ФАРМАЛЬНЫЯ РЫСЫ

Пастаяннае прыняцьце новых Пратаколаў да Эўрапейскай Канвэнцыі аб Абароне Правоў Чалавека й Асноўных Свабодаў сьведчыць пра тое, што Рада Эўропы ўжо мае сваю гісторыю й эўрапейскае заканадаўства ўвесь час удасканальваецца. Прычым і Канвэнцыя, і Пратаколы даюць зьнешне простыя, але ўнівэрсальныя вызначэньні асобных катэгорыяў правоў чалавека па-за яго біялягічнай прыродай. Сучасная сацыяльная практыка ў Беларусі поўніцца блытанінаю ў разуменьні фундамэнтальных правоў чалавека, што дазваляе іх парушаць. Аляксандар Лукашэнка сьцьвярджае: «Правы чалавека заключаюцца ня толькі ў праве на інфармацыю, але і ў праве на жыцьцё, на працу й на яе аплату». Сказаць так — гэта тое самае, што сказаць: чалавек мае права дыхаць паветрам. Эўрапейская канвэнцыя ж сьцьвярджае, што «права кожнага чалавека на жыцьцё абараняецца законам» (Артыкул 2) і таму гэты юрыдычны дакумэнт прысьвечаны ня «праву на паветра», а законам і таму, якім мінімальным стандартам яны павінны адпавядаць.

Вось жа сацыяльныя правы ў Эўрапейскай канвэнцыі — гэта не біялёгія, а законатворчасьць, якая бароніць правы чалавека ў сацыяльнай сфэры, не дазваляючы іх блытаць зь фізычнымі ўмовамі існаваньня чалавека, а значыць, не дазваляючы парушаць і першыя, і другія. «Кожная фізычная альбо юрыдычная асоба мае права бесьперашкодна карыстацца сваёй маёмасьцю. Ніхто ня можа быць пазбаўлены сваёй маёмасьці» (Артыкул 1 Пратаколу №1). Да сацыяльных правоў чалавека належыць таксама права свабоды перамяшчэньня (Пратакол №4).

Але ёсьць адна сфэра, дзе Эўрапейская канвэнцыя судакранаецца зь біялягічным і сакральным адначасова. Пратакол №6 сьцісла й канкрэтна вызначыў, што ў мірных умовах «Сьмяротнае пакараньне скасоўваецца. Ніхто ня можа быць прысуджаны да сьмяротнага пакараньня альбо пакараны» (Артыкул 1). Гэтая тэза набыла панэўрапейскую юрыдычную фармулёўку ў 1983 годзе — праз 33 гады пасьля прыняцьця Эўрапейскай канвэнцыі; праз 34 гады пасьля ўтварэньня Рады Эўропы; праз два тысячагодзьдзі пасьля ўзьнікненьня хрысьціянскай канцэпцыі пра сьвятасьць жыцьця, бо чалавек створаны ў Божым падабенстве; праз тры тысячагодзьдзі існаваньня эўрапейскай цывілізацыі...

У Менску ж у цэнтры горада, на галоўных яго плошчах адбываюцца масавыя расстрэлы — бо як яшчэ можна назваць пытаньне «Рэфэрэндуму-96» пра сьмяротнае пакараньне. Сацыёлягі пераканаюць, што практычна ва ўсіх краінах, дзе сьмяротнае пакараньне адмененае, большасьць насельніцтва гатовая была б падтрымаць яго ўвядзеньне. Але для таго й існуюць закон і дэмакратычныя працэдуры, каб разьмежаваць інстыпкты й грамадзтва. У нашай жа краіне стрэлам, якія гучаць у мазгах Аляксандра Лукашэнкі, нададзенае відмо закону.

Эўрапейская цывілізацыя стварыла свой канон культуры, дзе шмат месца аддадзена ўмоўнасьцям і фармальным рысам. Гэта дае падставы некаторым культуролягам сьцьвярджаць, што эўрапейская цывілізацыя й культура сутнасна менш глыбокія, чым усходнія цывілізацыі й культуры. Нам жа падаецца, што эўрапейскі канон, разьмяжоўваючы біялягічныя і сацыяльныя прыроды чалавека, праз прыняцьце фармальных правілаў хоць у некаторай ступені спрабуе захаваць баланс паміж біялягічным і сацыяльным, імкнецца мінімізаваць рэпрэсіўнасьць як супраць біялягічнага, так і супраць сацыяльнага.

Таму ў канцы XX ст. фармальная прыналежнасьць да Пратаколаў Эўрапейскай Канвэнцыі аб Абароне Правоў Чалавека й Асноўных Свабодаў азначае й прыналежнасьць да эўрапейскай цывілізацыі.

Алег Дзярновіч

ПРАТАКОЛ №1

Урады, якія падпісалі гэты Пратакол, зьяўляючыся чальцамі Рады Эўропы,

Поўныя рашучасьці распачаць захады да забесьпячэньня калектыўнага выкананьня некаторых правоў і свабодаў, акрамя тых, якія ўжо ўключаныя ў Разьдзел I Канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў, падпісанай у Рыме 4 лістапада 1950 году (далей называнай «Канвэнцыя»),

Дамовіліся пра наступнае:

Артыкул 1

Кожная фізычная альбо юрыдычная асоба мае права бесьперашкодна карыстацца сваёй маёмасьцю. Ніхто ня можа быць пазбаўлены сваёй маёмасьці, апрача выпадкаў, калі гэта ў інтарэсах грамадзтва й на ўмовах, прадугледжаных законам і агульнымі прынцыпамі міжнароднага права.

Папярэднія палажэньні ніякім чынам ня ўшчэмліваюць права дзяржавы забясьпечваць выкананьне такіх законаў, якія ёй бачацца неабходнымі дзеля зьдзяйсьненьня кантролю за выкарыстаньнем маёмасьці ў адпаведнасьці з агульнымі інтарэсамі альбо для забесьпячэньня выплаты падаткаў альбо іншых зборaў ці штрафаў.

Артыкул 2

Нікому ня можа быць адмоўлена ў праве на адукацыю. Дзяржава пры выкананьні любых функцыяў, якія яна прымае на сябе ў галіне адукацыі й навучаньня, паважае права бацькоў забясьпечваць такую адукацыю й навучаньне сваім дзецям у адпаведнасьці са сваімі ўласнымі рэлігійнымі й філязофскімі перакананьнямі.

Артыкул 3

Высокія Дамоўныя Бакі абавязваюцца праводзіць свабодныя выбары з разумнай пэрыядычнасьцю шляхам таемнага галасаваньня на такіх умовах, якія забясьпечаць свабоднае волевыяўленьне народу ў выбары заканадаўчай улады.

Артыкул 4

Любы Высокі Дамоўны Бок можа пры падпісаньні альбо ратыфікацыі альбо ў любы час пасьля таго накіраваць Генэральнаму сакратару Рады Эўропы заяву аб межах сваіх абавязкаў адносна прымяненьня гэтага Пратаколу да такіх названых у заяве тэрыторыяў, за міжнародныя адносіны якіх ён не нясе адказнасьці.

Любы Высокі Дамоўны Бок, які накіраваў заяву ў адпаведнасьці з папярэднім пунктам, можа час ад часу накіроўваць наступныя заявы аб зьмяненьні ўмоваў любых папярэдніх заяваў альбо аб спыненьні ўжываньня палажэньняў гэтага Пратаколу ў дачыненьні да любой тэрыторыі.

Заява, зробленая ў адпаведнасьці з гэтым артыкулам, разглядаецца як зробленая ў адпаведнасьці з пунктам 1 артыкула 63 Канвэнцыі.

Артыкул 5

Высокія Дамоўныя Бакі разглядаюць палажэньні артыкулаў 1, 2, 3 і 4 гэтага Пратаколу ў якасьці дадатковых артыкулаў да Канвэнцыі, і ўсе палажэньні Канвэнцыі прымяняюцца адпаведна.

Артыкул 6

Гэты Пратакол адкрыты для падпісаньня чальцамі Рады Эўропы, якія падпісалі Канвэнцыю; ён падлягае ратыфікацыі адначасна з ратыфікацыяй Канвэнцыі альбо пасьля яе ратыфікацыі. Пратакол уступае ў сілу пасьля здачы на захаваньне дзесяці ратыфікацыйных граматаў. У дачыненьні да любой зь дзяржаваў, якая ратыфікуе Пратакол у далейшым, Пратакол уступае ў сілу з моманту здачы на захаваньне яе ратыфікацыйнай граматы.

Ратыфікацыйныя граматы здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы, які паведамляе ўсім чальцам Рады пра дзяржавы, якія ратыфікавалі Пратакол.

Зьдзейсьнена ў Парыжы дваццатага дня сакавіка 1952 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архівах Рады Эўропы. Генэральны сакратар накіроўвае засьведчаныя копіі кожнаму ўраду, які падпісаў Пратакол.

ПРАТАКОЛ №2

пра надзяленьне Эўрапейскага Суда па правах чалавека кампэтэнцыяй выносіць кансультатыўныя заключэньні

Дзяржавы-ўдзельніцы Рады Эўропы, якія падпісалі гэты Пратакол:

улічваючы палажэньні Канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў, падпісанай у Рыме 4 лістапада 1950 году (далей называнай «Канвэнцыя») і, у прыватнасьці, артыкула 19, які ўстанаўлівае нароўні зь іншымі органамі Эўрапейскі Суд па правах чалавека (далей называны «Суд»);

улічваючы мэтазгоднасьць надзяленьня Суда кампэтэнцыяй даваць кансультатыўныя заключэньні пры выкананьні пэўных умоваў;

дамовіліся пра наступнае:

Артыкул 1

1. Суд можа на запыт Камітэту Міністраў даваць кансультатыўныя заключэньні па прававых пытаньнях, якія датычаць тлумачэньня Канвэнцыі й Пратаколаў да яе.

2. Такія заключэньні не закранаюць любых пытаньняў, якія тычацца зьместу альбо аб'ёму правоў і свабодаў, вызначаных у Разьдзеле I Канвэнцыі й Пратаколаў да яе, альбо любых іншых пытаньняў, якія Камісія, Суд альбо Камітэт Міністраў могуць запатрабаваць да разгляду з прычыны любога разьбіральніцтва, якое можа быць распачатае ў адпаведнасьці з Канвэнцыяй.

3. Рашэньне Камітэту Міністраў запытаць кансультатыўнае заключэньне Суда прымаецца дзьвюма трацінамі галасоў прадстаўнікоў, якія маюць права засядаць у Камітэце.

Артыкул 2

Суд вырашае пытаньне пра тое, ці адпавядае запыт аб кансультатыўным заключэньні, пададзены Камітэтам Міністраў, ягонай кансультатыўнай кампэтэнцыі, вызначанай у артыкуле 1 гэтага Пратаколу.

Артыкул 3

1. Для разгляду запытаў аб кансультатыўным заключэньні Суд праводзіць пленарнае паседжаньне.

2. Кансультатыўнае заключэньне Суда мусіць быць матываваным.

3. Калі кансультатыўнае заключэньне цалкам або часткова не выяўляе аднагалоснай думкі судзьдзяў, то любы судзьдзя мае права прывесьці сваё асабістае меркаваньне.

4. Кансультатыўныя заключэньні Суда накіроўваюцца Камітэту Міністраў.

Артыкул 4

Паўнамоцтвы Суда пашыраюцца на ўстанаўленьне такіх правілаў і на вызначэньне такой працэдуры, якія Суд палічыць неабходнымі дзеля мэтаў гэтага Пратаколу.

Артыкул 5

1. Гэты Пратакол адкрыты для падпісаньня дзяржавамі-ўдзельніцамі Рады Эўропы, якія падпісалі Канвэнцыю й якія могуць стаць ягонымі бакамі наступным чынам:

a) падпісаньне без абгаворкі адносна ратыфікацыі альбо прыняцьця;

b) падпісаньне з абгаворкай адносна ратыфікацыі альбо прыняцьця з далейшай ратыфікацыяй альбо прыняцьцем.

Ратыфікацыйныя граматы альбо дакумэнты аб прыняцьці здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы.

2. Гэты Пратакол уваходзіць у сілу, калі ўсе дзяржавы-ўдзельніцы Канвэнцыі стануць бакамі Пратаколу ў адпаведнасьці з палажэньнямі пункту 1 гэтага артыкула.

3. З дня ўступленьня Пратаколу ў сілу артыкулы 1-4 лічацца неад'емнай часткай Канвэнцыі.

4. Генэральны сакратар Рады Эўропы паведамляе дзяржавам-удзельніцам пра:

a) любое падпісаньне без абгаворкі адносна ратыфікацыі альбо прыняцьця;

b) любое падпісаньне з абгаворкай адносна ратыфікацыі альбо прыняцьця;

c) здачу на захаваньне любой ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці;

d) дзень уступленьня гэтага Пратаколу ў сілу ў адпаведнасьці з пунктам 2 гэтага артыкула.

У сьведчаньне гэтага ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі гэты Пратакол.

Зьдзейсьнена ў Страсбургу ў шосты дзень траўня 1963 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які здаецца на захаваньне ў архіў Рады Эўропы. Генэральны сакратар накіроўвае засьведчаныя копіі кожнай дзяржаве, якая падпісала Пратакол.

ПРАТАКОЛ №4

пра забесьпячэньне некаторых іншых правоў і свабодаў, акрамя тых, якія ўжо ўключаныя ў Канвэнцыю й Пратакол №1 да яе 14/

Урады, якія падпісалі гэты Пратакол, зьяўляючыся чальцамі Рады Эўропы,

поўныя рашучасьці зрабіць захады да забесьпячэньня калектыўнага выкананьня некаторых правоў і свабодаў, акрамя тых, якія ўжо ўключаныя ў Разьдзел I Канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў, падпісанай ў Рыме 4 лістапада 1950 году (далей называнай «Канвэнцыя»), і ў артыкулы 1-3 Пратаколу №1 да Канвэнцыі, падпісанага ў Парыжы 20 сакавіка 1952 году,

дамовіліся аб наступным:

Артыкул 1

Ніхто ня можа быць пазбаўлены свабоды толькі на той падставе, што ён ня ў стане выканаць якінебудзь дамоўны абавязак.

Артыкул 2

1. Кожны, хто законна знаходзіцца на тэрыторыі якой-небудзь дзяржавы, у межах гэтай тэрыторыі мае права на свабоднае перамяшчэньне й свабоду выбару месца жыхарства.

2. Кожны чалавек мае права пакідаць любую краіну, уключаючы сваю ўласную.

3. На выкананьне гэтых правоў ня мусіць накладацца ніякіх абмежаваньняў акрамя тых, якія прадугледжаныя законам і неабходныя ў дэмакратычным грамадзтве ў інтарэсах дзяржаўнай бясьпекі альбо грамадзкага спакою, дзеля падтрыманьня грамадзкага парадку, дзеля папярэджаньня злачыннасьці, аховы здароўя й маральнасьці альбо для абароны правоў і свабодаў іншых асобаў.

4. Правы, выкладзеныя ў пункце 1, могуць таксама, у пэўных сфэрах, падпадаць пад абмежаваньні, якія ўводзяцца ў адпаведнасьці з законам і спраўджваюцца грамадзкімі інтарэсамі ў дэмакратычным грамадзтве.

Артыкул 3

1. Ніхто ня можа быць высланы, індывідуальна альбо калектыўна, зь дзяржавы, грамадзянінам якой ён зьяўляецца.

2. Ніхто ня можа быць пазбаўлены права на ўезд у дзяржаву, грамадзянінам якой ён зьяўляецца.

Артыкул 4

Калектыўная высылка іншаземцаў забараняецца.

Артыкул 5

1. Любы Высокі Дамоўны Бок можа падчас падпісаньня або ратыфікацыі гэтага Пратаколу альбо ў любы іншы час пасьля гэтага накіраваць Генэральнаму сакратару Рады Эўропы заяву аб межах сваіх абавязкаў адносна прымяненьня гэтага Пратаколу да такіх названых тэрыторыяў, за міжнародныя адносіны якіх Высокі Дамоўны Бок нясе адказнасьць.

2. Любы Высокі Дамоўны Бок, які накіраваў заяву ў адпаведнасьці з папярэднім пунктам, можа час ад часу накіроўваць наступныя заявы аб зьмяненьні ўмоваў любых папярэдніх заяваў альбо аб спыненьні ўжываньня палажэньняў гэтага Пратаколу ў дачыненьні да любой тэрыторыі.

3. Заява, зробленая ў адпаведнасьці з гэтым артыкулам, разглядаецца як зробленая ў адпаведнасьці з пунктам 1 артыкула 63 Канвэнцыі.

4. Тэрыторыя любой дзяржавы, да якой ужываецца гэты Пратакол з прычыны яго ратыфікацыі альбо прыняцьця гэтай дзяржавай, і кожная тэрыторыя, да якой прымяняецца гэты Пратакол з прычыны заявы гэтай дзяржавы ў адпаведнасьці з гэтым артыкулам, лічацца самастойнымі тэрыторыямі дзеля мэтаў спасылак у артыкулах 2 й 3 на тэрыторыю дзяржавы.

Артыкул 6

1. Высокія Дамоўныя Бакі разглядаюць палажэньні артыкулаў 1-5 гэтага Пратаколу як дадатковыя артыкулы да Канвэнцыі, і ўсе палажэньні Канвэнцыі ўжываюцца адпаведна.

2. Тым ня менш, права індывідуальнага зьвяртаньня, прызнанае заявай, якая зробленая ў адпаведнасьці з артыкулам 25 Канвэнцыі, альбо прызнаньне абавязковай юрысдыкцыі Суда праз заяву адпаведна артыкулу 46 Канвэнцыі, ня дзейнічаюць у дачыненьні да гэтага Пратаколу, калі толькі адпаведны Высокі Дамоўны Бок не зрабіў заяву аб прызнаньні такога права альбо такой юрысдыкцыі ў дачыненьні да ўсіх або любога з артыкулаў 1-4 Пратаколу.

Артыкул 7

1. Гэты Пратакол адкрыты для падпісаньня чальцамі Рады Эўропы, якія падпісалі Канвэнцыю; ён падлягае ратыфікацыі адначасна з ратыфікацыяй Канвэнцыі альбо пасьля яе. Пратакол уваходзіць у сілу пасьля здачы на захаваньне пяці ратыфікацыйных граматаў. У дачыненьні да любой дзяржавы, якая ратыфікуе Пратакол у далейшым, Пратакол уваходзіць у сілу з моманту здачы на захаваньне ягонай ратыфікацыйнай граматы.

2. Ратыфікацыйныя граматы здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы, які паведамляе ўсім чальцам Рады аб ратыфікацыях.

У сьведчаньне гэтага ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі гэты Пратакол.

Зьдзейсьнена ў Страсбургу ў шаснаццаты дзень верасьня 1963 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архіве Рады Эўропы. Генэральны сакратар накіроўвае засьведчаныя копіі кожнай дзяржаве, якая падпісала Пратакол.

Працяг у наступным нумары.

Публікацыя зробленая паводле замовы Рады Эўропы.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Кастусь Рамановіч:

У СБМ я ЗАГАРТАВАЎСЯ Ў САПРАЎДНАГА ПАТРЫЁТА

Прыватная гісторыя

Архіў Найноўшае Гісторыі пачаў атрымліваць адказы на «Апытальнік сьведкі найноўшае гісторыі Беларусі», які быў надрукаваны ў «Нашай Ніве» 7 красавіка 1997 году. Усе адказы вельмі розныя — паводле памераў, эмацыйнасьці, колькасьці фактаў і імёнаў... Але ўсе яны маюць каштоўнасьць як гістарычныя крыніцы. Бо гэтыя адказы сьведчаць, што можа існаваць некалькі ўзроўняў прачытаньня гісторыі — афіцыйны, прыватны, узровень мэдыяў... Названыя ўзроўні прачытаньня могуць вельмі парознаму ацэньваць тыя ці іншыя гістарычныя падзеі, акцэнтаваць увагу на тыя ці іншыя факты. Часам гэтыя прачытаньні супярэчаць адно адному.

Сп. Кастусь Рамановіч даслаў нам адныя з найбольш разгорнутых адказаў на Апытальнік. Ягоныя ўспаміны — гэта ўспаміны беларускага патрыёта, вязьня ГУЛАГу, чалавека зь вялікім жыцьцёвым досьведам. Праз сваю панарамнасьць яны адначасова пацьвярджаюць і руйнуюць стэрэатыпы. Назавем некаторыя сюжэты, апісаньне якіх можа падацца нестандартным: сустрэча Чырвонай арміі заходнімі беларусамі; прыход немцаў у 1941 годзе, немцы надзяляюць зямлёю сялянаў; рэпрэсіі як з боку немцаў, так і з боку партызанаў розных фармацыяў... Прысутны тут часам натуралізм надае гэтым успамінам большую дакумэнтальнасьць.

Сёньня мы публікуем толькі адзін разьдзел з успамінаў Кастуся Рамановіча — з часоў вайны. Цалкам успаміны плянуецца апублікаваць у архівістычным альманаху «Шуфляда».

Алег Дзярновіч

Архіў Найноўшае Гісторыі выказвае падзяку ўсім тым, хто даслаў свае адказы на «Апытальнік сьведкі найноўшае гісторыі Беларусі». Усе гэтыя матэрыялы будуць выкарыстаныя ў дасьледчай і публікатарскай дзейнасьці Архіву.



Для жыхароў Заходняй Беларусі Другая сусьветная вайна пачалася 1 верасьня 1939 году — многія беларусы служылі ў польскім войску.

У нашу вёску ў 1941 годзе нямецкія войскі прыйшлі без адзінага стрэлу, баёў не было. Першыя войскі зьявіліся на матацыклах. Немцы затрымліваліся, размаўлялі зь людзьмі, як маглі. У тым ліку й я іх сустракаў. Памятаю, як я разглядаў спражку на рамяні немца, дзе напісана «Gott mit uns».

Нямецкія самалёты перад прыходам нямецкага войска некалькі разоў бамбілі званы мясцовымі жыхарамі «Вялікі мост» празь Нёман непадалёку ад вёскі Шчорсы. Я зь цікаўнасьцю назіраў за бамбёжкай, і калі самалёты адляталі, бегаў да моста, разглядаў варонкі ад бомбаў і зьбіраў яшчэ цёплыя асколкі. Вёсак немцы не бамбілі.

Савецкія войскі пакідалі без бэнзыну на дарогах свае машыны і далей на ўсход ішлі пешкі — уздагон за нямецкімі матацыклістамі, многія босыя, апранутыя напаўцывільна. Разам зь імі ішлі на ўсход і былыя зьняволеныя, бо «першыя Саветы» ў Заходняй Беларусі пасьпелі панарабіць лягераў для зьняволеных, якіх прымушалі будаваць аэрадромы.

Чырвонаармейцы таксама пераапраналіся ў цывільнае ды ішлі на ўсход пад маркай зьняволеных. Жыхары вёсак кармілі іх чым маглі, і дапамагалі чым маглі. Хавалі ад немцаў. Многія з былых чырвонаармейцаў заставаліся ў вяскоўцаў надоўга, дапамагалі ў гаспадарцы, некаторыя жаніліся. І мой бацька ўзяў аднаго салдата, вучыў яго выконваць сельскагаспадарчыя работы. Доўга ён у нас жыў, усім мы гаварылі, што гэта наш сваяк, такім чынам абаранялі ад немцаў. А потым, як паправіўся ў нас, ён пайшоў дадому на ўсход.

Мы, хлапчукі, разьбіралі кінутыя на дарогах савецкія машыны і прыносілі дахаты розныя цацкі зь іх, напрыклад, ручкі ад дзьверцаў. А дарослыя здымалі скаты з машынаў і рабілі зь іх абутак — галёшы, прыгаворваючы: «Дзякуй Сталіну-грузіну, што абуў нас у рызіну».

У вёсках сяляне абіралі старасту вёскі, цераз якога кантактавалі зь нямецкай уладай (пазьней іх усіх «другія Саветы» арыштавалі). Мой дзядзька па маме Кошар Васіль Макаравіч быў абраны старастам вёскі Краскоўскія Горы. Ён загінуў пазьней у сталінскіх лягерах.

Тыя, хто пры «першых Саветах» пасьпеў уступіць у калгас, пазабіралі сваю маёмасьць з калгасаў і працавалі на сваіх гаспадарках. Безьзямельных немцы надзялілі графскай зямлёй, дадавалі зямлі малазямельным.

Арганізоўваліся беларускія школы. І верасьня 1941 году я пайшоў у 7 клясу Лозкаўскай сямігадовай школы. Маім клясным кіраўніком быў вышэйзгаданы настаўнік Клімец Мікалай.

Усе прадметы выкладаліся выключна на беларускай мове. Расейская мова й літаратура зусім не выкладаліся. У якасьці замежнай была нямецкая мова.

Беларускую мову й літаратуру выкладала нам маладая настаўніца (аднагодак перароскаў-вучняў) Галіна Бузук, якая жыла ў вёсцы Шчорсы. Яе бацька працаваў школьным інспэктарам у раённым мястэчку Любча. Галіна Бузук падбухторыла нас вывучыць на памяць усю паэму «Новая зямля» Якуба Коласа. Тут я адчуў асалоду беларускай мовы. Вывучалі сапраўдную гісторыю Беларусі. Ставілі беларускія п'есы, сьпявалі беларускія песьні, танцавлі беларускія танцы. Ездзілі вазамі ў Любчу са сваімі канцэртамі. Бацькі вазілі сваімі коньмі. У 7 клясе ў мяне зарадзіўся беларускі патрыятызм.

Пасьля заканчэньня 7 клясы 1 верасьня 1942 году я паступіў на І курс Беларускай Настаўніцкай Сэмінарыі ў Наваградку. Тут таксама ўсе прадметы выкладаліся выключна на беларускай мове.

У Настаўніцкай Сэмінарыі стаў сябрам беларускай патрыятычнай моладзевай арганізацыі Саюз Беларускай Моладзі (СБМ). Тут я загартаваўся ў сапраўднага патрыёта Беларусі на ўсё жыцьцё.

Памятаю зьяўленьне партызанаў у лясах. З нашай вёскі забралі ў партызаны хлопца Барыса Ляпешку. Немцы вынішчылі ўсю сям'ю і хату спалілі. Засталася ў жывых толькі адна малодшая сястра Барыса Маня, якой не было дома падчас карнай акцыі. Барыс пазьней загінуў на фронце.

За сувязь з партызанамі немцы арыштавалі майго дзядзьку Аляшкевіча Гальяша Маркавіча і маю цётку па бацьку Аляшкевіч Аляксандру Андрэеўну, пасадзілі ў Наваградку ў турму. Дзядзьку ў турме расстралялі, а цётку вывезьлі ў нямецкі лягер у Польшчу. Хату іх і ўсе забудовы немцы зь вёскі Балотца перавезьлі ў вёску Шчорсы. Цётка з-пад калючага дроту лягера ўцякла і прыйшла да сваёй роднай сястры Анастасіі Самусік, якая жыла ў Замброве Беластоцкай вобласьці, дзе яна хавалася ад немцаў да вызваленьня Польшчы. Майго дзядзьку Самусіка Мікалая (мужа маёй цеткі Анастасіі) немцы расстралялі ў Замброве.

Маімі суседзямі ў вёсцы Лозкі была шматдзетная сям'я па прозьвішчу Жарыч. Бацькі памерлі. Засталіся сіротамі дзеці —старэйшая Нюша (калека), Каця (прыгожая дзяўчына), Алёша, Гена 1926 году нараджэньня і самая меншая Леля. Да Каці ў прымы пайшоў малады хлопец Пеця Тур. Бацькі Пеці (баптысты, бацька — сьвятар баптыстаў у суседняй вёсцы Роскаш) не дазволілі ўзяць шлюб з Кацяй, бо зь беднай сям'і. Нарадзіліся ў Каці ад Пеці дзьве дачкі. У іх і каня не было. Памятаю, як яны смачна елі бульбу ў мундзірах, высыпаную на голы стол.

Пецю і Алёшу забралі ў беларускую паліцыю. Пецю на вясельлі ў суседняй вёсцы Балотца застрэлілі партызаны. Ноччу прыехалі партызаны, застрэлілі Кацю разам зь немаўлём (старэйшая дачка была ў бацькоў Пеці), застрэлілі Нюшу, застрэлілі малалетнюю Лелю. Гены не было дома, ён і цяпер жыве. Лёша потым загінуў у сталінскіх лягерах.

У вёсцы Балотца жыў мой сябра Лёня Ляпешка. Яму партызаны прапанавалі ісьці разам зь імі. Калі ён адмовіўся, дык яны яго застрэлілі. Застрэлілі і бацьку ягонага. Малая дачка абхапіла бацьку, каб выратаваць яго — ёй прастрэлілі далонь. Старэйшая дачка, Люба, вучылася ў Наваградскай прагімназіі, яе дома не было, засталася жывою. Маці не была дома, таксама засталася жывою.

І так, колькі доўжылася вайна ў нашай мясцовасьці, быў «фронт» — днём немцы «шальмавалі», ноччу партызаны. Часта ня ведалі, хто яны — ці партызаны, ці паліцаі, бо ў аднолькавай форме. Партызаны займаліся рабаваньнем: забіралі коней, кароў, сьвіней, кажухі, боты. У майго бацькі кабылу не забралі, бо адна задняя нага была нашмат таўсьцейшая, нібы апухлая. Бацька пакажа гэтую нагу, і кабылу заўсёды бракавалі, хоць яна й не кульгала.

Я амаль кожную нядзелю прыходзіў з Наваградку дадому (25 км) па прадукты харчаваньня. Ноччу вымушаны быў бацькавы боты, якія я насіў, і лепшую адзежу хаваць ад партызанаў. Партызаны мяне чамусьці не чапалі, хоць і ведалі, што я вучуся ў Наваградку. Аднойчы знаёмы партызан выклікаў мяне ў двор і папрасіў прыкурыць. Я дастаў запальнічку, чыркнуў, ён прыкурыў, узяў запальнічку ў рукі — добрая, кажа, і паклаў яе ў сваю кішэню. І цяпер памятаю, як мне было яе шкада.

У мяне асабіста больш партызаны нічога не ўзялі. Але людзі бедавалі ад партызанскіх рабункаў. Калі хто падкажа ім, што ў некага ёсьць, напрыклад, боты, то абавязкова забяруць, а калі не аддаеш, то мардуюць, а то і застрэляць.

Дзейнасьць нацыянальных арганізацыяў, створаных за часамі акупацыі: БНС, БКА, СБМ...

Акрамя названых арганізацыяў у Наваградку была створаная беларуская вайсковая частка Самаахова. У Самаахову вайскоўцы набіраліся мабілізацыяй. Дзейнасьць — назва сама за сябе гаворыць — самаахова. І з маёй вёскі Лозкі ў Самаахове знаёмыя хлопцы служылі. У Наваградку дзейнічала грамадзкая арганізацыя БНС (Беларуская народная самапомач). Пра дзейнасьць зноў жа сама за сябе назва гаворыць. Больш канкрэтна я не магу сказаць.

Самая масавая беларуская патрыятычная моладзевая арганізацыя ў Наваградку, ды й ва ўсёй Беларусі, была СБМ (Саюз Беларускай Моладзі).

Перад стварэньнем СБМ былі наладжаныя дваццацідзённыя курсы для кандыдатаў на акруговых кіраўнікоў, іх намесьнікаў і супрацоўнікаў штабу СБМ.

Штаб СБМ з'арганізавалі ў Менску вясною 1943 году. Шэфам штабу быў прызначаны Міхась Ганько, кіраўнічкай юначак — Надзея Абрамава, намесьніцай яе — Вера Катковіч.

Афіцыйна СБМ быў створаны 22 чэрвеня 1943 году. Я быў шэраговым сябрам СБМ.

Пра папулярнасьць СБМ гаворыць той факт, што толькі за адзін год з 1943 па 1944 г. у яго ўлілося (выключна добраахвотна) каля 100 000 юнакоў і дзяўчат. СБМ у той час ахопліваў у асноўным вучнёўскую моладзь ва ўзросьце 15-17 гадоў, якая займалася пераважна культурна-асьветніцкай дзейнасьцю. Галоўнай прычынай бурнага росту СБМ была ідэя нацыянальнага адраджэньня Беларусі. Такую арганізацыю нельга было ўявіць ні пры панаваньні Польшчы ў Заходняй Беларусі, ні тым больш пры Саветах. Нават нямецкая адміністрацыя насьцярожана сачыла за СБМ, пабачыўшы, зь якім энтузіязмам праводзіліся мерапрыемствы. Сябры арганізацыі мелі своеасаблівую форму: напачатку прыгожа пашытую зь белага даматканага палатна, а потым юнакі насілі крапіўнага колеру, а юначкі — сіняга колеру ў белыя кропелькі. Гальштукі — з даматканых беларускіх паясоў. Чаравікі былі на драўлянай падэшве, якія рабілі вялікі грукат па наваградзкім бруку. На левым рукаве белчырвона-белая павязка з эмблемай у выглядзе ромбу, у якім напісаныя літары СБМ і накрыж рыдлёўка й меч. На галаўным уборы — Пагоня.

Статут СБМ сьцьвярджаў, што мэтай гэтай арганізацыі ёсьць выхаваньне патрыятычных будаўнікоў Новай Беларусі, якія б выраслі ў актыўных народных дзеячоў.

Будучы накірунак выхаваўчай працы арганізацыі — вызваленьне беларускай моладзі ад варожых шкодных уплываў, яе духоўнае адраджэньне. Уся праца акцэнтавалася на патрыятычным выхаваньні моладзі, што павінна было прывесьці да выкараненьня гістарычна зварункаванай паднявольнай псыхікі, да выпрацоўкі грамадзкага абавязку, працавітасьці, шчырасьці, сьціпласьці, павагі да старэйшых. Такі выхаваўчы накірунак нацэлены быў на тое, каб моладзь адчула сваю адказнасьць за лёс і дабрабыт Бацькаўшчыны і заўжды была гатовая служыць і працаваць на карысьць свайго народу.

СБМ ня ўдзельнічаў ні ў ваенных акцыях, ні ў карных, ні ў якіх злачынствах.

Пасьля заняткаў у Настаўніцкай Сэмінарыі мы, сябры СБМ, пашырана вывучалі гісторыю Беларусі, беларускую літаратуру й мову, арганізоўвалі розныя гурткі: маляваньня, сьпеваў, беларускіх нацыянальных танцаў, наладжвалі розныя вечарыны з танцамі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў. Асабліва актыўным арганізатарам вечарынаў быў выкладчык нямецкае мовы Барыс Рагуля. Дабраахвотнікі СБМ падчас летніх вакацыяў заставаліся ў Наваградку ў летніх лягерах, дзе мне вельмі падабалася. Спалі на двухпавярховых ложках. У 6 гадзінаў пад'ём. Бег умывацца ў крынічнай вадзе на замкавай гары. Назад бягом у кашару, адзяваліся, запраўлялі пасьцель, строіліся ў 4 шарэнгі, падымалі на флягшток бел-чырвона-белы сьцяг, сьпявалі гімн «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», сьнедалі (харч прывозілі бацькі зь вёсак). Маршам зь песьнямі ішлі ў лес на нарыхтоўку дроваў для ацяпленьня памяшканьня Настаўніцкай Сэмінарыі зімою. Дровы нарыхтоўвалі ўручную папярэчнымі піламі, сякерамі.

Або ішлі ў горад на разборкі развалінаў пасьля бамбёжкі й рыдлёўкамі рабілі пляцоўку каля будынку Настаўніцкай Сэмінарыі. Былі й вайсковыя цьвічэньні, што мне вельмі падабалася. Пасьля працы або цьвічэньняў маршам зь песьнямі ў лягер.

Вольны час. Вячэра. Сьцяг на флягшток пад каманду «Зважай!» Сьпеў гімну. Адбой.

Летнім лягерам кіраваў Барыс Рагуля. Ён жа арганізаваў ў Наваградку Беларускую Краёвую Абарону (БКА). Гэта быў кавалерыйскі шквадрон. Касьцяком БКА сталі старэйшыя хлопцы III-га курсу Наваградзкай Настаўніцкай Сэмінарыі, у асноўным добраахвотнікі. Негалоснай мэтай БКА была абарона Беларусі як ад немцаў, так і ад камуністаў.

Атрымаўшы пасьведчаньне аб заканчэньні II-га курсу Наваградзкай Настаўніцкай Сэмінарыі вясною 1944 году, я добраахвотна паступіў у першую Беларускую афіцэрскую школу БКА ў Менску, пра якую напісаў былы курсант афіцэрскай школы Кастусь Акула ў кніжцы «Змагарныя дарогі». У афіцэрскай школе мне вельмі падабалася вайсковая навука, нягледзячы на тое, што амаль кожную ноч падчас бамбёжкі Менску па «трывозе» прыходзілася бегчы з казармы ў акопы.

Неўзабаве пасьля прысягі прыйшлося ўсёй школе пешшу адступаць перад надыходам савецкіх войскаў. Немцы ехалі машынамі. Я на хаду ўскочыў у грузавую машыну і зь нямецкімі салдатамі даехаў да Вільні, дзе на чыгуначным вакзале дамовіліся сабрацца ўсёй школай. Дзён зь пяць я чакаў. А потым далучыўся да шквадрону Барыса Рагулі і зь імі дабраўся да Наваградку. У Наваградку на замкавай гары Рагуля, сабраўшы нас усіх, сказаў: «Я вас забраў з Наваградку, я вас і прывёў у Наваградак. А цяпер, хто хоча са мною — пойдзем на захад, а хто хоча — заставайцеся ў Наваградку, разыходзьцеся па дамах». Я застаўся ў Наваградку, не ўяўляў сабе жыцьця безь Беларусі. Пасьля таго, як я выйшаў зь Вільні, некаторыя хлопцы з нашай афіцэрскай школы сталі першымі ахвярамі бамбёжкі віленскага чыгуначнага вакзалу.

Празь некалькі дзён пайшоў пешшу з Наваградку ў сваю вёску Лозкі да бацькоў. Дваццаць пяць кілямэтраў. Ішоў цэлыя суткі, бо якраз прыйшлося прабірацца цераз фронт. Затрымалі мяне немцы: «Чаго ідзеш насустрач Савецкай арміі?» Пасьля кароткага допыту, вобшуку (на мне была вайсковая бялізна з афіцэрскай школы), пераапранаўшы мяне ў замазаныя гноем сялянскія даматканыя штаны, нямецкі афіцэр прыказаў мяне застрэліць. Салдат завёў мяне за гумно ў вёсцы Старыя Нягневічы, ляпнуў лёгенька мяне па шчацэ і адпусьціў жывым. А як вёў мяне на расстрэл, дык я й ня верыў, што ўжо мяне ня будзе, як гэта так — вось я жывы й тут жа мяне няма.

Усю ноч я правёў на полі ў жыце — пад бамбёжкай, пад стрэламі гарматаў, лязганнем гусеніц танкаў, прасуючых поле. Пры такім гармідары я заснуў у жыце пад высокай мяжой і прачнуўся ад цеплыні сонечных промняў і цішыні. Непашкоджаны, у замурзаных рваных штанах я прыйшоў да бацькоў, дзе была ўжо савецкая тэрыторыя.

Прызвалі мяне на дапрызыўную службу ў Любчы. Спалі на падлозе ў пустым памяшканьні, на саломе з блыхамі. Прызначылі мяне камандзірам аддзяленьня, а пазьней камандзірам узводу. Часта адпускалі па дамах са зброяй (зь вінтоўкамі). Зброю выдавалі на рукі на выпадак сустрэчы з адсталымі немцамі, каб мог іх затрымаць і здаць.

Па даведцы за II курс Настаўніцкай Сэмінарыі 1 верасьня 1944 году паступіў на III курс Наваградзкай пэдагагічнай вучэльні. Вучням пэдвучэльні давалі адтэрміноўку (бронь) ад прызыву ў армію.

Амаль усе настаўнікі прыехалі з усходу. Зноў усё выкладалася на рассейскай мове. Арганізаваўся камсамол. Мне ніхто не прапанаваў уступіць у камсамол, і сам я не імкнуўся туды.

У ноч з 13 на 14 сьнежня 1944 году мяне арыштавалі ў інтэрнаце пэдвучэльні. Разам са мною ў гэтую ноч з пэдвучэльні арыштавалі Кастуся Кракоўскага, Сашу Шабана і Міколу Савасьцюка. Пасадзілі нас у наваградзкую турму, што была побач з пэдвучэльняй, у тую турму, у якой немцы застрэлілі майго дзядзьку Гальяша Аляшкевіча. Вялікая камэра бяз нараў з цэментавай падлогай была так перапоўненая, што немагчыма было легчы спаць усім адразу, таму спалі па чарзе.

У гэтай камэры разам з намі сядзеў дырэктар Наваградзкай Настаўніцкай Сэмінарыі Скрабец Пётар Ануфрыевіч. Такі рухавы быў дзядок, заўжды стараўся падхапіць парашу, каб вынесьці яе з камэры. Але мы, маладыя, не давалі яму гэтага выканаць.

Я прасіўся, каб мяне забралі на фронт у штрафную роту. Але мне сказалі: «Нам контрреволюционеры не нужны».

Кастусь Рамановіч

Публікацыя ажыцьцёўленая ў рамках праекту «Адна зямля — Усходняя Эўропа». © Архіў Найноўшае Гісторыі

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Празаічная статуя

Сяргей Астраўцоў

Пасьля выхаду мінулага нумару «НН» адзін знаёмец папракнуў мяне: навошта гэтак шмат пра Леніна, няхай забудзецца, ня згадваецца. Маўляў, разьвянчаньне галоўнага савецкага сьвятога ўжо адбылося і цяпер патрэбны час, каб яго паглынуў нябыт.

Але як забыць, калі Ленін дагэтуль стаіць на пляцах і вуліцах Беларусі? Калі юбілей ягонае рэвалюцыі дагэтуль адзначаецца, як дзяржаўнае беларускае сьвята?

У Вільні на консульстве РБ вісіць аб'ява: «7 ноября консульство не работает в связи с празднованием Дня Октябрьской Революции». Ужо не Вялікай і не Сацыялістычнай, а проста — Октябрьской.

Я разглядаў гэтую аб'яву і думаў пра парадаксальную неадпаведнасьць формы й зьместу. Вось тэкст, набраны на якім-небудзь тайваньскім ці сынгапурскім, але ніяк не савецкім кампутары, надрукаваны на фінскай, а не савецкай паперы, запраўлены ў плёнку на несавецкім апараце. Вось консульства —акуратны будынак колішняга літоўскага дзіцячага садка, які нічым не нагадвае пра савецкія архітэктурныя ідэалы. Вось Вільня, якая калі й дарагая мне, беларусу, то тым, што тут ад Скарыны да сёньня жыла й жыве сапраўдная беларушчына, несавецкая. Вось, нарэшце я, грамадзянін Беларусі, які прыйшоў перааформіць завершаны пашпарт і не магу зрабіць гэта з-за сьвята, якое ня мае ніякага дачыненьня да маіх грамадзянскіх абавязкаў.

Савецкая эпоха так і не стварыла нічога простага, людзкага і зручнага. Заўсёды й паўсюль яна толькі ігнаравала прыватны чалавечы клопат. Чалавек існаваў у атачэньні гігантаў індустрыялізацыі і манумэнтальнай прапаганды, але часта не знаходзіў, дзе перахапіць, затэлефанаваць ці справіць патрэбу.

Мой знаёмец спадзяецца, што помнікі правадыру, якія дагэтуль стаяць на пляцах нашых гарадоў, самі сабою перастануць што-небудзь значыць і заўважацца? Але ж не. Яны дыктуюць нам нашыя ўзаемадачыненьні. Працягвае існаваць ня толькі савецкая форма, але й камуністычны зьмест. Праўда, ён усё больш гратэскавы і нават варты жалю.

Ці ня самае публічнае змаганьне паміж капіталізмам і сацыялізмам адбываецца сёньня ў Беларусі ў сфэры грамадзкіх прыбіральняў. У Менску на Даўгабродзкай я неяк завітаў у яшчэ нядаўна платную ўстанову. Сёньня там у вакенцы касіра сядзіць пажылы чалавек з выглядам старога бальшавіка, перад ім выстаўлены рулён паперы. Над вакенкам надпіс: «Бесплатно». Ня маю сумневу, што заўтра тут зьявіцца іншы надпіс: «Закрыто». Прычына тая самая, што і ў аб'яве на кансуляце РБ у Вільні. Непавага да прыватнага чалавечага клопату.

Пра Леніна сёньня ўжо ня пішуць ні Іван Шамякін, ні дзіцячы пісьменьнік Павал Ткачоў, ні іншыя стваральнікі вобраза правадыра. Бадай адзіны, хто гэтым займаецца сёньня — Сяргей Астраўцоў, у празаічных творах якога па-свойму існуюць Ленін, Дзяржынскі ды іншыя каменныя постаці.

Яшчэ адзін малады літаратар Андранік Антанян прадстаўляе ўжо тое пакаленьне, якое не апісвае камуністычных ідалаў, а змагаецца зь імі. Пра адзін эпізод такога змаганьня і пра будучыню сацыялістычнага рэалізму ён згадвае ў сваіх нататках.

С.П.

Пра Леніна па-беларуску я нічога не чытаў, ні вершыкаў, нічагосьці больш фундамэнтальнага. Уся ленініяна ў нашай літаратуры для мяне абмяжоўваецца чатырма клясычнымі словамі: «Ленін думае пра Беларусь». А што ён думае, я не цікавіўся. Дзякуючы, мабыць, гэткай белай пляме, у мяне з часам паявілася патрэба самому ўзяцца за гэтую, цяпер крыху й паўзабытую тэму, працягнуць традыцыю. У пэўнай ступені, натуральна. Ленінская статуя ў маіх апавяданьнях трапляецца вельмі часта, але фундамэнтальна ленінскай асобай я не займаюся. Нецікава. Дый да мяне ўсё было зроблена.

Ня ўсе пісалі пра Леніна і партыю. Мы ведаем, хто не пісаў. Сапраўдны гарт. Але ж — залацінка ў беларускім пяску. Чаму пісалі іншыя, праслаўлялі? Магчыма, нехта пісаў, бо ня мог пазбыцца адчуваньня таго, што ўсё гэта будзе вечна. КПСС, СССР ды ўсё астатняе. Некаторыя, напэўна, выклікалі ў сабе пры гэтым шчырае пачуцьцё, каб напісаць якасна. Некаторыя рабілі звычайную халтуру, бо іншага ня ўмелі, а на яе быў попыт.

Я разумею, што сама тэма гучыць як бы гістарычна: Ленін у беларускай савецкай літаратуры. Што гэта, маўляў, такое? У які кут гэта кінуць ці на якую паліцу пакласьці? Але, здаецца, яшчэ зарана ставіць кропку.

Псыхалягічна — для мяне — усё, што за Воршай, далей за якую я ня езьдзіў, — чужая краіна зь ейнымі ленінамі ды ўсім іншым. Але ўгодкі ленінскай рэвалюцыі — дзяржаўнае сьвята ў Рэспубліцы Беларусь. Аграмадны Ленін стаіць у маім горадзе на пляцы, і гэта амаль адзіны рэальны помнік. Пасьля першага сьнегу я іду да яго, бачу ўсяго ў сьнежках і гэта, можна сказаць, уздымае мой творчы настрой. Ленін па-ранейшаму застаецца ў нашым жыцьці. Можна гэтага не заўважаць, а можна і рэагаваць, крыху інакш, вядома, чым калісьці.

Ён атрыбут нашага часу разам зь зялёнымі далярамі, неахайна сінімі

Андранік Антанян

«Пісьцік» зарачанскага

Здымак Ігара Саўчанкі

Калі тое было? Мусі гадоў шэсьць таму. Калі Літва ў чарговы раз у гэтым стагодзьдзі абвесьціла пра сваю незалежнасьць, а савецкія войскі ўсё яшчэ стаялі ў Вільні, і пакуль яшчэ не атрымалі каманды душыць людзей танкамі. Адзіным, што ў тыя дні нагадвала пра знаходжаньне варожай арміі ў сталіцы ўжо незалежнай, але нікім не прызнанай дзяржавы, былі вайсковыя патрулі, якія хапалі на вуліцах усіх маладых людзей прызыўнога веку, што трапляліў поле іхнага зроку. Чаго тады я прыехаў у Вільню, узгадаць сёньня ўжо складана. Цалкам магчыма, што зрабіў я гэта бяз дай-патрэбы. Проста склаў заплечнік, пакінуў бацькам цыдулку й паехаў сабе ў Вільню. Аўтаспынам, вядома. У 16 гадоў вельмі проста ўзяць зубную шчотку ды зьмену бялізны й зьехаць у няблізкі сьвет. Кавы ў «Ledaine» папіць.

Начаваў я ў сквоце на вуліцы Зарэчнай 2. Шмат хто тады зьбіраўся ў згаданым дворыку. Аўтаномія гэтая йснуе й па сёньняшні дзень, не такая шматлюдная, праўда. Сем гадоў таму зарачанская багема толькі й размаўляла пра блізкую сьмерць Савецкага Саюзу, і кожны прапаноўваў свой варыянт сьмяротнага ўдару пад дых імпэрыі. Звычайна плянавалі запусьціць мурашоў у будынак ЦК Літоўскай Кампартыі, зрабіць публічнае самаспаленьне на Чырвонай плошчы ў Маскве і г.д. Вядома, зьдзяйсьняць гэтыя дзёрзкія й небясьпечныя для здароўя намеры ніхто не зьбіраўся. Багема, размовы, прыгожыя позы.

Адзіную дапасаваную да рэальнага стану рэчаў прапанову нарадзіла на сьвет божы мая сяброўка Аўшра. Зрабіла гэта яна тады, калі йшлі разам паглядзець, што засталося ад Бэрнардынскіх могілак. Яна сказала прыкладна наступнае: «Савецкі Саюз гэта такі Кашчэй Неўміручы. Сьмерць ягоная ў іголцы. Іголка ў качцы. Качка сярод іншага брохла ў куфэрку. А куфэрак гэты, як мне здаецца, знаходзіцца тут, на Зарэччы, і называецца «Музэй Ф.Э.Дзяржынскага», а іголка — цьвік музэйнай экспазыцыі — асабісты рэвальвэр першага й самага галоўнага чэкіста. Наша задача скрасьці яго й патапіць у Вялейцы». Мне спадабалася хада думак Аўшры. Мне было шаснаццаць гадоў. Маім любімым пэрсанажам беларускай гісторыі быў Кастусь Каліноўскі, а музэі ўжо тады я недалюбліваў. Яшчэ я быў закаханы ў Аўшру й сэмантычны зьмест фразэалягічнага выразу «ня ўпасьці тварам у бруд» разумеў крыху шырэй чым цяпер.

Плян наш быў просты — зайсьці ў музэй пад маркаю сьціплых маладых людзей зацікаўленых гісторыяй рэвалюцыйнай барацьбы, зайсьці ў залю, дзе быў выстаўлены «пісьцік» зарачанскага Фэлюся, я разьбіваю адным ударам малатка шкло вітрыны, Аўшра хапае пісталет і мы бяжым уверх дварамі па Падрэчнай у бок Галяндэрскай да крэматорыю, а там ужо пачынаецца лес...

Адкладаць вырашэньне праблемы йснаваньня СеРуСеру ня сталі, проста зарулілі дахаты па малаток. Неспадзяванкі пачаліся пасьля таго, як я сапраўды адным ударам расквасіў шкло пад якім ляжаў пісталет колішняга віленскага гімназіста Фэлікса Дзяржынскага. Спрацавала сыгналізацыя, гэтая акалічнасьць мяне так перапудзіла, што малаток высьлізнуў з рукі. Сьляды на месцы злачынства пакідаць не хацелася, але перш чым атрымалася ўхапіць афарбаваную ў чырвоны колер ручку малатка, двойчы давялося са ўсёй моцы сьціснуць у жмені шкляныя аскепкі. Нам усё ж пашчасьціла ўцячы з музэю, праўда, трэба прызнаць, што вечна сонныя біляцёркі ды даглядчыцы не адважыліся чыніць нам перашкоды. І я б на іх месцы ня стаў падстаўляць галаву пад удары малатка непаўналетніх вар'ятаў.

Уцячы дварамі да Галяндэрскай — гучала вельмі надзейна. Але ні Аўшра, ні, тым больш, я ня ведалі ўваходаў-выхадаў, якія яднаюць зарачанскія дамы, і ніякага дзіва няма ў тым, што мы вельмі хутка патрапілі

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

амонаўцамі і вэртыкаляй.

У мяне ёсьць нізка, якая так і называецца: «Апавяданьні вулічнага бюсту». Там ёсьць і Сталін, і Дзяржынскі, але найбольш Леніна. І нават поўны збор ягоных твораў, схаваны турэмным нампалітам у незгаральную шафу ад вязьняў, каб ня ўчытваліся ў сапраўдны зьмест. Ёсьць там і пра тое, як ноччу аднаго Леніна —тандэтнага — замянілі на больш сучаснага, адправіўшы старога ў далёкі райцэнтар. Усё гэта адбывалася на маіх вачах. А тое, што гарадзенскія пэнсіянэры зьбіралі подпісы, каб Леніна не выносілі з маўзалею?! Усё гэта для мяне выдатны літаратурны матэрыял.

Нядаўна я трапіў у Сьвіслач. Там пляц перарабляюць, і таму Леніна часова перанесьлі ў іншае месца, пастамэнт новы зрабілі. І атрымалася, што цяпер стаіць Каліноўскі, насупраць салдат савецкі, за ім Леніна паставілі, а ззаду — помнік апошняму дыктатару паўстаньня 63-га году —Рамуальду Траўгуту. Цікава! Прычым сьвіслацкі Ленін настолькі халтурна зроблены, што яго нават у савецкай энцыкляпэдыі не зьмясьцілі. Дзікі, скажоны твар. Паставa, у нашым разуменьні, абсалютна ня ленінская, быццам на амбразуру кідаецца або кліча «Русь к тапару». Я з задавальненьнем яго сфатаграфаваў. Вельмі цікавы Ленін.

У нас на журфаку калісьці кіраваў пісьменьнік дзіцячы адзін. Аднойчы ў гарадзенскай кнігарні я ўбачыў чатыры ці пяць розных, прычым сьвежых, ягоных кніжак пра Леніна, і па-беларуску, і па-расейску. Гэта ўжо Беларусь зрабілася незалежнай... Прачытаў днямі нататкі аднаго народнага, як ён з гонарам дарыў італьянскім рабочым значкі зь ленінскім партрэтам. Успомнілася: «Але ж гэта наша родзіна, сынок». Нейкая моладзь апошняга 7-га лістапада спаліла перад статуяй, зробленай Азгурам, нідзе не зарэгістраваны сьцяг зь сярпом і молатам і паставіла да ленінскіх ног плякат: «Лепей бы ты сам жыў, чым тваё вучэньне». Значыцца і моладзь пра яго памятае.

Вось і даводзіцца пісаць, адлюстроўваць наш цікавы час. Натуральна, пішу я не пра жывога Леніна, як рабілі да мяне, а толькі пра статуі ягоныя. Але яны таксама нешта там сабе думаюць, рухаюцца нават, калі ёсьць патрэба, ствараюць антураж.

Фэлюся

ў тупіковы двор. Адседжвацца давялося на гарышчы аднаго трохпавярховіка. «Пісталет Дзяржынскага» на самой справе аказаўся звычайным муляжом, месца якому ў краме дзіцячых цацак або на складзе школы з мастацкім ухілам. Міліцыі-паліцыі чуваць не было. Аўшра, як у Галівудзкіх кінах, адарвала кавалак тканіны ад сваёй кашулі й перавязала мне скрываўленую руку. Люба прыгадваць гэтую сцэнку. Яшчэ яна казала, што краіна, дзе музэі замест рэальных рэчаў, сымбаляў эпохі, перахоўваюць халтурна зробленыя муляжы, ня мае будучыні, і як бы там ні было, усё савецкае мастацтва, увесь гэты сацрэалізм, неўзабаве ператворыцца ў паскудную вытворчасьць муляжоў. Думкі не такія ўжо арыгінальныя, асабліва калі ўлічыць, што тады мая сяброўка чытала перачытвала «1984» Оруэла.

А я ў той дзень, на трывіяльным, заваленым гнілым рызьзём ды засцаным катамі зарачанскім гарышчы прыйшоў да высновы, што рэчы, сапраўды датычныя да гісторыі, не даходзяць да рук музэйшчыкаў. Дзе можна памацаць вяроўку, на якой павесілі Каліноўскага, палёгаць у руцэ бомбу Пуліхава, ці пагартаць лемантар, па якім так і не навучыўся пісаць па-расейску без памылак Вацак Ластоўскі?

Ашмётак запэцканай крывёю клятчастай анучы даўно, мусіць, згніў на тым сьмярдзючым падстрэшшы. Толькі шнары на маёй левай далоні засталіся. Сапраўдныя шнары. У Фэлікса Эдмундавіча Дзяржынскага, магчыма, ніколі не было пэрсанальнай зброі. А што да вытворчасьці муляжоў, то ёю ня грэбуюць сёньня беларускія музэі і спадзяюся, што ад іх дзейнасьці не залежаць пэрспэктывы беларускага руху й далейшыя шляхі разьвіцьця беларускага мастацтва.

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст.

Новы супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на зьмененых хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

Адсутнасьць кантэксту культуры — гэта адсутнасьць глябальных арыенціраў нацыі. Яна нявечыць нашае жыцьцё і на вялікім і на малым узроўні. Беларусь нібыта сьцьвярджае сябе як незалежная дзяржава, але дзеля чаго гэта робіцца, дзеля чаго тая незалежнасьць — разумее ня кожны. Людзі не задумваюцца над тым, што сувэрэнітэт патрэбны для самабытнага існаваньня нацыі, бо менавіта ў самабытным існаваньні нацыя найлепшым чынам рэалізуе свой патэнцыял, уладкоўвае жыцьцё ў адпаведнасьці са сваімі прыроднымі рысамі характару. Калі народ існуе ў культурным кантэксьце, яму не прыходзяць у галаву розныя самаедзкія, дзікунскія ідэі, ён не азлоблены, а прагны да творчасьці і працы.

Кожную нядзелю на хвалях Радыё Свабода паводле абноўленага раскладу:

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Новыя Хвалі, Пастаянны Час,
Нязьменная Свабода
(ад 26 кастрычніка 1997)

Час	K/Hz	Хвалі
18.00 - 19.30	6170	49
	7155	41
	7295	41
22.00 - 23.30	6095	49
	6170	49
	7155	41
	9750	31
06.00 - 07.00	5995	49
	7295	41
	9750	31

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 У 22.00 беларускую праграму можна слухаць у Інтэрнэце: http://www.rferl.org/bd/be/index.html

Заставайцеся са Свабодай!

За болевым парогам

Фальклёр у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў. — Менск: Навука і тэхніка, 1997. Сэрыя «Беларуская народная творчасьць».

Кніга «Фальклёр у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў» нядаўна выйшла ў акадэмічнай сэрыі «Беларуская народнай творчасьць». Усе творы запісаныя ў пачатку мінулага стагодзьдзя і зьяўляюцца першакрыніцай сьведчаньняў пра тое, што было з нашай краінай і нашымі продкамі амаль дзьвесьце гадоў назад, калі Беларусь была захопленая Расеяй, але яшчэ ня страціла свайго ўласнага аблічча.

На жаль, для многіх сучасных беларусаў такая кніга — як бы за болевым парогам. У галовах усё яшчэ сядзіць тэза пра тое, што да 17-га году гэта была дзікая краіна, дзе панавала бязьлітасная эксплуатацыя, а чарназемны народ у аборах і з каўтуном у галаве сядзеў па зямлянках. І толькі рэвалюцыя вызваліла яго з жабрацтва і цемнаты. Уся гісторыя да 17-га году нібы адрэзаная хірургічным спосабам. Гэта значыць, чалавек не праектуе яе сьведчаньні на сваё ўласнае жыцьцё. Бо да рэвалюцыі не было нічога. А калі што й было, то да нас або да нашага жыцьця гэта ня мае ніякага дачыненьня. Гэта —казкі, прыгожыя прыдумкі. А калі не прыдумкі, то што тады нам усім трэба зрабіць з сабою, які перажыць грандыёзны пераварот уяўленьняў пра сябе і свой край, фактычна — перарадзіцца.

У новым выданьні фальклёру з запісаў Чачота і братоў Тышкевічаў кідаецца ў вочы высьмейваньне няздараў і ўсялякай бядоты! Тут няма працяглых журботных песень пра тое, што няма чаго есьці, няма ўва што абуцца. Такія песьні зьявяцца пазьней. У гэтых жа няма ні лапцей, ні каўтуна. А вось казловых боцікаў ды шаўковых хустачак — колькі заўгодна.

Тут амаль пануе сацыяльны мір. Часам можна падумаць, што гэтыя песьні складаліся панамі. І толькі род заняткаў — жніво, касьба і г.д. выдае, што панамі выглядаў наш працоўны люд.

Кідаецца ў вочы і мір рэлігійны, ці, можа, рэлігійная непрынцыповасьць. «Ды няма ксяндза дома, Ды паехаў да Альбова Ключыкі купаваці, Цэркаўку адмыкаці». Цэркаўку адмыкае ксёндз.

Геаграфія ў песьнях — уся Беларусь, часта сустракаецца Вільня — хутчэй ідэальны, чым рэальны беларускі горад. Гэтаксама як і найбольш частая рака — Дунай — ідэальная беларуская рака.

Імёны таксама мяшаныя — каталіцкія і праваслаўныя: Казюшка і Андрэйка, Юрась з Габрусём, Гарыслаўка і Яначка, Настулька, Ульлянка і Люсечка, Барыска, Кузёмка ды Анатолька, Адолька, Славачка і Тамашок. Суфіксы пераважна памяншальныя. Гэтаксама ласкава апяваюцца і побыт і прырода і абрадавыя сьвяты. Гэтыя бязьбедныя людзі, паселеныя Богам у бязьбедным краі мелі клопаты хіба што псыхалягічнага характару, зьвязаныя з дачыненьнямі ў сям'і або на глебе п'янства і глябальнымі філязофскімі праблемамі.

Чамусьці бяз дай прычыны мне ўсё гэта пачынае нагадваць фільмы Бергмана, дзе чалавека турбуюць не праблемы быту, а праблемы быцьця. Гэткаю паўстае Беларусь зь песень пачатку XIX ст. Зусім Эўрапейская краіна, ужо анэксаваная Расеяй, але яшчэ не разбураная, не абрабаваная, яшчэ жывая. Адзінае, бадай, сьведчаньне новай рэальнасьці — рэкруцкія наборы ў расейскую армію, якія зь песень паўстаюць сапраўднымі аблавамі на моладзь.

Своеасабліва гучаць у песьнях патрыятычныя матывы, амаль невядомыя нам у пазьнейшых песьнях:

Старана мая, староначка,
Не магу цябе пазабыці,
Ды ні ўдзень ходзячы,
А ні ўначы сплючы.

Увогуле радзіма зьвязваецца ня столькі з краем, колькі з родам, зь сям'ёю.

Усё, што было пасьля, — быў гвалт прыхадняў і змаганьне патрыётаў менавіта за гэтыя традыцыйныя падмуркі існаваньня. «Нашы дзяды ня зналі бяды, але ж унукі набраліся мукі». —Запісаў Яўстафі Тышкевіч у Барысаўскім павеце ў пачатку мінулага стагодзьдзя. Аналіз беларускае гісторыі падказвае, што такая прыказка суправаджае нашую нацыю на працягу ўсяго ейнага існаваньня. Маўляў, усё прайшло мінула, няма таго, што раньш было. Няма — гэта праўда, але няма не фатальна, а таму што лепшае жыцьцё ў Беларусі сёньня трэба ў вялікім і малым адбудоўваць з нуля. Толькі мала хто ведае, паводле якіх узораў. Новая кніга «Фальклёр у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў» такія ўзоры дае.

Крыт.

«Іхная» справа

Więź: Białorusini o nas. Białorusini o sobie. — 1997, Nr.9 (467)

«Хіба насамрэч патрэбныя крывавыя падзеі за бліжэйшай усходняй мяжою, каб мы прысьвяцілі Беларусі крыху болей увагі?» — задае пытаньне польскі месячнік WIĘŹ, прысьвечаны амаль цалкам сучаснай беларускай праблематыцы. Адказам, пэўна, мусіць быць сам факт зьяўленьня беларускага нумару.

Падбор матэрыялаў зроблены з ужо апублікаванага раней у беларускім ці расейскім друку. Гэта артыкулы Анатоля Майсені, Алеся Туровіча, Уладзімера Падгола, Натальлі Пятровіч, інтэрвію зь Юрасём Хадыкам, Станіславам Багданкевічам, айцом Янам Матусевічам, вершы (з паралельным перакладам на польскую) Натальлі Арсеньневай, Славаміра Адамовіча, Анатоля Сыса, Алеся Анціпенкі ды іншых. З польскага боку іх дапаўняюць рэпартаж Магдалены Ярэцкай («Плянэта Менск»), сацыяпсыхалягічны опус Рышарда Радзіка аб пераменах ва ўзаемаўспрыманьні беларусаў і палякаў на працягу дваццатага стагодзьдзя, эсэ пра сучасную беларускую паэзію Чэслава Сэнюха і мэдытацыі на польска-беларускую тэму пад назваю Багдана Скарадзінскага.

Калі згадаць падзагаловак нумару, дык у большасьці ўсё ж будзе «беларусы пра сябе». Гэта, пэўна, найбольш цікава для польскага чытача. Нам жа, бадай, больш цікава, што пішуць, што думаюць «палякі пра нас» — як успрымаецца цяперашняя палітычная, культуральная сытуацыя ў Беларусі польскімі інтэлектуальнымі коламі і непасрэдна палякамі-асобамі. Ужо цытаваны вышэй рэдакцыйны артыкул жорстка канстатуе: «у польскай грамадзкай думцы Беларусь папросту не існуе». Але рэчаіснасьць так ці інакш грукае ў дзьверы і цалкам схавацца ад прысутнасьці расейскай зброі і расейскай палітычнай і эканамічнай экспансіі ў дзьвюх сотнях кілямэтраў ад польскай сталіцы не дапаможа нават NATO. Заплюшчваць вочы на таталітарную яміну пад сваім бокам таксама небясьпечна. Досьвед гэтага паступова прымушае зьвяртаць увагу на «беларускае пытаньне» ў Эўропе нават нашых бліжэйшых суседзяў. Праз культурныя дачыненьні зь незалежнай беларускай інтэлігенцыяй, праз прыватныя кантакты зьмяняецца і стаўленьне на асабовым узроўні. Паказальныя ў гэтым пляне артыкулы тых польскіх журналістаў, якія правялі пэўны час у Беларусі, пажылі «нашым» жыцьцём. «Плянэта Менск» Магдалены Ярэцкай — прыклад ужо пэўнай гераізацыі, рамантызацыі беларускай апазыцыі, якая пачынае набываць (у вачах рэпарцёра) рысы Ваяўнічай Салідарнасьці альбо нават партызанкі ў духу АК.

Але ўсё ж як рэзюмэ сучаснай польска-беларускай сытуацыі можна прывесьці яшчэ дзьве цытаты: першая — з рэдакцыйнага, другая — з артыкула Багдана Скарадзінскага: «Мы яшчэ маем унікальны шанец падтрымкі беларусаў на значна цяжэйшай, чым наша, літоўская ці нават украінская дарозе да незалежнасьці і да Эўропы, у якой Беларусь, у структурах Вялікага Княства Літоўскага, прысутнічала праз стагодзьдзі. І варта той шанец выкарыстаць — таксама дзеля лепш зразумець польскіх нацыянальных інтарэсаў». «Гэта іх, беларусаў, справа, калі яны жадаюць адрачыся мовы, культуры, дзяржаўнасьці».

Вацлаў Арэшка

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ЭПІКОН

Сяргей Конан

Дзень нараджэньня

(Прысьвечана тым, хто змагаецца за чалавека ў сабе. Шыдлоўскаму, Лобачу.)

Не шанцуе Міхасю ў гэтым годзе. Калі вясна была яшчэ нічога, то вакацыі свае ён пачаў з паламаную рукою — зваліўся з даху паветкі. Вышыня была ня вельмі, але ён няўдала зваліўся на руку, і — хрась. Болю, праўда, спачатку не адчуваў, потым — шок. Добра, што сусед быў дома, хуценька адвез у шпіталь, там здымкі зрабілі і параўнялі косткі, гіпс наклалі. Амаль два месяцы марокі.

І зараз яшчэ рука ныe час ад часу, бо сыра, вада капае са столі. Вось у такіх умовах сёньня сустракае ён свае дваццаць другія ўгодкі. Ён чамусьці верыў, што пасьля гэтага дня ўсё будзе па-іншаму, і тое, што прыносіла боль, будзе дараваць радасьць, далёкае стане блізкім.

Але сёньня вада крапле на твар, ніхто не павіншуе, і сьледчы ня скажа: «Ідзі, хлопец, дадому». Вось ужо пяты тыдзень Міхась сядзіць у СІЗО роднага горада. Ён пісаў лёзунгі — балёнчык зь нітрафарбай, цёмная ноч, вось і ўсё, што трэба было. «Ганьбіў уладу, заклікаў да зьвяржэньня законнай улады» — так запісаў сьледчы.

«Дзядзька, ты — манюка».

Міхась ні ў чым не прызнаваўся. Стаяў на сваім: гуляў ноччу па вуліцах, хацеў убачыць тых, хто піша лёзунгі на сьценах, знайшоў адзін са сьвежых надпісаў, падыйшоў. Побач валяўся балёнчык, узяў у рукі, націснуў — фарбы не было. Раптам зьявіліся міліцыянты, патруль. Спалохаўся, схаваўся за рог, але рука правая, паламаная, толькі месяц як бяз гіпсу, выпусьціла балёнчык, і той гучна, па-здрадніцку, загрымеў па бруку. Ён як бы казаў: «Я тут».

Бегчы не было куды. Яго арыштавалі, дакладней, завялі ў пастарунак, запёрлі на ноч зь нейкім п'янчугам.

З раніцы — сьледчы, на другі дзень — абвінавачваньне. Усе лёзунгі, што былі напісаныя дагэтуль, павесілі на яго і пачалі выкрываць злачынную групу.

Допыт за допытам:

— Усё, ты тут згінеш, выйдзеш потым праз тры гады, руку адпілуюць, будзеш атрымліваць інвалідныя капейкі і паміраць, а ня жыць. Малады, без рукі, — шыпеў сьледчы.

— Уяўляеш, маці маладая стане старою — празь цябе. У бацькі пачне балець сэрца. З працы іх звольняць, суседзі ня будуць вітацца, — са слязьмі ў голасе нудзіў сьледчы.

А то й крычаў:

— Яны цябе кінуць, тыя, хто плаціў табе дагэтуль. Яны скарысталі тваю маладосьць, сволачы, празь іх ты гібееш! Ці хто-небудзь заступіўся за цябе?

Міхась то сьцінаўся ўнутрана ад жаху за сябе, то адчуваў, як разрываецца сэрца за маці і бацьку. Але галоўнай была нянавісьць да гэтай істоты, якая зрабіла яго здраднікам. Але Міхась быў упэўнены: можна здрадзіць сабе толькі адзін раз і болей ніколі не знайсьці сябе.

Хочацца свабоды —

(Бяры асадку, пішы імёны, даты, усё, што ведаеш, і ня сёньня-заўтра ты ў мамы, таты, у родным унівэрсытэце. Пішы. Дай сабе волю, зьберажы сваё жыцьцё, пасьля турмы ты ўжо будзеш ня тым.)

— і хочацца быць чалавекам.

Ён плакаў. Змагар за, барацьбіт супраць сядзеў і плакаў. Першы раз за колькі гадоў, і толькі некалькі хвілін — ён вельмі хацеў застацца чалавекам. Міхасём, які любіць свой дом, бацькоў, унівэрсытэт, дарагую Радзіму, дзеля якой на сьценах чыталася «Дзядзька — ты манюка».

— Ты ня ведаеш, турма — не СІЗО, там зьвяры, ты ўпадзеш на дно, ты слабак, ты будзеш у брудзе.

«Слабы» Міхась пяты тыдзень змагаўся, думка скарыцца здавалася сьмешнай. Скарыцца — гэта памерці і далей проста быць.

Міхась хацеў жыць чалавекам.

Два месяцы ў яго не было рукі — толькі гіпс, але ён змог прызвычаіцца і нармальна жыць. Цярпець і нармальна жыць. Галоўнае зараз — цярпець. Ён ужо перажыў першы шок, цяпер лягчэй. Хоць бываюць дні невыносныя. І зьмяя шыпіць, цягне ў руцэ яблык:

— Зьеш, стане лягчэй.

Як цяжка тут. Што там на волі, ці памятаюць пра яго, а, можа, усе забыліся?

Бацькам цяжка, але яны выцерпяць. Ён ня злодзей, не забойца.

~~Ён пісьменьнік~~, што пісаў на сьценах аповесьць свайго жыцьця. Ніводнага слова, толькі: «Дзядзька — ты манюка». Гараджане чыталі, муляры зафарбоўвалі, але ўсё больш людзей ведалі, хто — манюка.

Міхась адзначыў сабе 44 гады, 22 гады — палова. Першая была нешчасьлівая, другая будзе іншай. Заўтра будзе другое жыцьцё. Але якая радасьць у бэтонным мяху?

— Сырасьць цябе даканае, я магу трымаць цябе тут год. Пішы, пішы, пакуль не аднялася рука.

Міхась маўчаў і ня слухаў. Ён ужо вывучыў усе словы, бо так было зь дня ў дзень. Раптам думкі Міхася перарваў бразгат:

— Каленік, на выхад да сьледчага.

Па калідоры. Габінэт. Стол.

— Сядай, недарэка. Хачу апошні раз прапанаваць — пішы, а то я зараз захлопну папку, і ўсё, ты пойдзеш у суд, а потым па этапе ў глуш, дзе холад, сьнег і завірухі.

Сьледчы выяўляў добры настрой і свае літаратурныя здольнасьці. А ў вачах былі халодныя калючкі, якія ўпіваліся ў падсьледнага:

— Я справу зьбіраюся накіроўваць у суд. Табе гадзіна. Думай, а я выйду.

Міхась абудзіўся. Суд. Колькі дадуць. Няўжо на ўсю. Колькі гадоў вон. Шкада, шкада маладых гадоў, але я хачу быць чалавекам.

Праз гадзіну вярнуўся сьледчы і зашыпеў:

— Не напісаў? Дурань.

Раптам неяк зьніякавеў і стомлена вымавіў:

— Радуйся, справу тваю закрываю і ў архіў. Пакуль. Надта шумны ты, за цябе так крычалі на вуліцах. Ну нічога, мы яшчэ дабярэмся да цябе.

Міхась уважліва паглядзеў у халодныя вочы і ціха запытаў:

— А вы ведаеце, як быць чалавекам? Думаю, не. Магчыма, з нараджэньня вы былі слугою д'ябла, а я хачу проста быць чалавекам.

Міхась у апошні (?) раз ідзе па калідоры, дзе хадзіў 33 дні, дзе сустрэў 22-я ўгодкі.

І вось пачалася другая палова ягонага жыцьця. Ён ведае, што трэба пісаць зараз:

«Дзядзька, ты — баязьлівец».

Расчыніліся дзьверы. Міхась выйшаў на вуліцу. Ужо была зіма, халодныя сьняжынкі кружлялі, падалі і кроплямі вады сьцякалі па твары, але адчувалася лёгкая прыемнасьць.

Холад абуджаў і клікаў за сабою ў замець бялюткіх сьняжынак.

Дзяніс Лісейчыкаў

Герэтык

Упаў Ён. Нічога цікавага, праўда? Вось і я кажу: звычайнае здарэньне. А сябры гавораць: «Напішы пра гэта, усіх зацікавіць!» Я адмаўляўся, адмаўляўся, а пасьля думаю: а чаму б, праўда, і не напісаць? Хоць на самой справе я падумаў інакш крыху: «Каб вас халера пабрала, вось жа і напішу!» Гэта так, для дакладнасьці.

Ну, пачнем спачатку.

Было нас сямёра, і ўсе — хлопцы. Мы заўсёды трымаліся адзін аднога, усё рабілі супольна. Але, сказаць па праўдзе, самым разумным зь іх быў я. Сябры чамусьці гэтаму ня верылі, і выйшла так, што абралі лідэрам нашае кампаніі Яго, а не мяне. Ды й сьмех сказаць чаму. Іх вельмі ўразіла тое, што Ён можа хадзіць па сьценах. Як даведаліся, то ледзьве не Мэсію з хлопца зрабілі. Ужо й ідзі наконт стварэньня новае рэлігіі пайшлі. Я адразу сьмяяўся, кпіў зь сяброў, — дзіва знайшлі! Кажу: «Хлопцы! Ды які ж Ён Бог! Ён жа проста самазванец! Ён жа больш анічога рабіць ня ўмее, апрача сваіх альпінісцкіх практыкаваньняў. Я ж вам даўно кажу, што вера — ў ведах і розуме. А сярод вас я разумнейшы, я — ваш Бог!» Яны зарагаталі, а адзін сказаў: «Вера бяз цудаў — голая тэорыя!» Я плюнуў. Чорт з вамі! Але жарцікі жарцікамі, а Ён паверыў у сваю звышнатуральнасьць. А зьмяніўся як! Бацюхны сьвет! Ня проста соўгаецца цяпер па сьценцы, а гэтак, ведаеце, паважна, з годнасьцю крочыць. Нават гаварыць неяк па-сьвятому стаў: «Сябры мае! Я з вамі» і г. д. Усё роўна як зьдзекуецца. Але хлопцы мяне недаацанілі, нездарма ж я адразу сказаў, хто з нашае кампаніі разумны самы. Доўга меркаваў я, што рабіць, кнігі розныя чытаў. Ну, нарэшце, прыдумаў. Неяк раз прыходзяць яны ўсе да мяне, запрашаю іх, значыцца, у пакой, а сам не сустракаю. Усе, ведаеце, гэтак па-людзку, па падлозе ідуць, а Гэты па сьценцы. Зайшлі. А тут я з-за люстры выходжу, зрабіў некалькі крокаў па столі: «Дзень добры!» — кажу. Ён — бум! — упаў долу. Яны зьбялелі, падбеглі да Яго, а Ён падняўся, хоча на сьценку ступіць — і ня можа! Ну, я са столі спусьціўся, падбадзёрыў сяброў. Пасьля кавы разам папілі —увогуле супакоіліся. Вось! З гэтага часу звычайным ён стаў. А іхны лідэр цяпер Я. Але зь сябе сьвятога не раблю. Ну, што зробіш, як проста разумны?

Алесь Менскі

Манэты

На кавалку зялёнай тканіны ляжаць маленькія кавалачкі мэталу — манэты.

Я бяру ў далонь па чарзе адзін за адным часьцінкі краінаў, створаныя для вандроўкі па сьвеце. Вось Індыя з хвалістым абрысам, спуджаны аўстралійскі качканос, зіхоткі крыж новай Славакіі.

Я трымаю ў руцэ невыказна агромністыя абшары.

Можа, той, для каго грошы — жыцьцё, проста хоча на нейкі момант адчуць у далоні таемны цяжар сусьвету? Што любіць ён: толькі манэты, сам сьвет ці адчуваньне ўлады?

Што будзем рабіць мы тады, калі падарожным ня будзе куды вяртацца?

Ігар Мітрыч

Варушу мінулае

Мы выйшлі з дому наўпрост у тужлівы кастрычніцкі вечар. Вечар, бо ў вокнах ужо гарэла сьвятло. Вечар, бо гадзіньнік паказваў дванаццаць трыццаць пяць. Ішоў мокры сьнег. Лужыны бруднай вады. Радыкальныя зьмены нявысьветленага маршруту. Шлях да бліжэйшага месца, дзе прадаюць піва, звычайна прасталінейны як хрыбет спараліжаванага. Трохі пазьней узмацнелы мароз захрумсьцеў пад нагамі.

«Вельмі хочацца спаць!» — падумаўшы, крыкнуў я, і прыплюшчыў на хвілю вочы. Вэнтылятар гнаў мне ў грудзі цёплую плынь паветра.

Да галавы нічога талковага не прыходзіць, ужо гады з два. Нягледзячы на тое, што зь пяць хвілінаў таму я прыняў быў халодны душ. Сродак супраць тараканаў не дапамог, сон, раптам апанаваўшы мяне, сон, падхапіўшы і ўкалыхваючы, нікуды не зьнікне. Ведаю.

Запарыў «вторяк», у самоце трываю. На варыўні хораша. У пакоі працуе магнітафон, чуваць музычку. Радыё. Перапынкі на чортавую рэкляму. Трашчаць косткі і над шклянкаю падымаецца пара. Паўсюль прахалода і напалена. Восень.

Людзі, што сабраліся там, весяляцца. Распавядаюць адзін адному анэкдоты. Пра нешта ўзбуджана гамоняць. Чуваць выбухі сьмеху. Аскепкі яго расьцягваюць часам мае вусны. Прычыніўшы дзьверы, я мог бы адгарадзіцца ад іх тонкай перагародкай. Але яна настолькі тонкая, што зробіць шум толькі трохі цішэйшым, і ад таго больш раздражняльным. Застаюся на месцы.



Стаў шмат чытаць. Цікава, з чаго?

Дзьве гадзіны таму прыгатаваў сьціплую вячэру. А зараз хачу спаць. Заўсёды хачу спаць. Проста жах нейкі.

Узгадаў! Учора, праходзячы каля ўкраінскага пасольства, бачыў у натоўпе жаданцаў пранікнуць туды нэгра. Стала да гідкасьці сьмешна. На электрычку я спазьніўся ў той раз.

Мелькам я заўважыў хваравіта адухоўлены твар мянта. Даўна ня бачыў нічога падобнага ў гэтых motherfucker'аў. Напэўна, ня мент.

... Голас знаёмай дзяўчыны. Убачыць альбо пачуць вельмі жадаю. Запрасіць на госьці. Абняць. Вылучыць сьвятло і пацалаваць цемру. Легчы спаць.

Дужа ўсё проста. Заўтра будуць шчы з чвэрці качана капусты. Болей у халадзільніку ні храна няма. Будзем хлябсьці, лапці набуду ля McDonalds'а. У старушкі.

Усё. Адчуваю, як сілы зьнікаюць. Мяняю кружэлку. Слухайце...

Аляксандар Урбановіч

Дыярыюш

***

Адна паненка ня так даўно зрабіла мне вымову: цябе, маўляў, чакалі ажно дзесяць хвілінаў ня толькі тры чалавекі, а яшчэ й МАШЫНА.

***

Большасьць людзей у нас ня проста ня вераць у Бога, але й ня вераць, што можна верыць у Яго.

***

Творчы акт — гэта тое, што можа не атрымацца.

***

Быў у краме Second hand. Трэба вельмі любіць людзей, каб выносіць гэты спэцыфічны саладкаваты пах і працаваць у такой краме.

***

Прадпісаньні па фатаграфіі ня раяць праглядаць нэгатыўную стужку ажно да завяршэньня ўсіх працэсаў ейнае апрацоўкі. Аднак, калі вы ня глянулі на апошні акраец пасьля фіксаваньня, — то вы не фатограф, або здымалі ня тое, што вас цікавіць па-сапраўднаму.

***

Сяджу ў чатырох сьценах? Не, мая кватэра складаецца зусім не з чатырох сьценаў. Так, ёсьць чатыры сьцяны, якія ўтвараюць зьнешнія межы маёй кватэры. Але да іх патрэбна дадаць яшчэ як мінімум тры, якія ўтвараюць спальны пакой, і адгароджваюць яго, адпаведна, ад кухні, ад залі ды ад калідору. І ёсьць яшчэ шмат сьценак драбнейшых, як тое: паміж кухняю ды прыбіральняй, паміж прыбіральняй і лазенкай, паміж калідорам і заляй...

Кожная са сьценаў мае сваю адмысловую гісторыю. Вось гэтая, не сьцяна нават, а ейны ўчастак, частка зьнешняй сьцяны, якая выходзіць на калідор. Некалі, прытуліўшыся, тут стаяла Яна. І хоць шмат прайшло ад таго часу, я нізавошта не змагу зьмяніць тут шпалеры. Я й дасюль бачу: ейны паружавелы твар у акаймаваньні насычанага пунсовага колеру танных «даперастроячных» шпалераў, па тры рублі за трубку.

А во да гэтай сьцяны, паміж спальняй і заляй, мы прытыкаліся толькі з аднаго боку. Спальня тады была для нас ня нашым пакоем, нам было тады дастаткова месца ў залі.

У сьценку паміж прыбіральняй і лазенкай Яна ўпіралася, марна ўхіляючыся ад маіх пацалункаў — з боку лазенкі. А на тле сьцяны паміж заляй і гаўбцом Яна таксама стаяла — і ў мяне ёсьць такі кадар — бо там, бліжэй да вакна, было лепш разглядаць нешта, што было ў Ейных руках — мабыць, таксама фатаграфіі.

А вы кажаце, у чатырох сьценах... Калі хто й сапраўды мусіць сядзець у чатырох сьценах, то я яму, ясна, не зайздрошчу...

Юры Чарнякевіч

Чорныя буслы

Уначы, калі амаль усе сьпяць, я выходжу на вуліцу, каб убачыць сьвятло. Тое сьвятло, якое знаходзіцца ўва мне, і ніколі ня згасьне.

Добра, калі навокал цемра. Падымаю рукі бліжэй да твару і гляджу. Рукі пачынаюць сьвяціцца. Маленькія праменьчыкі пачынаюць выходзіць з пальцаў, але мне чамусьці не баліць. Напэўна, звычка.

Зь цікаўнасьцю, бы зачараваны, гляджу і гляджу на свае рукі, бо ведаю, што будзе працяг гэтае камэдыі. І вось ужо мезенец на левай руцэ пачынае паціху зьнікаць у маўклівым і радасным зьзяньні блакітнаватага колеру. А пасьля зьнікаюць астатнія пальцы, рукі... Напрыканцы застаецца адная галава. Сьмешна, ці ня праўда? Галава ў паветры... Нарэшце зьнікае й яна. Зьнікаю я...

Прывітаньне табе, таварыш па няшчасьці! Калі ты зможаш, выйдзі, калі ласка, сёньняшняй ноччу на вуліцу і ўважліва паглядзі: зьзяюць твае рукі ці не?.. Не? А можа, ты проста забыўся зьняць з вачэй чорныя акуляры, якія не даюць табе бачыць сьвятло? Здымай іх і пабачыш тое, чаго яшчэ ня бачыў: і зьзяньне, і сваё зьнікненьне, і сваё ператварэньне ў таго, хто зараз жыве на гэтай зямлі. Тут жыве чорны бусел.

А мы, дзьве сумныя птушкі, ужо ляцім над нашай цёмнай краінай. Ціша. Ноч. Нам вельмі далёка ляцець. І вельмі блізка. Бо тая мясьціна, да якой мы ляцім, заўсёды з намі, і — быццам ня наша, ня з нашае плянэты, а ўвогуле зь іншага Сусьвету.

Мы прыляцелі. Ты бачыш пустыя вёскі? Яны ёсьць. Ты бачыш людзей? Іх няма. Магчыма, яны паснулі. Як ты лічыш: навечна ці не?

Ты бачыш тое, што і я? Чорныя буслы ў чорным небе. Іх шмат. Іх сотні, тысячы, мільёны... Некаторыя зь іх — жывыя, некаторыя — ужо памерлі, ды пасьля сьмерці зноў вярнуліся сюды, каб лётаць над пустымі вёскамі. Каб быць напамінам.

І мы таксама... Да раніцы.

Сьвітанак... Бывай, браце, бывай! Магчыма, у наступную ноч ты зноў будзеш поруч з намі, магчыма — не. Але прашу цябе: ніколі, ніколі не забывайма на тое, што ты бачыў сёньня. Ніколі...

Чорныя буслы вераць табе, бо акрамя веры ў іх не засталося анічога... Бывай, браце!

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ПАРТУГАЛЬСКІЯ НАВЭЛІ

Марыя Жудзітэ дэ Карвальё

Жыццё і мара

Ён мог стаць камівяжорам, машыністам цягніка або мараком. Аднак ён ня стаў нічым з гэтага, таму што ня мы робім сябе, нас будуюць умовы. Бацька, зразумела, у выніку многіх просьбаў, дамогся, што ўжо ў трынаццаць гадоў яго прынялі ў важны банк, дзе яму далі шэрую форму і месца на будучыню. «Хлопча, дзе ж гэты чэк?», «Хлопча, аднясі гэты ліст сыньёру Сілву», «Дзе ты, хлопча?», «Хло-о-пча!» Ён увіхаўся, вельмі старанна, такі сур'ёзны, прыкладаў усе намаганьні, каб выканаць загад, не разумеючы яшчэ, што ягоныя дбайнасьць і стараннасьць паступова ўблытвалі яго цалкам у галаваломку, зь якой яму ўжо ніколі ня ўдасца вызваліцца. Уначы дома ён праглынаў кнігі Эмілія Сальгары, якія пазычаў яму багацейшы за яго калега. Іншым разам ён гартаў стары атляс, ушчэнт парэпаны і зашмальцаваны, які бацька купіў некалі ў букініста. Але што Адэрыту лініі межаў? Яму хапала неабсяжных блакітных прастораў, гэтых гарадоў з экзатычнымі імёнамі, якія ён прачытваў (кепска) уголас амаль з асалодай, каб пачуць іхнае гучаньне.

Потым міналі гады, а ён амаль не заўважыў, як яны мінулі, поўныя доўгіх, зусім аднолькавых, нецікавых дзён. Ён ужо стаяў за банкаўскім дыскам, меў уласную сакратарку з папкай і губкай (пэрспэктыўная пасада), зьведаў жанчын, — нямногіх —ажаніўся. Цяпер ён ужо гукаў: «Хлопча! Хлопча!» і пры гэтым заўсёды адчуваў як бы сутаргу ў горле, гэткі сорам, які й сам ня мог растлумачыць, а таксама віну, непазбыўнае адчуваньне віны перад гэтымі сур'ёзнымі, актыўнымі, вельмі стараннымі хлапчукамі.

Задумваўся ён рэдка (навошта пранікаць у сутнасьць рэчаў), але іншым разам рашӑўся сказаць сабе, што народжаны не дзеля гэтага і ўрэшце надыйшоў час уцячы. Але ўцячы ад чаго? Куды? Яго задавальняла праца. Сапраўды задавальняла? Насамрэч ён ня ўмеў рабіць іншай. Лічбы, лічбы, дні, месяцы, гады лічбаў, абстрактныя гады для яго і канкрэтныя, гэта відавочна, для многіх іншых асобаў. Ён народжаны не дзеля гэтага, можа быць. Але ж хто і дзеля чаго нараджаецца? — разважаў ён у жаданьні супакоіцца. Ён быў чалавек спакойны, прызвычаены зносіць цяжкасьці жыцьця. Чалавек, дзеля якога задавальненьні не былі надта моцнымі ды й расчараваньні ня надта нясьцерпнымі. Чалавек мэтадычны, зь немагчымымі марамі, але безь ніякіх амбіцыяў.

Штонядзелю ён апранаў свой лепшы блакітны строй, завязваў з году ў год гальштук і ішоў на футбол. Жонка таксама зьбіралася і ішла да сваёй маці. Часам яны выходзілі разам, разьвітваліся ўжо ў канцы вуліцы, цалаваліся проста так. Гэта была старая завядзёнка, якую як адзін, так і другая лічылі натуральнай, калі разьвітваліся ў нядзелю да вечара. Настолькі ж натуральная і нязьменная, як і наведваньне ўвечары кінатэатру ў іхным квартале, каб паглядзець якую-небудзь стужку, што круцілі суботнім вечарам, як наведваньне нядзельнай імшы аб адзінаццатай у царкве Сао-Дамінгуш.

Часам пры сустрэчы жонка пыталася:

— Ня ладзілася гульня?

Адэрыту адказваў: так сабе, або нат не лічыў патрэбным даваць адказ. Ён заўсёды лёгка чырванеў, таму што быў чалавекам, які гідзіўся любой хлусьнёй. Калі ён хлусіў, то адно з-за таго, што адчуваў: ягоная жонка лягчэй разумела расказаную ім хлусьню, чым праўду, якую ён мог расказаць ёй. Ён ня мог уявіць сабе, — і часта думаў пра гэта, — якой была б ейная рэакцыя, калі б ён расказаў, дзе бавіў час ужо столькі гадоў нядзельнымі вечарамі. Штовечар. І ў дождж, і пад сонцам. Яна не паверыць, жанчыны заўсёды цяжка даюць веры простым, ясным рэчам. Так, яна ніколі не паверыць, што ён ходзіць на прыстань, каб паглядзець, як адплываюць караблі, або ў аэрапорт, каб зірнуць на самалёты, што пакідаюць зямлю. Аднойчы ён расказаў Кошту, свайму калегу па банку, пра сваё захапленьне, і ў Кошты зьявілася зьедлівая ўсьмешачка. Калі Кошта не зразумеў яго, як магла зразумець жонка, бедная, пустая кабета... Кошта нат спытаўся:

— І што ты знаходзіш у гэтых людзях, што ад'яжджаюць на самалёце або караблі?

Якраз гэта і было дзіўна. Адэрыту ішоў у аэрапорт або на прыстань ня дзеля таго, каб паглядзець на людзей, якія ад'яжджаюць. І не за тым, каб паглядзець на карабель або самалёт. Усё было больш складана. Ён і сам ня ведаў, — быў ён чалавек просты, — што перажываў у тыя моманты, без сумневу найшчасьлівейшыя, найярчэйшыя, найдасканалейшыя ў яго-



ным безжыцьцёвым існаваньні. Гэта было ўсё і адначасова нішто. Моцны, трошкі тхлявы пах вады, блізкай, цёмнай, зусім загадкавай, салёнае паветра б'ецца аб скуру, нэрвовыя галасы, бегаціна, крыкі, тамсям, сьлёзы, словы спакойнай, арганізаванай прыроды запаўнялі ўсё навокал. Паехаць бы ў Карачы... або ў Бразылію... або ў Нью-Ёрк... Потым, і гэта было самае надзвычайнае, вялікая птушка раве, цягнецца па зямлі, расьсякае прастору, або вось агромністы карабель плыве спакойна, як час, па лёгкіх хвалях ракі, нібыта ў акіяне.

Часам ён стаяў там, пакуль карабель не зьнікаў. Ён перажываў свайго роду горыч, нібыта нехта вельмі дарагі ад'ехаў назаўсёды. Але не зусім так. Тое, што ён адчуваў, было болем за тую асобу, сябе самога, што заставаўся на беразе.

Тады ён пачынаў ісьці ўздоўж прыстані і сустракаў людзей, вельмі брудных або проста загарэлых на сонцы — ён ня ведаў. Яны цягнулі або перакатвалі цюкі ў транспартныя караблі, што прысталі або меліся адплысьці. Людзі з прыгодніцкімі тварамі. Людзі. Часам ён кідаў позірк на іншыя плаўні, малыя і старыя з выгляду, што падгнілі ў вадзе, былі заўсёды ў руху і заўсёды на месцы, прывязаныя тоўстымі дратамі да жалезных слупоў. Прывязаныя, як ён. Вяртаўся ён дадому заўсёды сумны. Бачыў стол, накрыты для вячэры, пунсовую засьню, статуэтку хлапца, які есьць вішні (вішні гайдаліся, калі ён уваходзіў), уласную жонку, ужо тоўстую й друзлую ад узросту, бачыў іншымі вачыма, новымі вачыма, як той, хто вяртаецца здалёк і трапляе раптам, без падрыхтоўкі ў штодзённае жыцьцё, у старое жыцьцё, у жыцьцё, якое чакала ЯГО, урэшце ў СВАЁ жыцьцё.

Жонка спытала, калі падавала суп:

— Ня ладзілася гульня?

Ён пачырванеў.

— Так сабе. А твая маці, як яна маецца?

Часам увечары падаў дождж. Кроплі моцна стукалі ў шыбы, вецер падмятаў вуліцу. Яна кідала вязаньне, шчыльней атулялася ў хустку, таму што была мярзлячкай.

— Прыемна быць у хаце, — казала яна. — Ведаеш, дзе б я была шчасьлівая? У Афрыцы...

Ён лёгка ўсьміхаўся, ішоў да кніжнай шафы, адкрываў «Рабінзона Круза» або якую-небудзь з кніг Жуля Вэрна, прачытаную столькі разоў, што ўжо напамяць ведаў цэлыя ўрыўкі.

Наступнай раніцай ён вяртаўся ў банк і складаў, памнажаў, дзяліў. «Хлопча!», «Дзе ты, хлопча?» Але ў яго быў вінаваты выгляд, і дзятва яго не паважала. Яго заўсёды абслугоўвалі апошнім.

Аднойчы адзін з дырэктараў выклікаў яго, прапанаваў сесьці ў адно з тых крэслаў зялёнае скуры, якія ён ведаў дагэтуль толькі з выгляду. То быў чалавек тоўсты, вельмі вохны, усьмешлівы, з дыямэнтамі на пальцах. Ён засяроджана паглядзеў на Адэрыту, нібыта хацеў прачытаць ягоныя думкі.

— Ведаеце, чаму я вас выклікаў?

Але Адэрыту ня ведаў. Не ўяўляў нават. Ён сядзеў на акрайчыку крэсла і трымаў рукі на сьціснутых каленях, пачціва сьціснутых.

Дырэктар пачаў казаць. Што дырэкцыя прызнае ягоныя добрыя якасьці, ягоную адданасць сям'і, любоў да працы. Як ён, мабыць чуў, банк мае філію ў Ларэнсу-Маркешы*. Справа ў тым, што дырэкцыя думае, каб яго, Адэрыту, паслаць туды, ну, каб кіраваць. Заробак будзе, зразумела, падвышаны. Можна нат заверыць, што падвышэньне будзе значнае... Значнае... Дык вось, сытуацыя вельмі-вельмі выйгрышная. Ня кажучы ўжо пра прэстыж. Ну, але падумайце, падумайце, потым скажаце, згаджаецеся ці не.

Адэрыту ня думаў або, лепш сказаць, думаў вельмі мала. І жонцы не сказаў нічога пра гэта, таму што яна няздольная была зразумець ягонае рашэньне ў справе, прапанаванай дырэктарам. Яна заўсёды марыла быць сыньёрай, бедалага. Мець шмат капелюшоў, шмат вопраткі і кучу грошай, каб прымаць візыты. Жанчына эліты каляніяльнага гораду... Яна ніколі ня выбачыла б яму адмовы, гэта зразумела. Ён казаў дырэктару пра здароўе жонкі, пра сваю пячонку — вельмі прачула. Усё хлусьня, натуральна. Але чаму ж, чаму? Ён і сам ня ведаў. І рабіў гэта, можа быць, зь лепшымі намерамі. Можа таму, што ёсьць асобы, якія мараць і жывуць адначасна: чорныя людзі на караблях, акторы і акторкі, якіх ён бачыў суботнімі вечарамі ў кінатэатры ў сваім квартале, і ён прызвычаіўся марыць і жыць. Магчыма, таму. Ужо позна, надта позна. Ён ужо ня зможа пражыць сваю мару. Ён пачуваўся старым, страшэнна старым і стомленым, вельмі, вельмі стомленым.

І вось паехаў Кошта, адплыў на прыгожым параплаве. На прыстані стаяў Адэрыту з шырока расплюшчанамі вачыма і адчуваў вялікі, неабсяжны сум. Ён глядзеў на карабель, пакуль той не растварыўся ў густым тумане, які пакрываў той раніцай Тэжу. А потым пайшоў у аэрапорт паглядзець, як стартуюць самалёты.

* *Цяпер Мапуту, сталіца Мазамбіку.*

Maria Judite de Carvalho. A vida e o sonho. – Tanta gente, Mariana. Lisboa, 1991.

МАРЫЯ ЖУДЗІТЭ ДЭ КАРВАЛЬЁ (нар. 1938), партугальская пісьменьніца. Аўтар раманаў «Краявід без караблёў», «Пустыя шафы», «Кветкі па тэлефоне», многіх навэляў.

Фэрнанду Намора

Усяго адна аранжа

Яшчэ й сёньня, калі я зноў трапляю на вершаліну гэтай пачварнай скалы, дзе чалавек парушыў законы, што абмяжоўваюць яго, і пабудаваў арлінае гняздо, зь якога ахапіў неба, далечыню, амбіцыйна, з самаўпэўненасьцю, — яшчэ й сёньня зьвяртаю свой позірк на раўніну і прыгадваю вечары, якімі я праяжджаў там на цярплівым хрыбце каня, майго кампана па філязофскіх разважаньнях і штодзённых клопатах у паездках на выклікі сялянаў, нядаўніх пасяленцаў, для якіх хвароба была падзеяй важнай і гаротнай. Там, унізе, дзе раўніна з намаганьнем карабкалася па схонах да далягляду, нібыта хвалямі, якія, нягледзячы на цяжкасьці, мелі яшчэ імпэт, каб уражваць сьмяротных, хавалася адна з многіх вёсак, што трохі згладжвалі марную самоту пяшчанай раўніны сваім сумным выглядам. Ці вы здолелі б разгледзець мізэрныя хаты сярод манатоннасьці цёмнай сланцавай зямлі, сярод дрэваў, прысуджаных бясконцай восеньню да амаль вечнай аголенасьці? І гэта хаты? —спыталіся б вы. Скажам, так. Мала таго, там жывуць людзі. І жарсьці, і расчараваньні, і хваробы — і перш за ўсё ўпартасьць, якая ўжо не зьяўляецца годнасьцю, таму што сталася звычкаю ці нават наканаваньнем.

Аднойчы летам я праяжджаў там, калі эпідэмія тыфу накрыла раўніну ад краю да краю. Не сустракаючы перашкодаў, яна прымусіла кожную сям'ю выплаціць ёй цяжкі падатак, і ў некаторых хатах я напаткаў па два або тры целы, распасьцёртыя на рагожы, выцягнутыя. Яны енчылі, нібы чакаючы, калі іх кінуць у яму. Тыф даваў пра сябе знаць здалёк. Спачатку смуродам, ад якога немагчыма было пазбавіцца. А потым, пасьля звычайнага, бесстаронняга, руціннага агляду гэтых праваленых жыватоў, гэтых твараў, дзе трасца ўжо ня мела спажывы нідзе, акрэм запаленых жахам вачэй, я пачуваў сябе ў пастцы. Выходзіў на сьвежае паветра, каб неабсяжная прастора выгнала зь мяне, з маіх рук, з майго мозгу жудасную й брыдкую заразу. Але тыф украўся ў зямлю, у вецер, у дрэвы. Нібыта ўсе мы на раўніне былі панураныя ў бруд. Што сапраўды карыснага я мог зрабіць дзеля гэтай беднай супольнасьці хворых? Скуль прыйшла пошасьць? Што пітала яе? Якія мы ўсе крохкія! Навокал былі толькі неба і раўніна. А там, на даляглядзе — горы. Як далёка знаходзіўся сьвет, здароўе, выратаваньне і сіла, што назаўсёды выратавалі б людзей і зямлю? Мая бездапаможнасьць, адчай ад усьведамленьня сваёй бескарыснасьці, сваёй слабасьці, што рабіла мяне роўным любому з тых сялянаў, якія выходзілі за мной на двор — ужо ўяўляліся мне здрадай. Яны былі бясьсільныя й не хавалі гэтага. Але я маскаваў сваю няздольнасьць ілюзорнай упэўненасьцю, той упэўненасьцю, якая напаўняла мяне настолькі, што я мог зьвярнуцца да іх са словам або жэстам падтрымкі —які страшны фарс я разыгрываў там?

Мая занепакоенасьць не цярпела іхнай блізкасьці. Жадала, каб яны адышлі ад мяне і далучыліся да тых, што паміралі. Каб адышлі ўсе — бо, пакінуўшы мяне самога, яны б паказалі, што і яны зразумелі, як подла я карыстаўся іхным даверам.

Аднак нічога падобнага: нямногія здаровыя мужыкі й жанчыны зь вёскі ўсё больш шчыльным колам чаканьня атачалі мяне. Я быў тым, ад каго спадзяваліся пачуць прарочае слова. Калі б я адмовіўся ашукаць іх, іхны адчай стаўся б канчатковым. Трэба было маніць ім. Трэба было яшчэ больш прыкідвацца перад тымі, ад каго я дагэтуль хаваў сваю няздольнасьць.

І калі я ўрэшце задурыў іх спадзяваньнямі, парадамі, салідарнасьцю, якія не былі нічога вартыя, адна брудная бабулька выцягнула зь бездані сваіх лахманоў аранжу і падала яе мне. Усяго адну аранжу — але роўную скарбу. Скарб у падзяку за хлусьню.

Fernando Namora. Embora uma laranja. – Retalhos da vida de um medico. Lisboa, 1949.

ФЭРНАНДУ НАМОРА (нар. 1919), партугальскі паэт і пісьменьнік. Аўтар паэтычных зборнікаў «Рэльефы», «Зямля», раманаў «Капішчы Сьв. Францыска», «Ноч і раніца». Апавяданьне «Усяго адна аранжа» – з аўтабіяграфічнага зборніку «Імгненьні з жыцьця лекара» (1949).

Пераклаў з партугальскай Валеры Буйвал.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ

ПЁТРА СЕРГІЕВІЧ. ШЛЯХАМ ЖЫЦЬЦЯ

...На пачатку дваццатага стагодзьдзя гісторыя запатрабавала ад мастакоў веры ў палітычныя ўтопіі й шчырага гуманізму. Сацыяльны й нацыянальны рэалізм тады — універсальная зьява для ўсёй Эўропы. Пасьля часоў барока «народ» цікавіў мастакоў пераважна ў этнаграфічным ракурсе. Найноўшы ж час вымагаў ад іх стаць выказьнікамі памкненьняў люду, зажыць ягоным жыцьцём. Справа зайшла так далёка, што мастакі пачалі шукаць шлюбаў зь сялянкамі, як Высьпянскі ці Маёль. Праўда, для апошніх гэта ня скончылася дабром. Парадокс ня ў тым, што хваля сацыялягізму пракацілася па Старым і Новым Сьвеце, а ў тым, што яна захлынула разнастайныя мастацкія кірункі. Постімпрэсіяністы, акадэмісты, экспрэсіяністы, сэцэсіяністы, фавісты... кожны ў свой спосаб імкнуўся засьведчыць сваю павагу й спачуваньне Народу. У Польшчы гэта назвалі «хлопаманіяй»... Такія розныя Мэнье і Бурдэль, Ходлер і Пікаса, Цорн і Севэрыні стваралі шэдэўры і ў рэчышчы сацыяльнага рэалізму.

У СССР плынь сацыяльнага рэалізму атрымала магутную дзяржаўную замову. Пакрысе яна сыйшла ў культавае мастацтва «сацыялістычнага рэалізму». Іншая сытуацыя склалася ў Заходняй Беларусі. Арыстакраты (Рушчыц, Ромэр, Дабужынскі) і выхадцы з таго самага «народу» (Сеўрук, Горыд, Чурыла) зьвярталіся да сацыяльных тэмаў як да творчага мэтаду, а не да спосабу перайначыць сьвет. Таму тут, на беларускім Захадзе, ствараліся карціны, узьнятыя да ўзроўню сымбаляў, амаль біблейскіх прыпавясьцяў пра зямны шлях...

Ці ня самаю яскраваю ў гэтым сэнсе стала творчасьць Пётры Сергіевіча. Падзеленая паміж нацыяналізмам і чыстай эстэтыкай сьведамасьць дала свой прадвызначаны плён у мастацтве. Цэлая галерэя Скарынаў, Усяславаў Чарадзеяў, Кастусёў Каліноўскіх. Рэчы, знаёмыя нам са школьных падручнікаў. У дзяцінстве ў нас нават не ўзьнікала пытаньня, у якой краіне яны былі створаныя, бо яны атаясамліваліся з савецкім рэалізмам. Але сярод спадчыны мастака застаўся адзін твор, які рэзка выломваецца з усяго, што было зроблена ім. Гэты твор — «Шляхам жыцьця» —вылучаецца і сярод усяго мастацтва Заходняе Беларусі музычнасьцю простае кампазыцыі й сюжэту, за якімі прыхаваны таемны сэнс.

... Пётра Сергіевіч нарадзіўся ля Богіна, каля аднаго з самых маляўнічых і легендарных беларускіх вазёраў. Мясьціны тут і да сёньня чыстыя й ціхія. З гэтых таямнічых глухіх мясьцінаў лёс закінуў сямнаццацігадовага юнака, сына безьзямельных сялянаў у Пецярбург. Сям'я Сергіевічаў часьцяком пераяжджала зь вёскі ў вёску, але ўпершыню дарога была такою далёкай...

... Фабрыка дзяржаўных знакаў. Санкт-Пецярбург. 1917 год. Фабрычныя курсы, на якія юнака накіраваў «рэвалюцыйны камітэт», бадай, няшмат дадалі да ягонае адукацыі. Але ўрокі маляваньня пераканалі мастака ў ягоным прызваньні. Роўна ж як і наведваньне славутых пецярбурскіх музэяў. Завіруха рэвалюцыі не натхняла. Сергіевіч вяртаецца да бацькоў...

... Нядоўгі час ён працуе на чыгунцы. У 1919 годзе ў ягоныя рукі трапляе газэта «Kurier Wileński» з паведамленьнем пра адраджэньне Віленскага ўнівэрсытэту з мастацкім факультэтам. Справа была вырашаная. Малады Сергіевіч, падрабляючы ад выпадку да выпадку, наведвае то пачатковую школу маляваньня Мантвіла, то Вольную школу малюнку й жывапісу Варнаса. У 1920 годзе, Сергіевіч сабраў стос малюнкаў і акварэляў ды зь імі папраставаў да Рушчыца. Славуты мэтар, намаганьнямі якога быў адроджаны мастацкі факультэт (ізноў праз 90 гадоў!), прафэсар Фэрдынанд Рушчыц, быў рады любому патэнцыяльнаму вучню. У тыя нішчымныя няпэўныя гады атрымліваць мастацкую адукацыю мала хто ймкнуўся. Уважліва разгледзеўшы практыкаваньні дзецюка, прафэсар уважліва агледзеў і яго самога. Пасьля чаго набыў адзін зь ягоных малюнкаў — шкіц муроў старога ўнівэрсытэту...

... Сергіевіча Рушчыц залічыў на свой факультэт як вольнага слухача. Тое, што ён здолеў зьвярнуць на сябе ўвагу мэтра, акрыліла маладога мастака. На параду прафэсара Сергіевіч едзе ў больш сыты й амаль сталічны Кракаў, якому пашчасьціла не зазнаць маскоўскага панаваньня. Сюды ён выбраўся разам зь сябрам, Рафалам Яўхімовічам, сябрам на ўсё жыцьцё...

... Кракаўская Акадэмія нават у параўнаньні зь пецярбурскаю была кансэрватыўнаю. Сергіевіч займаўся ў прафэсара Панкевіча, які абагаўляў Матэйку, і патрабаваў ад вучняў максымальнае ілюзорнасьці ў малюнку. Імпрэсіяністычнасьць тут асуджалася за «сырасьць». У майстэрні Панкевіча, які сам паходзіў з Украіны, займалася шмат украінцаў. Пэўна і кантакты зь імі паўплывалі на фармаваньне нацыяналістычнага сьветапогляду маладога Сергіевіча. Прыгаломшаны жорсткай патрабавальнасьцю кракаўскае прафэсуры, зьведаўшы яшчэ раз чужога хлеба, ён разам зь сябрам Яўхімовічам вяртаецца на Радзіму, у Вільню. Праз два гады ён скончыў і Віленскі ўнівэрсытэт. Да гэтага часу мастацкі факультэт пераехаў у стары бэрнардынскі кляштар, адмыслова перабудаваны Вітанам-Дубейкаўскім пад навучальныя корпусы. Гэты дойлід ужо быў вядомы сваім памкненьнем выснаваць і ўвасобіць «беларускі стыль»...

... Да беларускай справы Сергіевіч спрычыніўся з усім маладым імпэтам. «Пасьля доўгага заняпаду паўстае Беларускі народ да выяўленьня сваіх духовых сілаў...» — гэта словы самога Сергіевіча з артыкула «Зацемкі аб мастацтве» ў часопісе «Калосьсе». Апантанасьць нацыянальнай ідэяй зьвяла яго ў сьвет гістарычнае рамантыкі. З 30-х гадоў гістарызм становіцца вядучым жанрам у творчасьці мастака.

Паралельна Сергіевіч працуе над нізкаю сацыяльнага жанру. Пасутнасьці, гэта была даніна землякам, сваеасаблівы асабісты дзёньнік, куды мастак заносіў вобразы тых людзей, якія атачалі яго зь дзяцінства. Кожны зь іх — гэта канкрэтная асоба, аратыя, рыбакі, жнейкі з Браслаўшчыны. У гэткім звароце да народных тыпажоў не было нічога спэцыфічнага. Наадварот, гэта адпавядала агульнаэўрапейскай тэндэнцыі. «Вясьляр», «Араты», «Калыска», «Залёты», «Юнацтва» — фрагмэнты жыцьця, выхапленыя з будзённага калавароту, дзе павінны быць і цяжкая праца, і радасьць, і адчуваньне шчасьця. Чаго пэўна не было ў Сергіевіча, дык гэта «выпісанай клясавай прыналежнасьці на тварах», як напісаў Максім Танк у сваіх «Лістках календара».

Падсумаваньнем «народнае» тэмы стала палатно «Шляхам жыцьця». Жанчына зь дзіцём на руках, мужчына, згорблены пад цяжкою лісёнкаю, крочаць у цішы да далягляду, да чарговага павароту дарогі.

Цяжка сказаць, ці быў знаёмы Сергіевіч у тыя гады з палотнамі Пікаса, Дэрэна, Брака, зь якімі паводле невядомага зьбегу абставінаў зблізіўся праз свой твор. Дакладна вядома, што ён ведаў палатно Рушчыца «Эмігранты», сюжэт якога быў навеяны падзеямі пачатку першае сусьветнае вайны. Але пры падабенстве формы ці сюжэту, параўнаньні абавязкова будуць кульгаць. Карціна Сергіевіча напісаная ў 1934 годзе. Час, які прадвызначыў значна больш, чым уяўлялі сабе людзі. Што адкрылася мастаку ў веку Хрыста? Што мусілі пабачыць ягоныя героі за новым паваротам дарогі, і што іх гоніць?

Існавала некалькі папярэдніх варыянтаў гэтае карціны. Сюжэт заставаўся той самы, але мяняліся кампазыцыйныя дэталі. У ранейшых варыянтах дрэвы былі больш самастойнымі аб'ектамі, спрашчаючы сюжэт. Лінія далягляду была ніжэй за галовы герояў. У варыянце 34-га году небакрай быў падняты, дарога атрымала працяг. Дарога стала сымбалем надзеі.

Што рэалістычнага ў гэтым творы Сергіевіча? Краявід? Але ён ня большы за знак. Постаці людзей? Але і яны не канкрэтныя сучаснікі мастака. З босымі нагамі, якія ледзь кранаюць палатняную дэкарацыю, у строях **бязважкіх, ядвабных...**

Усё сваё мастакоўскае жыцьцё Сергіевіч працаваў і для царквы. Апошнія абразы ён напісаў на пачатку 60-х, для касьцёлу ў мястэчку Майшагола, што пад Вільняю, а ў 30-я ён рабіў абразы і роспісы для касьцёлаў у Жодзішках, Быстрыцы, Смаргоні, у мястэчках і вёсках па ўсёй Віленшчыне. Гэтая старонка ягонае біяграфіі дасьледавана найменш. Дакладней, яна папросту вырваная. Між тым, ягоныя сябры рашуча сьведчаць, што Сергіевіч быў глыбокім вернікам, меў заўсёды пры сабе Сьвятое Пісаньне, часьцяком заглыбляўся ў тэалягічныя гутаркі. Распавядаюць, што па вайне Сергіевіча добра ведаў і Панамарэнка. Партыя пільнавала творчы рост кожнага большменш адметнага мастака. «Барын» Панамарэнка, можа ў жарт, прапанаваў мастаку: «Ты пераяжджай да мяне ў Беларусь, а мы табе і касьцёл адчынім». На сваё шчасьце, Сергіевіч застаўся ў Вільні.

Другая назва гэтага палатна «Падарожныя». Ці можна ў гэта слова ўкласьці брутальны зьмест?..

... Марыя зь дзіцём і Язэп ўцякаюць у Эгіпет. Каб выратаваць немаўля ад перасьледу Ірада. Каб уратаваны хлопчык выратаваў род чалавечы... Можа, яны разьмінуцца з вамі на дарозе...

Сяргей Харэўскі



ПЁТРА СЕРГІЕВІЧ (1900, в. Стаўрова, Браслаўскі павет — 1984, Вільня) жывапісец, графік, публіцыст. Скончыў мастацкі факультэт Віленскага ўнівэрсытэта (вучыўся з 1920 па 1922 і з 1925 па 1927). Вучыўся ў Кракаўскай Акадэміі мастацтваў з 1924 па 1925. Заслужаны дзеяч мастацтваў ЛітССР.

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

рэдактар ..... Сяргей Дубавец
выдавец ..... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік ..... Павал Жук
адказны сакратар ..... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ..... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ..... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ..... Лявон Раманчык
набор ..... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ..... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ..... Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі ..... Зьміцер Бартосік

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by
http://rampage.mi.org/users/~nasa_niva

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая.

Наклад 2620. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 22:02, 16/11/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 6798. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010